Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9 ЧЭРВЕНЯ 2009 г.
АЎТОРАК
№ 104
(26462)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

ВЫБУДОЎВАННЕ АДНОСІНАЎ З ЕЎРАСАЮЗАМ З'ЯЎЛЯЕЦЦА АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕМ ДАЎНЯГА СТРАТЭГІЧНАГА КУРСУ

Беларусь і ў далейшым будзе імкнуцца да ўзмацнення еўрапейскага вектара супрацоўніцтва. Аб гэтым 8 чэрвеня заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з міністрам замежных спраў Славеніі Самуэлем Жбогарам.

«Вы павінны быць абсалютна ўпэўнены, што ўсё, што адбываецца ў адносінах з нашым заходнім партнёрам — Еўрапейскім саюзам, — гэта не разавае мерапрыемства з нашага боку, не нейкая гульня, гэта ажыццяўленне нашага даўняга стратэгічнага курсу», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што матывацыя тут простая: узаемны гандаль Беларусі і ЕС сёння прыблізна роўны аб'ёму гандлю з Расійскай Федэрацыяй, пры гэтым з ЕС сальда гандлю дадатнае. «Гэтым усё сказана. І ніхто не пасмее ігнараваць гэты факт. ЕС — гэта тэхналогіі, крэдытныя рэсурсы, інвестыцыі», — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы пацвердзіў, што для Беларусі гэты вектар супрацоўніцтва вельмі важны. Звяртаючыся да міністра замежных спраў Славеніі, Аляксандр Лукашэнка выказаў надзею, што гэты візіт надасць дадатковы імпульс супрацоўніцтву і будзе садзейнічаць паляпшэнню палітычнага ўзаемадзеяння паміж дзвюма краінамі, а таксама паміж Беларуссю і Еўрасаюзам. Гаворачы аб гандлёва-эканамічных адносінах, Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што сярод усіх краін былой Югаславіі найбольш дынамічна яны развіваюцца са Славеніяй. Тавараабарот паміж дзвюма краінамі ў 2008 годзе дасягнуў $92 млн. У студзені-красавіку 2009 года ён склаў амаль $21 млн. У Беларусі эфектыўна працуюць многія бізнэсмены са Славеніі, і, як запэўніў Аляксандр Лукашэнка, у рэспубліцы і ў далейшым будуць падтрымліваць прадпрымальнікаў з гэтай краіны. Прэзідэнт адзначыў, што ў Беларусі «аб'яўлены выразны курс на падтрымку бізнэсу з рэспублік былой Югаславіі». Нядаўна адбылася сустрэча Аляксандра Лукашэнкі з прадстаўнікамі дзелавых колаў Сербіі, у Беларусі была арганізавана выстава сербскіх тавараў, якая мела вялікі поспех.

«У нас ёсць сур'ёзны фундамент, база для далейшага супрацоўніцтва са Славеніяй. Гэта дарагога каштуе, таму што, выбудоўваючы адносіны з іншымі дзяржавамі, мы гэтага не маем», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што паміж Беларуссю і Славеніяй устанавіліся добрыя адносіны яшчэ з часоў Савецкага Саюза і Югаславіі. «Усё самае перадавое з сацыялістычнага лагера было ў Югаславіі. Вы, мабыць, ужо ў той перыяд мелі той узор развіцця эканомікі, да якога нядрэнна было б прыйсці нам цяпер», — заўважыў ён.

Міністр замежных спраў Славеніі Самуэль Жбогар у сваю чаргу пацвердзіў, што Славенія і Беларусь здаўна былі добрымі партнёрамі. «Я сёння знаходжуся тут, каб вывучыць магчымасці, каб тыя добрыя адносіны, якія мы мелі ў мінулым, перанесці ў будучае», — падкрэсліў ён.

У Мінску знаходзіцца прадстаўнічая дэлегацыя славенскіх дзелавых колаў — каля 40 бізнэсменаў. Як адзначыў Самуэль Жбогар, гэта пацвярджае тую глыбокую цікавасць, якая існуе ў Славеніі да развіцця дзелавых адносінаў з Беларуссю.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Уладзімір Макей запатрабаваў актывізаваць работу БЧ па абнаўленні асноўных фондаў

Беларускай чыгунцы неабходна актывізаваць работу па абнаўленні асноўных фондаў, заявіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей у час прадстаўлення калектыву БЧ яе новага начальніка Анатоля Сівака, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«БЧ праводзіць яшчэ недастатковую работу па абнаўленні асноўных фондаў, асабліва грузавога рухомага саставу», — адзначыў Уладзімір Макей. З 2008 года распрацоўваецца праграма абнаўлення ў Беларусі парку міжнароднага грузавога чыгуначнага рухомага саставу, якая прадугледжвае выкарыстанне яго з улікам перспектыўных патрэбнасцяў рэспублікі ў грузавых перавозках. «Аднак канчатковае рашэнне па гэтым пытанні не прынята, — сказаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — Трэба ў самыя кароткія тэрміны знайсці гэтыя рашэнні і забяспечыць іх фактычную рэалізацыю».

Гаворачы аб перспектывах развіцця пасажырскіх перавозак чыгуначным транспартам, Уладзімір Макей адзначыў, што БЧ «трэба будзе яшчэ многае зрабіць у сферы абслугоўвання пасажыраў, стварэнні для іх камфорту, тут яшчэ шмат незадзейнічаных рэзерваў». Ён таксама адзначыў нізкую актыўнасць па аптымізацыі кіраўніцкай мадэлі працэсаў перавозак і фінансава-эканамічнай дзейнасці, што не дазваляе дабівацца рацыянальнага выкарыстання грашовых сродкаў на БЧ.

Уладзімір Макей дадаў, што на беларускай чыгуначнай магістралі не прымаюцца меры па развіцці сферы паслуг перавозкі грузаў з выкарыстаннем буйнатанажных марскіх кантэнераў. «На БЧ ёсць дастатковы патэнцыял для развіцця гэтай сферы паслуг, уключаючы спецыялізаваныя кантэйнерныя тэрміналы, на базе якіх мэтазгодна стварацъ транспартна-лагістычныя цэнтры», — сказаў ён.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта асабліва падкрэсліў неабходнасць БЧ ва ўзаемадзеянні з суседнімі краінамі пашыраць практыку прымянення паскораных кантэйнерных паяздоў, прыцягваць дадатковыя аб'ёмы грузаперавозак. Вяртаючыся да пытання аб развіцці пасажырскіх перавозак, Уладзімір Макей адзначыў важнасць арганізацыі скараснага руху. Пры гэтым, паводле яго слоў, БЧ трэба актывізаваць работу з чыгункамі Расіі, Польшчы, Германіі па арганізацыі скараснага руху на ўчастку Берлін — Масква. «Трэба будзе таксама больш настойліва праводзіць работу па прывядзенні ўсіх вакзалаў чыгуначных станцый краіны ў адпаведнасць з сучаснымі еўрапейскімі патрабаваннямі і стандартамі», — сказаў ён.

Гаворачы пра новага начальніка БЧ, Уладзімір Макей адзначыў, што ёсць некалькі прычын, па якіх Анатоль Сівак назначаны начальнікам чыгункі. «Па-першае, гэта добра вядомы калектыву БЧ кіраўнік, які 20 гадоў працаваў на чыгунцы, на самых адказных, чарнавых участках, звязаных з будаўніцтвам і развіццём інфраструктуры», — растлумачыў ён. Акрамя таго, Анатоль Сівак амаль 3 гады быў памочнікам Прэзідэнта Беларусі, галоўным інспектарам па Мінску. «Гэта адказная работа, якую ён выконваў з гонарам, пры гэтым дакладна вывучыў стратэгічныя падыходы і патрабаванні кіраўніка дзяржавы да развіцця БЧ, у прыватнасці, і эканомікі Беларусі ў цэлым», — сказаў ён.

МЫ ЕДЗЕМ!

Што вінен — аддаць павінен, прычым, своечасова. Гэтым правілам «Звязда» карысталася, карыстаецца і, дасць Бог, будзе...

Таму і спяшаецца падчас новай падпісной кампаніі ўручыць каштоўныя прызы ўсім, каму пашчасціла іх выйграць у, так бы мовіць, старой... Сярод шчасліўчыкаў — Таццяна Іванаўна Савенка, жыхарка Жлобіна.

Кіруючыся ў гэты горад, не можам не зазірнуць да сувязістаў, падпісчыкаў Бабруйска, Рагачова, Светлагорска, Рэчыцы, Гомеля, Калінкавічаў, Мазыра, Акцябрскага і Глуска, не можам не запрасіць усіх сваіх прыхільнікаў на прэзентацыю газеты, якая адбудзецца **ў сераду, 10 чэрвеня, у 12 гадзін 30 хвілін у аддзяленні сувязі № 7** — галоўнай пошце Жлобіна (вул. Першамайская, 76).

Буйных прызоў не абяцаем, але памятныя быць павінны.

Звяздоўцы.

Стыхія

ТАРНАДА НАД ЧАЧЭРШЧЫНАЙ

— Гэта быў нібы своеасаблівы тарнада, сказаў у гутарцы з намі старшыня Чачэрскага райвыканкама Іван Іванавіч Ком, і яго словы пасля пацвердзілі ў абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях. Ва ўсялякім разе, мясцовы люд такіх ударaў стыхіі апошнім часам не бачыў і не адчуваў.

Што ж здарылася ў мінулую нядзелю ў тыя ўсяго дзесяць хвілін напрыканцы 18-й—на пачатку 19-й гадзіны? Страшэнна чорныя хмары абвалакліся неба, ірвануў знянацку магутны парывісты вецер. Хто-ніхто са сведкаў сцвярджае, што закруціў-загуляў смерч. І пачалося.

У самім райцэнтры была пашкоджана станцыя другога пад'ёму вады, што на вуліцы Савецкай, разбурана незадзейнічаная воданапорная вежа. Вецер павaліў долу трансфарматарную падстанцыю, пяць апор лініі электрапередачы, агароджу. Дзве каналізацыйныя станцыі, што на вуліцы Акцябрскай, разбавіляся электразабеспячэнне. Пашкоджаны былі дахі майстэрні, бітумнага сховішча, будынка аўтазаправачнай станцыі, ёмістасць для паліва, абарваны электраправады вежы сотавай сувязі «Белсел». Пра паваленыя дрэвы ўжо гаворка не ідзе — іх было многа.

А віхура паляцела далей і бадай што яшчэ больш праявіла злосці ў сельскагаспадарчым філіяле «Прыазёрны» ААТ «Чачэрск-агратэхсэрвіс» (вёска Матнявічы). Тут былі пашкоджаны сенасклад і два цялятнікі, у выніку чаго загінула 15 жывёлін і атрымаў траўмы мясцовы жыхар, якога даставілі ў бальніцу. Выйшлі са строю лініі электрапередачы не толькі тут, але і ў іншых месцах, таму без электрычнасці засталіся вёскі Роўкавічы, Гольч, Чырвоны Бераг, Залаўе, Новазахарполле, Рудня Барталамееўская, Ніўкі, пасёлкі Вазнясенскі, Ключавы і г.д., дзве вуліцы райцэнтра. Пашкоджана шмат дахаў дамоў. Паваліла каля 120 гектараў (падлікі прыблізныя) лесу.

Паласа лесу, па якой прайшоў смерч.

ТАПОЛІ ЛАМАЛА ЯК ЗАПАЛКІ

Клімавіцкі раён найбольш пацярпеў на Магілёўшчыне ад моцнага ветру.

У сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Саўгас «Звянчацкі», які на беларуска-расійскім памежжы, пацярпелі дахі на малочнатаварных фермах, цялятніках, жылых дамах і гаспадарчых пабудовах.

— Моцны вецер пачаўся каля 18 гадзін, і ламаў як запалкі альбо вырываў з каранямі таполі каля адміністрацыйнага будынка, — расказаў кіраўнік саўгаса «Звянчацкі» Ігар Коцікаў. — З дахаў пазрывала шыфер, месцамі поўнасцю раскрыліся хлявы. Пацярпелі больш за два дзясяткі жылых дамоў. Шыферам пабіла вокны. Каля дзвюх соцень лістоў моцны вецер сарваў з дахаў фермаў.

Цяпер у гаспадарцы працуе група МНС. Урон падлічваецца: ён будзе вымярацца ў мільёнах рублёў. Будаўнічыя брыгады саўгаса прыступяць да ліквідацыі наступстваў.

Паводле паведамлення МНС, у Магілёўскай вобласці пацярпелі ад моцнага ветру яшчэ тры раёны — Мсціслаўскі, Чэрыкаўскі і Крычаўскі. У іх таксама пашкоджаны дахі сельскагаспадарчых будынкаў і жылых дамоў.

Ілона ІВАНОВА.

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, БЕЛТА.

Разваліны аўтазаправачнай станцыі ДЭУ-46.

Брыгады раёна электрычных сетак, КЖЭУП «Чачэрскае», работнікі мясцовага падраздзялення МНС і спецыялісты абласнога ўпраўлення, прадстаўнікі іншых арганізацый раёна выехалі ў пацярпелыя населеныя пункты на тэхніцы з неабходным абсталяваннем. У шэрагу вёсак электразабеспячэнне з'явілася а палове 23-й гадзіны, а ў астатніх — а другой гадзіне ночы і ў 10 гадзін раніцы.

Работы па аднаўленні жыццядзейнасці працягваюцца. У прыватнасці, ідзе расчыстка лясных дарог ад завалаў. Урон, які нанесла стыхія, падлічваецца.

Ураган у той дзень наляцеў і на Жлобінскі раён. Ад электраэнергіі былі адключаны ў выніку яго ўдару 483 дамы, дзве фермы, школа, бальніца, пашкоджана 300 метраў ліній электрапередачы.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Здарэнні

ДТЗ на чыгунцы

У суботу і нядзелю позна ўвечары два дарожна-транспартныя здарэнні, у адным з якіх ёсць пацярпелыя, былі зафіксаваны на чыгуначных пераездах.

Так, паводле звестак упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, у нядзелю ў 22.50 на 432-м кіламетры чыгуначнага перагону «Пухавічы — Талька» 23-гадовы непрацуючы жыхар Мар'інай Горкі на аўтамабілі «Форд» выехаў на забараняльны сігнал святлафора на чыгуначны пераезд і сутыкнуўся з электрацягніком «Асіповічы — Мінск». У выніку здарэння кіроўца і 25-гадовы пасажыр атрымалі цялесныя пашкоджанні і шпіталізаваны.

Між іншым, легкавы аўтамабіль, на які наехаў электрацягнік, узнавіць ужо немагчыма, а затрымка ў руху склала чвэрць гадзіны.

А напярэдадні а палове дванаццатай ночы ў Лунінецкі аддзел унутраных спраў на транспарце паведамілі аб ДТЗ, якое мела месца на 551-м кіламетры перагону «Сінкевічы — Лахва», дзе на пераездзе грузавы цягнік «Сітніца — Лунінец» натыкнуўся на аўтамабіль без кіроўцы і пасажыраў. Рэч у тым, што «Фальксваген» стаяў на рэйках з прыкметамі ДТЗ, а людзей побач не было.

Дарэчы, уладальнік машыны ўстанаўліваецца. У выніку гэтага здарэння цеплавоз атрымаў нязначныя механічныя пашкоджанні, затрымка ў яго руху склала адну гадзіну. Таксама на 40 хвілін затрымаўся рух цягніка «Гомель — Брэст».

Ігар ГРЫШЫН.

ПРАСТОІ — ЧАС ДЛЯ ПАДПРАЦОЎКІ?

Антыкрызісная эканоміка

Нягледзячы на эканамічныя праблемы, у Беларусі не адбывалася масавых звальненняў і ўсплёску беспрацоўя. Разам з тым, як паведаміў намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Пётр ГРУШНІК, на выпадак пагаршэння сітуацыі зараз распрацаваныя шэраг дадатковых мераў, якія дапамогуць захаваць стабільнасць на айчынным рынку працы нават пры горшым сцэнары развіцця падзей.

Асноўная праблема — попыт на работнікаў

Па выніках мінулага года наша краіна мела адзін з найбольш нізкіх паказчыкаў беспрацоўя — 0,8 % ад агульнай колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва. Перш-наперш гэта тлумачылася ажыўленнем эканомікі, дастаткова заўважыць, што летась было прынята на працу на 38,4 тыс. чалавек больш, чым звольнена, пры гэтым у Беларусі ўдалося стварыць адразу 163 тысячы вакансій. Але той жа «эканамічны складальнік» быў шмат у чым вырашальным і сёлета.

З аднаго боку, даводзіцца канстатаваць, што з пачатку года ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя павялічыўся нязначна — зараз ён складае 1 % ад колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва. Адзначана і змяншэнне (на 1,4 % у параўнанні з аналагічным перыядам летась) колькасці звароту па дапамогу ў дзяржаўныя службы занятасці насельніцтва. Аднак з іншага боку спецыялісты міністэрства канстатуюць: у краіне стаў скарачацца попыт на працоўную сілу — вынікам сталася змяншэнне колькасці вакансій. У пачатку мая службы занятасці мелі звесткі аб наяўнасці 41,9 тысячы свабодных працоўных месцаў, што склала толькі 70,5 % ад аналагічнага перыяду летась.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

КАРЫСТАЕШСЯ КАРТКАЙ — ЭКАНОМІШ ГРОШЫ

Цяпер грамадзяне, што маюць банкаўскія пластыкавыя карткі, могуць зэканоміць пры набыцці білетаў на цягнікі фарміравання Беларускай чыгункі ва ўнутрырэспубліканскіх зносінах.

Як паведамілі спецыялісты Мінскага аддзялення, тым з пасажыраў, хто скарыстаецца такой формай безнаяўнага разліку, будзе давацца зніжка з тарыфу ў памеры аднаго працэнта. Такая паслуга дзейнічае ў білетных касах вакзалаў станцый Мінск-Пасажырскі, Орша-Цэнтральная, Маладзечна, Барысаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

НУ І НУ!

ПАСАЖЫР... ВЫПАЎ З АЎТОБУСА

У наваполацкую міліцыю з цэнтральнай гарадской бальніцы паведамілі, што на машыне «хуткай неадкладнай дапамогі» прывезлі з мностваі раненняў 45-гадовага рабочага, які... выпаў з маршрутнага аўтобуса. Было выяўлена, што ўвечар, а дзясятай гадзіне, мужчыну прама ў аўтобусе пабіў 22-гадовы жыхар вёскі Экімань Полацкага раёна. На прыпынку грамадскага транспарту, калі аўтобус спыніўся, няшчасны рабочы пасля ўдару кулаком у твар выпаў на вуліцу. Узбуджана крымінальная справа. Прычыны бойкі высвятляюцца.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

САМАГОНКА ЦЯЧЭ РАКОЙ

У лесе каля чыгуначнай станцыі Гарадзец кобрынскія міліцыянеры ліквідавалі самагонны апарат і 1200 літраў брагі, але яшчэ большая ўдача чакала аператыўнікаў з Брэсцкага РАУС. Побач з в. Рагозна, таксама ў лесе, яны знішчылі разам з апаратам паўтоны брагі і аж 750 літраў гарэлкі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Прамая лінія

БОЛІ Ў ПАЗВАНОЧНІКУ?

Якія хваробы пагражаюць сёння пазваночніку, як засцерагчыся ад іх і як змагацца з імі? Гэтай тэме прысвечана наша чарговая «прамая лінія». У ёй возьмуць удзел спецыялісты РНПЦ траўматалогіі і артапедыі: **загадчык лабараторыі траўматычных пашкоджанняў пазваночніка і спіннога мозгу кандыдат медыцынскіх навук Андрэй Мікалаевіч МАЗУРЭНКА,** а таксама **загадчык лабараторыі захворванняў і наступстваў траўмаў пазваночніка і спіннога мозгу кандыдат медыцынскіх навук Андрэй Уладзіміравіч БАБКІН. «Прамая лінія» адбудзецца СЁННЯ, з 16.00 да 17.00 па тэлефонах: (8 017) 292 38 92 і 292 38 21.**

Бернд ШТАНГЕ: «У ГУЛЬНІ СУПРАЦЬ АНДОРЫ ЗАЎСЁДЫ ПАВІНЕН БЫЦЬ ПЕНАЛЬЦІ»

У адборачным матчы да чэмпіянату свету 2010 года нацыянальная зборная Беларусі з разгромным лікам 5:1 перамагла каманду Андоры. Галы забілі Генадзь Блізнюк (1, 76), Цімафей Калачоў (44), Сяргей Карніленка (50, 65). Матч прайшоў пры поўным аншлагу на стадыёне «Нёман» у Гродне.

У суботу траса Мінск—Гродна была запоўнена аўтамабілямі са сталічнымі нумарамі і нацыянальнымі сцягамі ў вокнах. Нацыянальным сцягам быў адзначаны нават аўтамабіль старшыні федэрацыі футбола Генадзя Нявыгласа. Адметна, што беларусы першы мяч забілі на першай хвіліне матча, а на апошняй — атрымалі пенальці ў свае вароты, пасля чаго лік перастаў быць сухім.

Такі вынік, безумоўна, стаў падарункам не толькі балельшчыкам, але і галоўнаму трэнеру беларускай зборнай Бернду Штанге, для якога гэты матч стаў сотым у ролі рулявога нацыянальных камандаў. Пасля прэс-канферэнцыі задаволены Бернд па-сяброўску абдымае мяне і прымае віншаванні: «Так, так, соты матч. Я пабачыў амаль усе зборныя свету — і Аргенціну, і Бразілію. Андора — гэта не маштаб, але ўсё адно прыемна».

Сяргей Карніленка — ізноў дубль!

Фота БЕЛТА.

Трэнер беларускай зборнай на пасляматчавай прэс-канферэнцыі назваў гульню прыгожай і няпростай: «У балельшчыкаў Гродна быў выдатны вечар, яны ўбачылі добрую гульню. Гэта правільнае рашэнне федэрацыі правесці тут матч. Такая ж атмасфера нам патрэбна і ў астатніх гульнях супраць Харватыі Украіны, а з Казахстанам, мы, магчыма, зноў згуляем у нейкім абласным цэнтры. Гуляць супраць Андоры складана — уся каманда знаходзіцца ў абароне. Але мы зрабілі гэта добра. У нас было толькі два гульцы, якія гулялі супраць Андоры мінулы раз. Сёння была новая каманда. І мы гулялі цярпліва і дасягнулі добрага выніку, якім мы ганарымся. Гульнёй мы імкнёмся заваяваць сэрцы балельшчыкаў, і сёння нам гэта ўдалося».

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 9.06.2009 г. (для б/н разлікаў)		Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў	
▲ 1 долар ЗША	2 813,00	Цэнтрабанк РФ	
▼ 1 еўра	3 908,38	USD	31,0751
1 латвійскі лат	5 510,28	10 UAH	40,5151
1 літоўскі літ	1 129,79	1000 BYR	11,1301
1 чэшская крона	144,48	EUR	43,3280
1 польскі злоты	859,15		
▼ 1 расійскі рубель	90,52		
1 украінская грыўня	366,75		

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Минский городской центр недвижимости

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ 26.06.2009 г.

Фонд «Минскгоримущество» (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (Организатор аукциона) проводят открытый аукцион по продаже объектов коммунальной собственности г. Минска

	Лот №	1
1	Наименование и местонахождение объекта, тип и характеристика помещения	Не завершенный строительством объект – «Магазин промышленных товаров в жилом доме № 2 по генплану со встроенными помещениями. Жилой район Дружба. Микрорайон Дружба-3 (1-я очередь строительства)»
2	Общая площадь* (кв.м)	1203,60
3	Начальная цена продажи (руб.)	2 000 000 000
4	Сумма задатка (руб.)	200 000 000
5	Сроки оплаты объекта	Оплата за объект производится в течение 30 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи
6	Характеристика строения	Фундаменты – сборные железобетонные; стены наружные – из блоков керамических крупноразмерных поризованных; стены внутренние – из кирпича КРПУ – 150/15/СТБ 1160-99; перегородки – из кирпича полнотелого КРПУ; перекрытие – плиты шифр 0-312; полы – бетонные, линолеум, керамическая неглазурованная плитка. Степень готовности объекта по состоянию на 01.05.2008 г. – 63 %
7	Условия продажи объекта	Сохранить функциональное назначение объекта. Возместить сверх цены продажи затраты в течение 30 календарных дней с момента подписания акта приема-передачи объекта стоимости дополнительных проектно-изыскательских, строительно-монтажных и прочих затрат, понесенных заказчиком (УП «УКС Мингорисполкома») по строительству объекта после даты оценки до даты подписания акта приема-передачи. Возместить сверх цены продажи затраты в течение 30 календарных дней с момента подписания акта приема-передачи объекта стоимости дополнительных проектно-изыскательских, строительно-монтажных и прочих работ по инженерным сетям, благоустройству и озеленению по состоянию на 01.04.2009 в сумме 237 946 182 руб. – по лоту № 1, проиндексированных на дату их перечисления по индексам изменения стоимости строительно-монтажных работ по элементам затрат по г. Минску по ресурсно-сметным нормам (для работ, не освобождаемых от налога на добавленную стоимость). Компенсировать УП «УКС Мингорисполкома» затраты по выплате земельного налога с момента принятия объекта по акту приема-передачи до оформления правоустанавливающих документов на земельный участок.

** Сведения о площадях объектов, не завершенных строительством, даются на основании проектно-сметной документации.*

1). Аукцион состоится **26 июня 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

2). Для участия в аукционе необходимо представить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы: заявление на участие в аукционе по установленной форме;

юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность;

представителям физических лиц – резидентов Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность;

юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

- документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иным финансово-кредитным учреждением, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

- представители юридических и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

При подаче документов на участие в аукционе представитель юридического лица должен представить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а также документы, подтверждающие его полномочия на участие в аукционе и на подписание документов:

- руководитель юридического лица – документ о его назначении или избрании, а при необходимости – документ о его полномочиях, согласно уставу юридического лица;

- иные представители – доверенность, оформленную согласно учредительным документам юридического лица.

Физическое лицо (или его представитель, участвующий в аукционе по доверенности, удостоверенной нотариально) должно представить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

соглашение о правах и обязанностях сторон;

заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение: а) задатка в сумме 10 % начальной цены;

б) платы за участие в аукционе в размере 4-х базовых величин. Денежные средства перечисляются на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов по каждому лоту признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 10-ти рабочих дней с даты проведения аукциона. Оформление акта землепользования производится Покупателем.

Победитель аукциона обязан произвести оплату организатору аукциона за подготовку и проведение аукциона в размере 4 процентов от начальной цены продаваемого объекта и 5 процентов от суммы превышения цены продажи над начальной.

Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 25 июня 2009 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок: 227 40 22. Интернет: www.mgcn.by

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

БЕЛАРУСЬ ВЫСТУПІЦЬ З КАНКРЭТНЫМІ ІНІЦЫЯТЫВАМІ ПА РАЗВІЦЦІ І ЎМАЦАВАННІ АДКБ

На сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы Беларусь выступіць з шэрагам канкрэтных ініцыятыў па развіцці і ўмацаванні АДКБ. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў ходзе рабочай сустрэчы з міністрам абароны Беларусі Леанідам Мальцавым.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што на маючай адбыцца чэрвеньскай сесіі Савета калектыўнай бяспекі старшынства ў арганізацыі пяройдзе ад Арменіі да Беларусі. «Так ужо склалася ў гісторыі нашага ўдзелу ў шматбаковых саюзах, што калі Беларусь становіцца старшынствуючай, то з'яўляецца калі не моцная эфектыўнасць у дзейнасці тых або іншых органаў, то актыўнасць — гэта дакладна, ды і эфектыўнасці хапала. Таму будзе шэраг ініцыятыў з нашага боку. Неабходна, каб наша старшынства ў АДКБ на працягу наступнага года было эфектыўным», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Прэзідэнта цікавіў ход падрыхтоўкі да аператыўна-стратэгічных вучэнняў «Захад-2009» і прапрацоўка дакументаў, што развіваюць пагадненне аб Адзінай сістэме проціпаветранай абароны Беларусі і Расіі.

Не засталася без увагі кіраўніка дзяржавы і тэма святкавання 65-годдзя вызвалення Беларусі. «Як ні было б складана і цяжка, мы не можам не адзначыць дастойна гэта свята. Прынізіць яго значэнне, нават у складаныя часы, мы не маем права. Яшчэ жывыя тысячы людзей, якія былі непасрэднымі ўдзельнікамі вайны. Гэта ўсенароднае свята, і нам спрашчацца тут не варта, хоць я не прыхільнік таго, каб раскідваць сродкі. Усё павінна быць аптымальна», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ПАВІНШАВАЎ КАРАЛЯ ШВЕЦЫІ КАРЛА XVI ГУСТАВА З ДНЁМ ШВЕДСКАГА СЦЯГА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 6 чэрвеня павіншаваў Караля Швецыі Карла XVI Густава з нацыянальным святам — Днём шведскага сцяга.

Кіраўнік дзяржавы выказаў надзею, што заснаванае на прынцыпах павагі і ўзаемаразумення беларуска-шведскае супрацоўніцтва будзе і ў далейшым усебакова развівацца на карысць народаў дзвюх краін.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

БЕЛАРУСЬ ЗАЦІКАЎЛЕНА Ў ВЫКАРЫСТАННІ МАГЧЫМАСЦЯЎ ІЗРАІЛЯ ДЛЯ АКТЫВІЗАЦЫІ БЕЛАРУСКА-АМЕРЫКАНСКАГА ДЫЯЛОГА

Гэты факт адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей падчас сустрэчы з намеснікам прэм'ер-міністра Дзяржавы Ізраіль — міністрам замежных спраў Авігдорам Ліберманам.

Уладзімір Макей лічыць неабходным вычленіць у беларуска-ізраільскім супрацоўніцтве праекты, якія змогуць зрушыць эканамічны складальнік узаемадзеяння з мёртвага пункта. Закрануўшы праекты ў навукова-тэхнічнай сферы, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта прапанаваў ізраільцянам актывізаваць супрацоўніцтва з Паркам высокіх тэхналогій. Беларускі бок таксама выказаў гатоўнасць аказаць садзейнічанне кампаніям з Ізраіля ў частцы станаўлення ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Паводле слоў Уладзіміра Макея, у мэтах развіцця супрацоўніцтва ў галіне сельскай гаспадаркі Беларусь можа прапанаваць партнёрам з Ізраіля ўчастку варнай зямлі або сельгасарганізацыі для вырошчвання сельскагаспадарчых культур з прымяненнем новых ізраільскіх тэхналогій.

Авігдор Ліберман на сустрэчы выказаўся за актывізацыю міжпарламенцкага супрацоўніцтва і адзначыў магчымасці развіцця ўзаемадзеяння ў галіне высокіх тэхналогій і нанатэхналогій.

ЕЎРАПЕЙЦЫ РАЗМЕРКАВАЛІ ДЭПУТАЦКІЯ МАНДАТЫ

Больш за трэць месцаў у Еўрапарламенце выбаршчыкі аддалі Еўрапейскай народнай партыі. Паводле папярэдніх звестак, пераможцы, прадстаўнікі кансерватыўнай цэнтрысцкай партыі, зоймуць 267 дэпутацкіх крэслаў (з 736). Сацыялісты атрымалі ад еўрапейцаў 159 мандатаў. На 81 месца могуць разлічваць у новым складзе лібералы, і 51 голас у парламенце будуць мець «зялёныя». Астатнія месцы зоймуць партыі, што не ўваходзяць у асноўныя наднацыянальныя палітычныя аб'яднанні Еўропы.

Яўка на выбары, у назіранні за якімі ўзялі ўдзел і прадстаўнікі беларускага Цэнтрвыбаркама, стала рэкордна нізкай з 1979 года. У сярэднім па Еўрапейскім саюзе яна склала каля 43,5 працэнта (супраць 45,4 працэнта на мінулых выбарах пяць гадоў таму). Сярод прычын неактыўнасці электарату агучваюцца эканамічны крызіс, а таксама недастатковае асвятленне еўрапейскай тэматыкі ў сродках масавай інфармацыі.

Ала МАЧАЛАВА.

Прастоі — час для падпрацоўкі?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Банк вакансій станавіўся меншым на працягу студзеня-красавіка. Праўда, малюнак пачаў змяняцца ў маі, калі колькасць свабодных працоўных месцаў зноў стала ўзрастаць. Такім чынам, сёння службы занятасці маюць 47,1 тысячы заявак ад наймальнікаў — пры агульнай колькасці беспрацоўных 44,4 тысячы чалавек. Усё гэта, зазначыў Пётр Грушнік, дазваляе зрабіць выснову: істотнага пагаршэння сітуацыі з рэгістраваным беспрацоўем не адбылося, прыняцця якіх-небудзь надзвычайных мераў тут не патрабуецца.

У той жа час казаць, што праблем няма ўвогуле, таксама нельга. Па-ранейшаму застаюцца пытанні з працаўладкаваннем моладзі, жанчын і асобаў, што вярнуліся з месцаў пазбаўлення волі, даволі неадназначнай атрымліваецца раскладка па рэгіёнах: у 58 раёнах узровень беспрацоўя вагаецца ў межах 1,1-1,5, у 9 раёнах — у межах 1,6-2, а ў Ганцавіцкім, Пастаўскім і Рэчыцкім раёна х ён складае 2,1 %. І ўсё ж ці не найбольш няспросты момант — вымушаная няпоўная занятасць. Як заўважыў Пётр Грушнік, рост яе паказчыкаў тлумачыцца непасрэдным уплывам на эканоміку нашай краіны сусветнага эканамічнага крызісу.

130 праблем рынку працы

Адна з цікавых праяў сусветнага фінансавага крызісу ў Беларусі — змякчэнне праблемы з дэфіцытам будаўнікоў. Па вельмі простай прычыне: у айчынную эканоміку сталі «вяртацца» грамадзяне нашай краіны, якія дагэтуль лічылі за лепшае зарабляць у Расіі. Зрэшты, відавочны «плюс» з лішкам пераважылі «мінусы». І ці не галоўны з іх — павелічэнне ўзроўню вымушанай няпоўнай занятасці. Гэта праблема пачала абвастрацца з лістапада мінулага года і, на жаль, захавалася па сёння. Як сведчыць статыстыка, у сёлетнім красавіку колькасць работнікаў, што былі занятыя ва ўмовах няпоўнага рэжыму, складала 75,6 тысячы чалавек. Гэта ў 1,2 раза больш, чым у сакавіку, і адразу ў 8,3 раза больш, чым у красавіку мінулага года.

Не так значна (на 1 %, ці з 50,7 да 51,2 тысячы чалавек) у красавіку ў параўнанні з сакавіком узрасла колькасць работнікаў, што знаходзяцца ў водпусках з частковым захаваннем або ўвогуле без захавання зарплаты. Аднак агульны аб'ём вымушанай няпоўнай занятасці ўражвае: у красавіку ён склаў 126,8 тысячы работнікаў — 3,8 % ад іх агульнай колькасці.

Маніторынг Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, што праводзіцца па 699 арганізацыях, якія маюць найбольшае значэнне для рэгіянальных рынкаў працы, засведчыў пэўнае паляпшэнне ў маі. У параўнанні з сакавіком колькасць прадпрыемстваў, дзе рэгіструюцца страты працоўнага часу, зменшылася з 183 да 130, а колькасць работнікаў, занятых на «кантрольных» суб'ектах гаспадарання ў няпоўным рэжыме, — з 79 да 60 тысяч чалавек. Аднак становішча ў прамысловасці, лёгкай і лесапаяровай прамысловасці па-ранейшаму застаецца складаным, да таго ж у параўнанні з пачаткам мінулага месяца адзначана пагаршэнне па будаўніцтве, лясной гаспадарцы, прадпрыемствах камунальнай уласнасці. Што да асобных суб'ектаў гаспадарання, то тут найбольшыя страты працоўнага часу адзначаюцца на БелАЗе, Баранавіцкім станкабудаўнічым заводзе, Баранавіцкім баваўнянапапяровым аб'яднанні, сталічным НВА вытворчай тэхнікі, а менавіта за апошні час страты сталі рэаліяй для такіх буйных прадпрыемстваў, як Беларускі металургічны завод, гомельскі завод «Гідрапрывад», холдынгавая кампанія «Пінскдрэў».

Як адзначыў Пётр Грушнік, вымушаныя водпускі і няпоўны працоўны час варта разглядаць як антыкрызісную меру, якую выкарыстоўваюць многія краіны свету. Мэта тут адна — захаванне вытворчасцяў і працоўных калектываў. Але таксама зразумела, што прастоі могуць прывесці да звальнення. З улікам гэтага ў міністэрстве перакананыя: скідваць з рахунку горшы варыянт нельга.

Экатурызм — падказка беспрацоўным?

Паводле слоў Пятра Грушніка, па выніках гэтага года ўзровень рэгістраванага беспрацоўя не павінен перавысіць 1,1-1,2 % ад агульнай колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва краіны. У Беларусі працягнецца навучанне і перанавучанне беспрацоўных новым спецыяльнасцям, субсідзіраванне прадпрымальніцтва, будзе выдзяляцца дапамога пры перасяленні ў іншую мясцовасць, будуць стварацца новыя працоўныя месцы — да слова, не выключана, што сёлета планы па арганізацыі новых месцаў для працаўладкавання ў малых гарадах павялічацца ў 1,2 раза.

Аднак, падкрэсліў Пётр Грушнік, давядзецца шукаць і іншыя падыходы, таму зараз міністэрствам падрыхтаваны своеасаблівы пакет «антыкрызісных прапаноў». Па-першае, плануецца павялічыць выдаткі па такіх напрамках, як арганізацыя прадпрымальніцкай дзейнасці і грамадскіх работ. Прычым ёсць намер забяспечыць магчымасцю ўдзельнічаць у тых жа грамадскіх работах і атрымліваць часовы заробак не толькі беспрацоўных, але і работнікаў, што знаходзяцца ў водпусках без захавання зарплаты. У сваю чаргу інфармацыя аб варыянтах падпрацовак будзе распаўсюджвацца непасрэдна ў «праблемных» арганізацыях.

Другая цікавая прапанова — рэгістраваць у якасці беспрацоўных звольненых работнікаў, якія з'яўляюцца акцыянерамі прадпрыемстваў. Прапанова нумар тры — накіроўваць на прафесійную перападрыхтоўку работнікаў, над якімі толькі навісае рызыка звальнення. Апроч таго, міністэрства выступае з ініцыятывай прагледзець памеры кампенсацыйных выплат па зарплаце наймальнікам, якія ствараюць працоўныя месцы ў малых гарадах і сельскай мясцовасці ў рамках «Моладзевай практыкі», выдзяляць фінансавую падтрымку беспрацоўным на развіццё аграэкатурызму і рамесніцкай дзейнасці. Нарэшце, будзе вывучацца і пытанне аб павелічэнні дапамог па беспрацоўі і стыпендый для грамадзян, што накіроўваюцца службамі занятасці на перападрыхтоўку. Тым больш, што на сёння тыя ж дапамогі па беспрацоўі ў Беларусі атрымліваюцца ніжэйшыя, чым у Расіі ці ва Украіне.

Сяргей ГРЫБ.

«У ГУЛЬНІ СУПРАЦЬ АНДОРЫ ЗАЎСЁДЫ ПАВІНЕН БЫЦЬ ПЕНАЛЬЦІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Галоўны трэнер каманды Андоры Давід Радрыга адзначыў, што Беларусь паказала сябе добрай камандай, якая здолела забіць мячы на першай і апошняй хвілінах першага тайма. І паводле яго прызнання, каманду зламаў не столькі першы гол, колькі другі, на 44-й хвіліне. У другім тайме падапечныя Давіда Радрыга так і не здолелі аднавіць свой маральны дух. Паводле слоў трэнера, яго футбалісты не змаглі справіцца з флангавымі гульцамі беларускай зборнай, а гэта Ігар Стасевіч і Цімафей Калачоў, за што і паплаціліся.

Бернд Штанге быў катэгарычным у ацэнках. Наконт парушэнняў правілаў ён адзначыў: «У гульні супраць Андоры заўсёды павінен быць пенальці. Андорскія футбалісты заўсёды правакуюць, і сёння мы паддаліся на гэты сродак. Гэта мяне расстроіла». Нямецкі спецыяліст заклікаў сваіх гульцоў быць цярплівымі. «Гэта была гульня на цярпенне. Усе бачылі, што ўся андорская зборная гуляла толькі перад сваімі варотамі. Цяжка прабіць такую сцяну, але шанцы былі. Калі ў такой сітуацыі пачаць нервавацца, супернік можа забіць. Я казаў футбалістам, што першы гол можа здарыцца і на 60-й хвіліне. Трэба пастаянна гуляць, і супернік зламаецца. Але хуткі гол нам дапамог».

Нападаючы зборнай Беларусі Сяргей Карніленка ў гутарцы з журналістамі пасля матча расказаў, што да другога гола лёс сустрэчы «вісеў у паветры». «Футбалісты Андоры рабілі ўсё самае дрэннае — шчыпаліся, драпаліся, але мы перамаглі і атрымалі ад выніку задавальненне», — падзяліўся ўражаннямі форвард.

І ўсё ж Бернд Штанге даў зразумець, што такі вынік не паказвае сапраўднага ўзроўню каманды: «Калі мы на такім узроўні будзем гуляць са зборнымі Харваты, Украіны, Англіі, тады можна казаць пра маштаб. Мы проста выканалі свой абавязак і забілі пяць галоў. Што такое зборная, пакажуць наступныя гульні. Я шкадую, што ў нас такая моцная група. Калі выйграем супраць Харваты, Казахстана і Украіны дома, вось гэта будзе цікава, і гэта наша мэта».

Генадзь Блізнюк не дасць суперніку сесці сабе на карак.

Фота БЕЛТА.

Гэта перамога падняла нашу каманду на трэцяе месца ў шостай адборачнай групе, што стала магчымым яшчэ і дзякуючы супернікам. У Харваты 6 чэрвеня мясцовая зборная згуляла ўнічыю з камандай Украіны — 2:2. Яшчэ ў адным матчы групы англічане разгромілі на выездзе зборную Казахстана 4:0.

Алена АЎЧЫННІКАВА.
Мінск—Гродна.

СУСВЕТНЫ БАНК НЕ ПАЗЫЧАЕ НЕПЛАЦЕЖАЗДОЛЬНЫМ

«Звязда» ўжо паведамляла аб маючым адбыцца візіце ў Беларусь намесніка віцэ-прэзідэнта — дырэктара па стратэгіі і аперацыях Сусветнага банка рэгіёна Еўропы і Цэнтральнай Азіі Тэда Алерса і дырэктара аддзела Украіны, Беларусі і Малдовы гэтага банка Марціна Райзера. Учора яны і іншыя члены дэлегацыі сустрэліся з беларускімі журналістамі.

Невялікая прэс-канферэнцыя адбылася адразу пасля афіцыйнага падпісання ў мінскім офісе Сусветнага банка пагаднення аб выдзяленні нашай краіне чарговай пазыкі ў аб'ёме $125 мільёнаў. Грошы пойдуць выключна на рэалізацыю праекта «Павышэнне энергаэфектыўнасці ў Рэспубліцы Беларусь». Асноўнай яго задачай, нагадаем, з'яўляецца пераабсталяванне наяўных энергазатратных кацельняў у невялікіх і сярэдніх гарадах у эканамічныя ТЭЦ. Напрыклад, адна з такіх цеплацэнтраляў будзе пабудавана ў Барысаве.

Адпаведнае пагадненне падпісалі старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь Валерый Карашкоў і Марцін Райзер. Па яго словах, гэта падзея — добры сігнал аб тым, што Сусветны банк і Беларусь пашыраюць супрацоўніцтва. Ён адзначыў, што гэта самы вялікі па аб'ёме фінансавання праект за ўсю гісторыю супрацоўніцтва Беларусі з банкам. Па яго словах, гэта таксама і цудоўны вынік сумеснай шматгадовай работы з урадам краіны.

Валерый Карашкоў у сваю чаргу падкрэсліў, што гэтаму пагадненню папярэднічала паспяховая рэалізацыя шэрагу іншых праектаў у сацыяльнай сферы на дзясяткі мільёнаў долараў. Цяперашні праект прадугледжвае работу па шасці актуальных кірунках дзейнасці ў галіне павышэння энергаэфектыўнасці, жыллёва-камунальнай сферы. На думку Валерыя Карашкова, пашырэнне стасункаў — заканамерны вынік, пачатак развіцця супрацоўніцтва з банкам на новым узроўні.

Па словах Тэда Алерса, яго ўразіла ў добрым сэнсе гэтага слова тое, як былі рэалізаваны папярэднія праекты па энергаэфектыўнасці. Ён гэта, у прыватнасці, на свае вочы днямі ўбачыў у Гомельскай вобласці, у раёнах, якія пацярпелі ад Чарнобыля. І гэта работа — лепшае пацвярджэнне ўсталяванню плённых адносінаў Сусветнага банка і беларускіх партнёраў. У ходзе паездкі Тэд Алерс пераканаўся ў станоўчых зменах у сферы энергетычнага сектара Беларусі, няхільным павышэнні энергаэфектыўнасці. А падпісанне сённяшняга праекта сведчыць аб росце даверу паміж банкам і ўрадам нашай краіны. «І мы б хацелі ўмацоўваць гэта супрацоўніцтва з Беларуссю», — сказаў высокапастаўлены прадстаўнік Сусветнага банка.

Тэд Алерс звярнуў увагу на тое, што яго банк не выдзяляе вялікія грошы тым краінам-кліентам, якіх Сусветны банк лічыць неплацежаздольнымі. Гэта быў яго адказ на пытанне аб нядаўнім змрочным прагнозе віцэ-прэм'ера — міністра фінансаў Расіі Аляксея Кудрына аб хуткім дэфолце ў Беларусі. Зараз спецыялісты Сусветнага банка разглядаюць перспектывы пашырэння тэхнічнай і фінансавай падтрымкі намаганняў Беларусі па пераадоленні наступстваў крызісу. Увогуле Сусветны банк выступае за паглыбленне адносінаў з Беларуссю па розных кірунках дзейнасці, напрыклад, у сферы інвестыцый. Сёння ідзе абмеркаванне пытання аб новых сумах вялікіх пазык. Прадстаўнікі Сусветнага банка ўхіліліся ад агучвання канкрэтных лічбаў, але далі зразумець, што размова можа ісці прыкладна аб $100 мільёнах штогод. А можа, і больш. Усё будзе вырашана ў ходзе перамоў з урадам.

Што датычыць знешняга доўгу Беларусі, то, па словах Марціна Райзера, ён цяпер знаходзіцца ў межах 13 % валавога ўнутранага прадукту, што не з'яўляецца пагражальным паказчыкам для эканомікі краіны. Перад Беларуссю стаіць задача па прыцягненні замежных інвестыцый і іх эфектыўным выкарыстанні.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Абзац

◢ Згодна з аператыўнымі звесткамі АСВОД, з пачатку года па 31 мая г.г. у Беларусі патанула 202 чалавекі, 20 з якіх — дзеці. У параўнанні з адпаведным леташнім перыядам сёлета патанула на 30 чалавек менш.

◢ На будаўніцтве шматкватэрнага дома па вул. Гаявой у Баранавічах пры падзенні стралы вежавага крана тросам закрануло муляра. 45-гадовы жыхар горада з закрытай ЧМТ, ранай патыліцы, выцятымі грудной клеткай і паяснічай дастаўлены ў гарадскую бальніцу. Праверку праводзіць пракуратура горада.

◢ У пасёлку Ула Бешанковіцкага раёна дзве дзяўчыны забілі з-за рэўнасці сваю малодшую знаёмую, паведамілі БЕЛТА ў пракуратуры Віцебскай вобласці. Удзельніцамі трагедыі сталі дзве другакурсніцы і першакурсніца мясцовага прафесійнага ліцэя. У лясным масіве старэйшыя пабілі, а потым задушылі першакурсніцу. Усе тры дзяўчыны былі сіротамі і да вучобы выхоўваліся ў інтэрнаце. Трывогу забілі выхавальнікі інтэрната, калі адна з іх падапечных не з'явілася начаваць. Былі затрыманы падазроныя, якія прызналіся ў зробленым і паказалі, дзе схавалі цела. Узбуджана крымінальная справа. З улікам таго, што падазроным споўнілася на 18 гадоў, ім пагражае суровае пакаранне, аж да вышэйшай меры.

◢ У Клімавіцкім раёне спынены вываз за межы Беларусі 10 тон былых у карыстанні свінцовых акумулятараў. Супрацоўнікі мясцовага РАУС затрымалі грузавую аўтамашыну «Мерседэс Бэнц», якой кіраваў жыхар Слуцка. Дакументаў на груз у яго не было. Вядзецца праверка.

◢ Пракуратура Мінскай вобласці накіравала ў суд крымінальную справу ў дачыненні да былога старшыні аднаго з сельскіх выканаўчых камітэтаў Мінскай вобласці. Жанчына незаконна раздавала зямельныя ўчасткі грамадзянам. З мая 2006-га па жнівень 2008-га яна сістэматычна парушала патрабаванні заканадаўства, з прычыны асабістай зацікаўленасці складала і падпісвала падложныя рашэнні пасяджэнняў сельвыканкама аб выдзяленні ўчасткаў у прыватную ўласнасць для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома.

Поўны абзац

◢ Жыхарка Чыкага Элеанор Бэнц атрымала пасведчанне аб заканчэнні школы ва ўзросце 90 гадоў. Яна кінула школу ў 1936 годзе, у апошні год навучання, каб уладкавацца на працу: па месцы працы яе сястры з'явілася вакансія. Потым жанчына выйшла замуж і на працягу 23 гадоў нарадзіла 15 дзяцей, так што на школу не было часу. Незадоўга да свайго 90-годдзя бабуля 54 унукаў прызналася, што самым вялікім расчараваннем у яе жыцці было кінуць школу. Радня звязалася з навучальнай установай і папыталася, ці можна атрымаць пасведчанне праз 73 гады. Былі паднятыя архівы, і Бэнц выпісалі атэстат. На святкаванні юбілею яго ўрачыста ўручылі бабулі — яна была ў захапленні. «Хоць, ведаеце, зараз школьнай адукацыі недастаткова. Трэба ісці ў каледж», — заявіла яна журналістам.

◢ Жыхар Баварыі ўстанавіў сусветны рэкорд па колькасці пацалункаў у адзінку часу. 31-гадовы Міхаэль Бастынг, вэб-дызайнер па прафесіі, стоячы ў суботу на бардзюры каля адной з дыскатэк, змог на працягу хвіліны ашчаслівіць пацалункам 111 жанчын, што праходзілі міма. Самае галоўнае ў хуткасным цалаванні, лічыць Міхаэль, захаваць рытм дыхання. Гэта дасягаецца рэгулярнымі трэніроўкамі. Па словах рэкардсмена, трэніраваўся ён пераважна ў офісе сваёй фірмы — на калегах. Яго асабісты рэкорд — 136 пацалункаў у хвіліну. Папярэдні рэкорд належыць аўстралійцу, які паспеў за хвіліну пацалаваць 96 чалавек.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Не фініш, а старт

Парламенцкі дзённік

На думку намесніка старшыні Палаты прадстаўнікоў Валерыя ІВАНОВА, з улікам зробленых Беларуссю дзеянняў, аднаўленне статусу спецыяльнага запрошанага ў ПАСЕ стала б лагічным крокам.

Для ўдзелу ў афіцыйнай цырымоніі адкрыцця інфапункта Савета Еўропы ў Беларусь прыбылі прадстаўнікі трох асноўных структур СЕ — Камітэта міністраў, Генеральнага сакратарыята і Парламенцкай Асамблеі. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел старшыня Камітэта міністраў Савета Еўропы, міністр замежных спраў Славеніі Самуэль Жбогар, намеснік Генеральнага сакратара СЕ Мод дэ Бур-Букікіа і дакладчык па Беларусі Камісіі ПАСЕ па палітычных пытаннях Андрэа Рыгоні.

Напярэдадні адкрыцця інфапункта спадар Рыгоні сустрэўся з намеснікам старшыні Палаты прадстаўнікоў Валерыем Івановым. «Беларускі бок разглядае факт адкрыцця інфармацыйнага пункта ў якасці значнага пазітыўнага выніку ўзаемнага руху насустрач паміж ПАСЕ і Рэспублікай Беларусь», — адзначыў віцэ-спікер. Ён выказаў спадзяванне на тое, што далейшае ўзаемадзеянне пойдзе больш хуткімі тэмпамі. А таксама зрабіў акцэнт на тым, што Беларусь зацікаўлена ў далучэнні да шэрагу прававых інструментаў Савета Еўропы, у прыватнасці ў крымінальна-прававой сферы. Палітык падкрэсліў важнасць аднаўлення рэгулярных кантактаў Нацыянальнага сходу і Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы для абмену меркаваннямі ва ўсіх пытаннях міжнароднага развіцця і ўнутранага стану краіны.

На думку віцэ-спікера, з улікам зробленых Беларуссю дзеянняў, аднаўленне статусу спецыяльнага запрошанага ў ПАСЕ стала б лагічным крокам з боку Савета Еўропы. Ён мяркуе, што 23 чэрвеня (на сесіі Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы) будзе прынята правільнае рашэнне.

Замежны госць назваў адкрыццё інфармацыйнага пункта СЕ ў Мінску паваротным момантам у адносінах паміж ПАСЕ і Беларуссю. «Мы чакаем, што гэта будзе толькі першым крокам супрацоўніцтва», — падкрэсліў дакладчык па Беларусі Камісіі па палітычных пытаннях ПАСЕ. — Мы павінны зрабіць яшчэ шмат крокаў наперад». Рашэнне камісіі аб неабходнасці аднаўлення статусу спецзапрошанага для беларускага парламента ён назваў стартавым момантам. Пытанне будзе разгледжана на пасяджэнні сесіі Парламенцкай Асамблеі 23 чэрвеня, куды, паводле слоў Андрэа Рыгоні, запрошаны кіраўнік Палаты прадстаўнікоў Беларусі Уладзімір Андрэйчанка. Аднаўленне статусу стане чарговым этапам у працэсе дыялогу, заўважыў госць і дадаў, што на гэтым мы таксама не спынімся: «там няма расцяжкі «фініш».

Сёння інфармацыйныя бюро функцыянуюць у такіх дзяржавах, як Албанія, Арменія, Азербайджан, Балгарыя, Боснія і Герцагавіна, Венгрыя, Грузія, Расія, Латвія, Літва і інш. У Беларусі інфармацыйны пункт Савета Еўропы адкрыўся ўчора на базе Інстытута журналістыкі БДУ.

Ала МАЧАЛАВА.

Разумны баланс

Ніна МАЗАЙ пра Усходняе партнёрства: «Для нас гэта не было выбарам «ці Захад, ці супрацоўніцтва з Расіяй».

З чатырохдзённым візітам у Беларусі дзелегацыя парламенцкай групы сяброўства «Францыя — Беларусь» на чале з яе кіраўніком Жэромам Ламбэрам, членам камісій Нацыянальнай асамблеі Францыі па заканадаўстве і па еўрапейскіх справах. Госці наведаюць БДУ і Дзяржаўную акадэмію музыкі, інфармацыйны пункт Савета Еўропы, азнаёмяцца з работай «Камунаркі». У іх запланаваныя сустрэчы з кіраўніцтвам Міністэрства замежных спраў і Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Вядома ж, пабывалі дэлегаты і ў беларускім парламенце.

Кіраўнік Савета Рэспублікі Барыс Батура выразіў спадзяванне, што праведзеная ў рамках візіту дыскусія дазволіць «зблізіць нашы пазіцыі і далей прасоўвацца ў міжпарламенцкім супрацоўніцтве». А ў выніку перамоў атрымаецца выйсці на падпісанне пагадненя паміж парламентамі Беларусі і Францыі. Пашырэнне супрацоўніцтва з краінамі ЕС ён назваў адным з прыярытэтных кірункаў міжнароднай палітыкі краіны. Спікер прыгадаў шматлікія візіты еўрапейскіх парламентарыяў у Беларусь і айчынных заканадаўцаў у Еўропу. «Такая актывізацыя кантактаў будзе садзейнічаць паляпшэнню нашага супрацоўніцтва і аднаўленню ў поўным аб'ёме тых кантактаў з Еўрасаюзам, якія былі раней», — упэўнены старшыня Савета Рэспублікі. Ён таксама выказаўся аб перспектывах гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. Захады па паляпшэнні інвестыцыйнага клімату ў Беларусі, на яго думку, даюць падставу для яшчэ больш актыўнага двухбаковага ўзаемадзеяння ў гэтым кірунку.

Кіраўнік французскай дэлегацыі Жэром Ламбэр падкрэсліў: «Нягледзячы на тое, што палітычныя сістэмы нашых краін адрозніваюцца, мы жывём на адным кантыненце, у нас агульныя культурныя карані. Мы будзем прагрэсаваць разам на карысць Еўропы і свету».

Падчас сустрэчы з госцем Ніна Мазай, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, таксама казала пра развіццё гандлёва-эканамічных стасункаў: «Мы нядрэнна папрацавалі, нягледзячы на крызіс. У 2008 годзе на 53 працэнты павялічыўся аб'ём узаемнага тавараабароту». Летась ён склаў каля 648 млн долараў. Пакуль што фактарам, які стрымлівае больш трывалае ўзаемадзеянне ў гандлёва-эканамічным і інвестыцыйным кірунках, з'яўляецца адсутнасць адпаведнай дагаворна-прававой базы. Магчыма, гэты візіт зробіць істотны ўнёсак у вырашэнне праблемы. А вось культурныя кантакты дзвюх краін наладжаныя выдатна. Традыцыйна інтарэс абодвух бакоў праяўляецца да арганізацыі канцэртаў музычных калектываў, выступленняў фальклорных ансамбляў. У лістападзе плануецца ўдзел беларускіх музыкаў у міжнародным фестывалі «Еўропа культур», які адбудзецца ў Парыжы.

Спадарыня Мазай выразіла спадзяванне, што візіт французскай дэлегацыі дазволіць парламентарыям зрабіць уласныя высновы пра сітуацыю ў краіне. А першая сустрэча ўдзельнікаў групы сяброўства будзе плённай і паслужыць тым першым крокам, які стане асновай узнаўлення не толькі кантактаў паміж парламентарыямі, але і паўнамаштабнага супрацоўніцтва паміж краінамі ў цэлым. На думку старшыні Камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, цяперашнія ўмовы спрыяльныя для аднаўлення кантактаў, паколькі яны адбываюцца на фоне дастаткова актыўнага дыялогу Беларусі з еўрапейскімі структурамі. «Мы задаволеныя тым фарматам, у якім прынята рашэнне аб Усходнім партнёрстве», — адзначыла Ніна Мазай. «Для нас гэта не было выбарам «ці Захад, ці супрацоўніцтва з Расіяй». Мы разглядаем гэта як магчымасць збалансаваць нашы адносіны і з захадам, і з усходам у інтарэсах нашай агульнай бяспекі і адкрытай эканамічнай прасторы». Узнаўленне ж беларуска-французскіх кантактаў, на думку сенатара, «пры ўсёй рознасці нашых палітычных сістэм, дазволіць нам выказыць галіны агульнага інтарэсу, каб будаваць адзіную Еўропу».

Падчас сустрэчы ў Палаце прадстаўнікоў віцэ-спікер Валерый Іваноў зрабіў акцэнт на актуальнасці пабудовы двухбаковых дыялогаў у рамках развіцця супрацоўніцтва з Еўропай. Намеснік старшыні выразіў спадзяванне, што беларуска-французскія міжпарламенцкія адносіны пачнуць развівацца больш інтэнсіўна.

У гутарцы з журналістамі Жэром Ламбэр адзначыў, што ўдзел Беларусі ва Усходнім партнёрстве можа прывесці да зніжэння кошту шэнгенскіх візаў для грамадзян краіны. Паводле яго слоў, у рамках праграмы плануецца разгледзець пытанне аб зніжэнні кошту візаў, і ён спадзяецца, што адбудзецца зрух у вырашэнні гэтай праблемы. Усходняе партнёрства павінна прывесці да паляпшэння адносінаў на еўрапейскім кантыненце — мяркуе спадар Ламбэр, у тым ліку гэта паспрыяе і беларуска-французскаму супрацоўніцтву.

Ала МАЧАЛАВА.

У Акадэміі навук абралі 11 акадэмікаў і 24 членаў-карэспандэнтаў

НАВУКОЎЦЫ ПАМАЛАДЗЕЛІ, АДНАК ЗАСТАЮЦЦА Ў СТАЛЫМ УЗРОСЦЕ

5 чэрвеня адбыўся Агульны сход Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Была зацверджана справаздача аб дзейнасці НАН Беларусі ў 2008 годзе, праведзены выбары ў сапраўдныя члены (акадэмікі) і члены-карэспандэнты Акадэміі навук, таксама з дакладам выступіў генеральны дырэктар ДНУ «Аб'яднаны інстытут энергетычных і ядзерных даследаванняў — «Сосны» НАН Беларусі Вячаслаў Куўшынаў.

Як расказаў журналістам першы намеснік Старшыні Прэзідыума НАН Беларусі акадэмік Пётр Віцязь, галоўнай падзеяй сходу былі выбары. Звычайна яны праходзяць раз у 2,5 -3 гады, аднак па прычыне рэарганізацыі працы Акадэміі навук з моманту апошніх прайшло 4 гады. Спачатку, як паведаміў Пётр Віцязь, у адпаведнасці са Статутам прайшла шырокая дыскусія, у выніку якой было вызначана, па якіх спецыяльнасцях будуць вакансіі з улікам прыярытэтаў краіны. Прэзідыум зацвердзіў квоты на акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў па аддзяленнях. Аддзяленні выказалі свае прапановы па спецыяльнасцях, пасля чаго быў аб'яўлены конкурс з абмеркаваннем і водгукамі на кандыдатаў. Такім чынам на 15 вакансій акадэмікаў і 29 вакансій член-карэспандэнтаў прэтэндавалі адпаведна 27 і 93 кандыдаты. Самым вялікім быў конкурс сярод кандыдатаў на званне акадэміка па спецыяльнасці «Біятэхналогія» — 4 чалавекі на месца. У той жа час па некаторых спецыяльнасцях выбары праходзілі на безальтэрнатыўнай аснове. Сярод кандыдатаў на званне члена-карэспандэнта больш за ўсё прэтэндэнтаў было па спецыяльнасці «Матэрыялазнаўства» — 10 чалавек на месца. У выніку галасавання выбрана 11 сапраўдных членаў (акадэмікаў) і 24 члены-карэспандэнты. Па дзевяці спецыяльнасцях кандыдаты не набралі належнай колькасці галасоў і вакансіі засталіся незапоўненымі, у тым ліку 4 вакансіі акадэмікаў і пяць — членаў-карэспандэнтаў. Выбары, паводле слоў намесніка Старшыні Прэзідыума НАН, прайшлі галосна і дэмакратычна.

Сярод абраных, як расказаў Пётр Віцязь, 3 рэктары, 22 кіраўнікі навукова-даследчых арганізацый, 10 даследчыкаў, якія працуюць у НДІ, ВНУ і іншых установах. Ён заўважыў, што акадэмікі і члены-

Скарбы Каралінова

Як выратавалі фальварак Храптовічаў

Ад Мінска — на Вішнева, пасля яшчэ праз некалькі вёсак і выязджаем на закінутую гравійку. Дарога, мякка кажучы, не надта дагледжаная: машына нейкім цудам «выскоквае» з чарговай лужыны і тут сапраўды пачынаюцца дзівосы. Наперадзе — зялёны «востраў», на які вядзе майстэрскі высаджаная алея. Калісьці папрацавалі прафесіяналы — гэта і цяпер відаць нават неспрактыкаваным вокам. Няма ніякай шыльды, якая б пазначала назву паселішча, але мы дакладна ведаем, што патрапілі ў вёску Каралінова. Тут калісьці быў фальварак Храптовічаў. А што цяпер засталося ад спадчыны вядомых магнатаў?

Пётр Трыпуцька з трохгадовым унукам Дзімам — сапраўдныя пчаляры.

Шпаркае месца

Цяпер вёсачка Каралінова адносіцца да Багданаўскага сельсавета, а калісьці «падпарадкоўвалася» Вішневу. У гэтым мястэчку ўжо з 1600 года абуладкаваўся вядомы графскі род Літавораў-Храптовічаў. Замест драўлянага тут быў пабудаваны велічны каменны касцёл. Праз колькі часу паселішча становіцца цэнтрам касцёльнага дэканата, у склад якога ўваходзілі 12 суседніх парафій. Час перамен настае падчас гаспадарання Іахіма Храптовіча — вядомага грамадскага дзеяча, філосафа і паэта, ініцыятара стварэння так званай Адукацыйнай камісіі.

Сядзібны дом актыўна аднаўляецца.

Месца аказалася багатае — знайшлі жалезную руду. Таму арганізавалі ліцейны завод, дарэчы, першае такое прадпрыемства на тэрыторыі тагачаснага Вялікага Княства Літоўскага. Пачаў працаваць і завод шкляных вырабаў з вялікай печчу, а таксама цагельня, ткацкая вытворчасць, спіртзавод і абсталяваны самымі сучаснымі тады механізмамі вадзяны млын. З цягам часу Вішнева ператварылася ў гандлёвы цэнтр — кожную сераду з мноства навакольных мястэчак сюды з'язджаліся гандляры, а двойчы на год арганізоўвалі вялікія кірмашы. У 1775 годзе тут пачала дзейнічаць школа, якая працуе і дасюль.

— У Храптовічаў было 6 фальваркаў, кожны з якіх абслугоўваў канкрэтную тэрыторыю, — заўважае краязнаўнік фонду «Краіна замкаў» Аляксандр Варыкіш. — У іх стварэнні існавала аб'ектыўная неабходнасць, паколькі магнаты мелі ва ўласнасці значныя зямельныя плошчы. Каб зарабляць грошы, вялікай гаспадаркай трэба было эфектыўна кіраваць. У фальварку кіраваў эканом, якога ставілі на заробак альбо на працэнт. Нярэдка двор здымалі шляхціцы, якія плацілі ўладарам чынш.

Як, дарэчы, атрымалася з Каралінова. Храптовічы прадалі фальварак разам з пэўным кавалкам зямлі Сіняўскім. Калісьці Каралінова было даволі шпаркім месцам. У свой час у тутэйшых мясцінах сяліліся асаднікі — вайскоўцы за пэўныя заслугі атрымлівалі зямельныя ўчасткі. Была і свая капліца. Непадалёк праходзіў вялікі тракт, які месцічы дасюль паміж сабой называюць «белай дарогай». Гэты шлях злучаў Вішнева з Крэвам і Барунамі. Па дарозе дзень і ноч тралявалі конныя экіпажы. Зразумела, пэўная іх колькасць спынялася на адпачынак і ў Каралінове. Так што вёска «пры дарозе» мела добрую перспектыву, паколькі развівалася за кошт сваіх, кажучы па-сучаснаму, транзітных магчымасцяў. Цікава, чаму Храптовічы вырашылі адмовіцца ад такога прывабнага фальварка? Безумоўна, у магнатаў былі на тое свае прычыны, пра якія цяпер ніхто, напэўна, дакладна не ўзгадае.

«Ход канём» Мар'яна Сіняўскага

Калі Сіняўскія з'явіліся ў Каралінове, то амаль адразу пачалі будавацца. Дзесьці напрыканцы XIX — пачатку XX стагоддзяў узводзіцца сядзібны дом. Гэта класічная пабудова: узровень на два канцы, а ўперадзе — франтон з калонамі. Тыповы шляхецкі двор, амаль такі, як узгадваецца ў Міцкевіча ў «Пане Тадэвушы». Непадалёк можна заўважыць руіны канюшні, каля будынка стары сад, а таксама паркавы комплекс, абуладкаваны па ўсіх правілах. Здаецца, у такім інтэр'еры і дыхаецца зусім неяк па-іншаму, даўніна ўспрымаецца бліжэй.

Магчыма, дом паноў Сіняўскіх быў зроблены з двух пабудоў — такое меркаванне выказваюць цяперашнія майстры.

— Будавалі файна, сцены даволі нядрэнна захаваліся. Адразу бачна — старадрэвіна, — кажа Аляксандр Варыкіш. — Першы раз, калі гэты дом убачыў, то яшчэ была і мансарда. Столь працякала, адзін ураган выгніў. Мясцовая гаспадарка вырашыла дом раскідаць, але пасля пагадзілася яго прадаць. Літаральна ў апошні момант удалося выратаваць фальварак.

Апошнім гаспадаром Каралінова быў Мар'ян Сіняўскі. Ён прыязджаў сюды ўлетку разам з сястрой Зосяй з Вільні, дзе ў пана была камяніца. Гаспадарку Сіняўскі не надта тут развіў, аднак свае камерцыйныя здольнасці аднойчы прадэманстраваў вельмі яскрава. Той выпадак надоўга застаўся ў памяці тутэйшых жыхароў. У 1939 годзе Мар'ян нечакана для ўсіх пачаў прадаваць месцічам зямлю. Кошт вызначыў немаленькі, аднак людзі былі рады прыдбаць сабе ва ўласнасць участкі. Пра падзеі з зямлёй узгадвае 66-гадовы Пётр Трыпуцька, які нарадзіўся і вырас у Каралінове.

— Мае бацькі, а таксама дзед з бабуляй арандавалі ў Сіняўскіх зямлю. Тут сеялі лён, — узгадвае Пётр Аляксандравіч. — У 1939 годзе мой бацька набыў сем гектараў зямлі і заплаціў за гэта 500 злотых. Даволі вялікія грошы: тады карова каштавала 30 злотых, а парабкам (тым жа жнеям) плацілі па 2 злотыя (дарэчы, за гэта можна было пуд хлеба купіць). Пан сабраў у людзей грошы, раздаў зямлю і знік у невядомым напрамку. У 1947—48 гадах, калі пачалі арганізоўвацца калгасы, мы свой участак аддалі. Але дасюль захоўваю тыя дакументы — маці ўсе паперы беражліва захоўвала, а пасля мне перадала.

Наконт «зямельных» грошай давялося пачуць і зусім нечаканую версію: маўляў, можа той немалы капітал недзе тут дасюль і захоўваецца. А што, можа, паданні пра скарбы ў Каралінове не такія ўжо і беспадстаўныя? Хутчэй за ўсё, гэта прыдумкі, але ў іх так хочацца верыць...

Абапал чыгункі

Пётр Трыпуцька нарадзіўся ў 1943-м, так што добра памятае пасляваенны час. «Нярэдка бывала, што есці няма чаго, але неяк весела жылі і дружна. Дзятва ў хованкі гуляла, на сажалках рыбу вудзілі», — з усмешкай кажа ён. Як узгадвае Пётр Аляксандравіч, пасля вайны ў Каралінове было не менш чым 100 жыхароў. Таму ў вёсцы школу-сямігодку адчынілі, куды збіралася дзятва і з навакольных паселішчаў. Навучальную ўстанову зрабілі самі ведаеце дзе. Правільна — у панскім доме.

— Гэта лёс многіх сядзібных дамоў і маёнткаў, а таксама старажытных гаспадарчых пабудоў, — адзначае Аляксандр Варыкіш. — У гэтых будынках арганізоўвалі школы, бальніцы і лабараторыі. Такім чынам захоўвалася спадчына. А калі сацыяльная інфраструктура пачала згортвацца, то гістарычныя аб'екты ў шэрагу выпадкаў заставаліся безгаспадарныя і пакрысе прыходзілі ў заняпад, разбураліся.

Школу ў Каралінове зачынілі дзесьці напрыканцы 1990-х гадоў. Прычына вядомая — значна паменшала дзятвы, таму школьнікаў пачалі адвозіць на вучобу ў іншае, больш вялікае і перспектыўнае паселішча. Панскі дом зачынілі, а працяг гісторыі вы ўжо ведаеце. Добра, што заканчэнне ў яе не атрымалася такое ж сумнае. Цяпер сядзібны дом аднаўляецца, зроблена пакуль не шмат, але гэта толькі пачатак. Як заўважае Аляксандр Варыкіш, ужо праз год-другі ўсе ахвотныя змогуць паглядзець на самы сапраўдны шляхецкі дом, утульна пасядзець за кубачкам духмянай гарбаты, прайсціся па рамантычных алеях.

Магчыма, гэта сапраўдны шанц для невялічкай вёсачкі, на якую шмат дзе проста махнулі рукой і запісалі ў разрад неперспектыўных. Сапраўды, тутэйшая статыстыка не надта аптымістычная: сем хат, сем жыхароў. Пётр Трыпуцька — адзін з найбольш моцных тутэйшых гаспадароў. Разам з жонкай яны трымаюць свіней, трусоў, авечак, курэй. Дагэтуль была і карова, але ад яе прыйшлося адмовіцца, паколькі жывёліна была нейкая няўдалая. Пётр Аляксандравіч — заўзяты пчаляр. Каля дома ў яго каля дзясятка вулляў, так што і мёд свой заўжды мае.

— Мала людзей у Каралінове засталося, зусім мала, — уздыхае Трыпуцька. — На гэты бок чыгункі мы жывём і яшчэ адна сям'я. А на другі бок — яшчэ некалькі аднавяскоўцаў. Учора прыехала настаўніца, будзе ўлетку тут жыць. Вось і ўсе тутэйшыя.

Пётр Аляксандравіч таксама пасля школы перабраўся ў горад — працаваў на аўтабазе ў Маладзечне. А як выйшаў на пенсію, то вярнуўся на бацькоўскую сядзібу. Жыць у Каралінове прывольна, толькі шкада, што аўтакрама сюды ніколі не збочвае. Даводзіцца ездзіць па тавары ў Войштавічы ці Багданава альбо падпільноўваць «краму на колах» у Рагалёўшчыне. Самаму маладому жыхару Каралінова 59 гадоў.

Так што магчымасць у перспектыве ўключэння вёскі ў адзін з турыстычных маршрутаў усе месцічы ўспрымаюць з вялікімі спадзяваннямі. І як могуць дапамагаюць аднаўляць панскі дом. Многія памятаюць, якім быў будынак раней. Бадай што адзін са скарбаў, які, на шчасце, дасюль тут захаваўся — працавітыя, добрасумленныя людзі...

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
Фота аўтара.

Валожынскі раён.

На «зялёны востраў» фальварка вядзе рамантычная алея.

ЧЭРВЕНЬскі рэйд:

ПАРУШАЛЬНІКІ — СЦЕРАЖЫЦЕСЯ!

Перасовачны пост ДАІ, у якім побач з двума інспектарамі быў і журналіст «Звязды» — гэта зялёны аўтобус з вялікім надпісам «Акцыя: захавай сваё жыццё!». З Мінска мы выязджалі ў шэсць вечара, таму, калі пагадзіцца з думкай, што вечар і ноч — «зорны час» для парушальнікаў, наш рэйд абяцаў быць плённым.

Месцам дыслакацыі стаў горад Чэрвень. Паводле слоў Алега Цюрына, літаральна ў мінулыя суткі ў Чэрвеньскім раёне адбыўся наезд на дзевятнаццацігадовага веласіпедыста, які п'яны ляжаў на дарозе.

— Як паказвае практыка, — кажа **начальнік аддзела агітацыі і прапаганды УДАІ УУС Мінаблвыканкама Алег ЦЮРЫН**, — часцей за ўсё пад колы аўтамабіляў людзі трапляюць у малых населеных пунктах (звычайна гэта вёскі), там, дзе слабае асвятленне, большая ж частка ДТЗ адбываецца ўвогуле за межамі населеных пунктаў.

— Адна з найбольш небяспечных вуліц у нас, — уводзіць у курс спраў дзяжурны інспектар Чэрвеньскага ДАІ Андрэй Стрэльскі, — гэта вуліца Мікалая Зяневіча, вось туды мы зараз і паедзем.

Першым «кліентам» нашага аўтобуса стаў 51-гадовы мужчына, супрацоўнік мясцовага дрэваапрацоўчага камбіната, які пасля добрай дозы піўка вырашыў адведаць жонку, што працуе на хлебазаводзе.

«Ведаю я, што парушаў, — прызнае сваю віну затрыманы. — Але ж тут зусім недалёка — два крокі...» Трапіўся мужчына на пераходзе дарогі ў недазволеным месцы. «Зебра» была намалявана ад яго крокаў за 50.

З пешаходным пераходам тут свая гісторыя: ён як бы і ёсць, але адначасова яго як бы і няма — вельмі ж слаба ён бачны, больш за тое — амаль што незаўважны. Відаць, сусветны фінансавы крызіс дайшоў і да мясцовай дарожна-камунальнай службы, у кампетэнцыі якой знаходзіцца разметка дарогі.

Другім парушальнікам, які «ўважыў нас сваёй прысутнасцю», стаў малады хлопец, што кіраваў аўтамабілем без правоў. На яго, гэтаксама як і на яго папярэдніка-пешахода, быў складзены адміністрацыйны пратакол, аўтамабіль дастаўлены на штраф-пляцоўку.

— Увогуле, для высвятлення ўсіх акалічнасцяў мы маем права трымаць парушальніка ў аўтобусе да 3 гадзін, — кажа дзяжурны інспектар Андрэй Стрэльскі. — Спачатку высвятляюцца пашпартныя звесткі затрыманага, затым на яго складаецца адміністрацыйны пратакол, у якім у дачыненні да парушальніка выносіцца пастанова.

Мера пакарання ў дачыненні да пешаходаў — ад простага папярэджання да адміністрацыйнага штрафу (0,5 базавай адзінкі). З п'янымі кіроўцамі транспарту ўсё куды больш сур'ёзна. Калі вы сядзеце за руль нецвярозым, то рызыкуеце пазбавіцца правоў аж на тры гады, а таксама заплаціце штраф — амаль Br 1,3 млн. У выпадку паўторнага затрымання — пагроза крымінальнай справы.

сМІЛАвіцкія назіранні

Г.п. Смілавічы сустрэў аўтобус ДАІ шчырай зацікаўленасцю з боку пешаходаў. Бачны — аўтобус які стракаты. Сам гарадскі пасёлак па некаторых параметрах здаўся мне вельмі падобным да сталіцы: прынамсі, цэны на шакалад у крамах ні ў чым не саступаюць мінскім. Толькі вось ў Смілавічах куды больш спакойна, чым у Мінску; вуліцы не такія шматлюдныя, ды і будынкі не такія высокія. Асабліва мне спадабаліся аб'явы на дарожным слупе: «У суботу будуць прадавацца куры-нясушкі, чырвоныя і белыя». А знізу прыпіска: «Купляем натуральныя валасы»...

Навучэнка смілавіцкага сельскагаспадарчага ліцэя Насця разам са сваім хлопцам Уладам трымала шлях да інтэрната. Хацелася паспець да яго закрыцця — перабеглі дарогу ў небяспечным месцы. Былі спыненыя інспектарам. Вядома, што ўсю небяспечнасць сітуацыі маладая пара ўсведамляла, але, як кажуць «мы толькі адзін раз, мы больш не будзем».

Ужо напрыканцы нашага рэйду да нас падышлі смілавіцкія хлопец з дзяўчынай: «Дзядзечкі, га дзядзечкі, а колькі трэба вучыцца, каб на матацыкл здаць?»

Інспектар ДПС Леанід СВІРЫДОВІЧ расказаў пра тэрміны і патрабаванні, адразу папярэдзіўшы, што за абкатку жалезнага каня без правоў маладых людзей чакае штраф да 20 базавых адзінак... Калі ж іх затрымаюць паўторна на працягу года — да Br 1,75 млн.

Ужо выязджаючы са Смілавічаў, мы заўважылі яшчэ аднаго парушальніка — матацыкліста, які ехаў па праезнай частцы без спецыяльнага шлема...

* * *

Вынікі наступныя: усяго за час рэйду было выяўлена каля 10 парушэнняў Правілаў дарожнага руху (выпадкі з кіроўцамі без правоў, нецвярозымі кіроўцамі, нецвярозымі пешаходамі, адсутнасць тэхагляду, ігнараванне рамянёў бяспекі).

— Алег Мікалаевіч, — пытаюся я ў інспектара Цюрына, — што, на вашу думку, павінна змяніцца ў свядомасці удзельнікаў дарожнага руху, каб яны ў рэшце рэшт зразумелі ўсю небяспеку сваіх парушэнняў?

— У адзін момант нічога не зменіцца. У нашых замежных суседзяў падобная праца вядзецца ўжо дзясяткі гадоў, нават прамысловасць прыстасавалася да гэтага (адзежа выпускаецца адразу са святлоадбівальнікамі). І пытанне аб захаванні жыцця і здароўя ў іх займаецца не толькі дарожная міліцыя, але і ўсё грамадства. Яшчэ пачынаючы са школ і дзіцячых садкоў, гэта пытанне курыруе міністэрства адукацыі. Пазней — ужо міністэрства здароўя. А міліцыя — толькі кантрольны орган. Мы ж толькі пачынаем, у нас гэта праца найбольш актыўна была распачата толькі гадоў пяць таму. Сёння ініцыятарам выступае найперш міністэрства ўнутраных спраў. А ўжо пасля да працы прычыняюцца астатнія зацікаўленыя міністэрствы: адукацыі, спорту і турызму, аховы здароўя. І наша сумесная праца даволі плённая. А сённяшні рэйд павінен стаць урокам для ўдзельнікаў дарожнага руху, бо любую бяду заўсёды лепш папярэдзіць...

Ілья ЛАПАТО, фота аўтара.

Згодна з афіцыйнымі звесткамі, за 5 месяцаў 2009 года ў ДТЗ па рэспубліцы загінула 460 чалавек, амаль чацвёртая частка ўсіх загінулых і пацярпелых — прыходзіцца на Мінскую вобласць.

СПАДЧЫННАЯ ЗЯМЛЯ



Агледзьцеся навокал, вызначце праблемы і абмяркуйце будучыню

Ужо на гэтым этапе міжнародныя арганізацыі гатовыя падтрымаць вёску, сельсавет, горад альбо цэлы раён. У тым ліку грашыма

У Беларусі стартаваў сумесны праект Еўрапейскага саюза і Праграмы развіцця ААН «Падтрымка навакольнага асяроддзя і ўстойлівага развіцця ў Беларусі». Праект разлічаны на два гады, яго бюджэт — 1,7 млн еўра. Нацыянальным выканаўцам яго выступае Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Праект мае тры часткі. Першая накіравана на больш якасную экалагічную абарону нашай краіны ў цэлым і мае назву «Пабудова патэнцыялу ў галіне Стратэгічнай экалагічнай ацэнкі і ў галіне рэалізацыі прыродаахоўных канвенцый у Рэспубліцы Беларусь». Яе мэтай павінна стаць практыка, калі любая дзяржаўная альбо рэгіянальная праграма яшчэ на стадыі праектавання атрымлівае ацэнку і рэкамендацыі эколагаў з пункту погляду далёкіх па часе наступстваў.

Другая частка яшчэ знаходзіцца на стадыі зацвярджэння і называецца «Зялёныя школы ў Беларусі». Размова ідзе пра экалагічную адукацыю дзяцей. «Звязда» плануе больш падрабязна расказаць пра гэту частку пазней, калі яна ўжо будзе канчаткова прынятая, бо яна прадугледжвае магчымасць для школ набыць абсталяванне, напрыклад біноклі і мікраскопы, звазіць дзяцей у навучальныя цэнтры, якія плануецца стварыць у запаведніках. Пачнецца гэты праект восенню.

У вас ёсць ідэі? А ў нас — грошы...

Трэцяя частка праекта актуальная ўжо сёння і можа быць цікавай для любога неабыякавага жыхара нашай краіны — ад пенсіянера і школьніка да старшыні выканкама. Яна прадугледжвае бязвыплатнае фінансаванне шэрагу мясцовых пачынаў у памерах ад 3 да 8 тысяч долараў ЗША. Кіраўнікі праекта заўважаюць, што гэта стане толькі пачаткам. Гэтая частка сумеснага праекта называецца «Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні». Яна была ўхвалена пастановай Савета Міністраў яшчэ ў снежні 2006 года, а зарэгістравана ў Міністэрстве эканомікі ў лістападзе 2008-га (№ 2/08/000381). Каб стаць яе ўдзельнікам, трэба зразумець яе сутнасць.

Праект закліканы навучыць людзей аб'ядноўвацца і дзейнічаць разам дзеля рашэння агульных праблем. Гэтай навукай, між іншым, цудоўна валодалі нашы продкі. Яны талакой будавалі хаты, дарогі, гаці... Традыцыя дагэтуль захавалася ў некаторых вёсках, напрыклад, у Моталі Іванаўскай вобласці некалькі гадоў таму за некалькі месяцаў талакой паставілі дом жанчыне, якая пацярпела ад пажару.

Сёння міжнародныя арганізацыі заахвочваюць людзей па ўсім свеце ў сябе на месцах талакой вырашаць праблемы, якія датычацца ўсіх у гэтай мясцовасці, і разам з тым маюць экалагічную накіраванасць. Напрыклад, асвятленне вуліц за кошт альтэрнатыўных крыніц энергіі, павышэнне якасці пітной вады, пераход да арганічнага землекарыстання, забеспячэнне занятасці насельніцтва, садзейнічанне малому бізнэсу і г. д. Важна, каб рашэнне гэтых праблем несла ў сабе клопат пра будучыню вёскі, сельсавета, раёна, горада альбо рэгіёна. Вобраз жаданай будучыні — мэта ўсіх намаганняў сучаснай талакі.

Трэцяя частка Праекта актуальная ўжо сёння і можа быць цікавай для любога неабыякавага жыхара нашай краіны, ад пенсіянера да старшыні выканкама. Яна прадугледжвае бязвыплатнае фінансаванне шэрагу мясцовых пачынаў у памерах ад 3 да 8 тысяч долараў ЗША.

Разам з уладамі

Па сутнасці, усё гэта не навіна. Пачатак міжнароднага руху, пра які ідзе размова, быў пакладзены яшчэ ў 1987 годзе, калі Міжнародная камісія па навакольным асяроддзі і развіцці ААН выступіла з дакладам «Наша агульная будучыня». Праз пяць гадоў 179 краін, у тым ліку Беларусь, падпісалі дакумент, які мае назву «Парадак дня на XXI стагоддзе». Ва ўступнай частцы яе сказана, што Парадак прысвечаны праблемам сённяшняга дня, а таксама мае на мэце падрыхтаваць свет да вырашэння праблем, з якімі ён сутыкнецца ў наступным стагоддзі.

З таго часу ў Беларусі пачалася работа па выкананні ўзятых на сябе абавязацельстваў. У 1996 годзе была распрацавана першая Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця нашай краіны. Цяпер такая стратэгія распрацоўваецца кожныя пяць гадоў на пятнаццацігадовы перыяд.

Акрамя Нацыянальных існуюць і мясцовыя стратэгіі развіцця, якія ў свеце прызнаныя найбольш эфектыўнымі, бо лічыцца, што ператвараць свет лепш за ўсё праз канкрэтныя дзеянні канкрэтных людзей. Такія стратэгіі, альбо Мясцовыя парадкі-21 таксама вядомыя ў нашай краіне з 1999 года. Першапраходцамі сталі старажытны Тураў і Дзісячы аздараўленчы цэнтр «Надзея» (Вілейскі раён).

Назва «Парадак» звязана са звыклым для нас паняццем парадку дня, які вызначае любы сход, але тут маецца на ўвазе парадак больш доўгатэрміновы — на ўсё XXI стагоддзе. І на «сход» запрашаецца ўсё чалавецтва.

Сёння ў Беларусі каля 50 суполак самых розных памераў, ад таварыства домаўладальнікаў да сталіцы, уключыліся ў працэс распрацоўкі Мясцовых стратэгій развіцця — Мясцовых парадкаў-21. Гэтага мала — лічаць нацыянальныя і міжнародныя эксперты. Нягледзячы на тое, што за апошнія 10-15 гадоў гэты рух стаў вельмі значным у свеце, для большасці жыхароў Беларусі словазлучэнні «ўстойлівае развіццё» і «Мясцовы парадак-21» нічога не кажуць. Сумесны праект Еўрапейскага саюза і Праграмы развіцця ААН закліканы змяніць сітуацыю. Па-першае, праінфармаваць, і па-другое, заахвоціць як мага больш людзей удзельнічаць у сусветным працэсе.

Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця Беларусі да 2020 года, зацверджаная Саветам Міністраў, прадугледжвае, што рэгіянальныя і мясцовыя пачынанні, якія закліканы палепшыць сацыяльна-эканамічную, экалагічную, дэмаграфічную сітуацыі, захаваць помнікі гісторыі і культуры, будуць разглядацца ў якасці першасных кірункаў дзяржаўнай падтрымкі.

Цяпер кіраўнікі і эксперты праекта знаёмяць выканаўчыя ўлады, прыродаахоўныя, грамадскія арганізацыі, фермераў, настаўнікаў, гаспадарчыя агрэгаты, прадпрымальнікаў, кіраўнікоў прадпрыемстваў, краязнаўцаў, энтузіястаў — усіх, каму гэта цікава, з умовамі ўдзелу ў праекце. Адбыліся ўжо чатыры рэгіянальныя семінары: у Мінскай, Віцебскай, Гродзенскай і Брэсцкай абласцях. У найбліжэйшы час падобныя семінары адбудуцца ў іншых рэгіёнах Беларусі.

Адначасова праходзяць сустрэчы з кіраўнікамі адміністрацый усіх узроўняў, ад абласных да сельскіх, якія выказваюць зацікаўленасць у тым, каб праект пачаў працаваць на іх тэрыторыях.

Па выніках семінараў у штаб Сумеснага праекта ЕС і ПРААН *(220114, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 110-504. E-mail: sesd@un.minsk.by. Тэл. 8(17) 267 20 21)* ад усіх ахвотных накіроўваюцца так званыя лісты зацікаўленасці. Іх ужо напісалі тыя суполкі, якія маюць вопыт супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі: Дзісненскі край, Лепельскі і Вілейскі раёны, вёскі Камарова (Мядзельскі раён), Перабродцзе (Міёрскі раён), Ананіцкі і Дукорскі сельскія і Свіслацкі пасялковы саветы Пухавіцкага раёна...

Да восені будзе праведзены конкурс і адабраны 24 пілотныя (пробныя) тэрыторыі. Адабраным гарадам, раёнам і вёскам будзе аказана дапамога ў напісанні мясцовых стратэгій развіцця, а таксама фінансавая і іншая (навучанне, абмен вопытам, экспертыза) дапамога ў рэалізацыі тых альбо іншых пачынаў. Адна з асаблівасцяў лістоў зацікаўленасці — яны павінны быць падпісаны старшынёй выканкама адпаведнага ўзроўню. Бо важны прынцып праекта — супрацоўніцтва грамадства з уладамі.

Дарэчы, у лісце зацікаўленасці прапісана, што са свайго боку ўлады выказваюць гатоўнасць аказаць падтрымку і вылучыць мясцовыя рэсурсы ў якасці свайго ўкладу ў рэалізацыю сумесных праектаў. Маюцца на ўвазе памяшканні для сустрэч і семінараў, сумеснае фінансаванне мерапрыемстваў, іншыя магчымасці, прадугледжаныя мясцовай стратэгіяй развіцця.

Да восені будзе праведзены конкурс і адабраны 21 пілотны (пробны) рэгіён. Гэтым рэгіёнам будзе аказана дапамога ў напісанні мясцовых стратэгій развіцця, а таксама фінансавая і іншая (навучанне, абмен вопытам, экспертыза) дапамога ў рэалізацыі тых альбо іншых пачынаў.

Зялёныя сцежкі

Асобным радком у частцы «Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні» прапісана распрацоўка экалагічна арыентаваных турыстычных маршрутаў — так званых Зялёных сцежак. У англійскай транскрыпцыі — Грынвэйз (Greenways). У Беларусі ўжо ёсць некалькі такіх маршрутаў. «Звязда» пісала пра два найбольш распрацаваныя з іх — «Нёманскі шлях» у Лідскім раёне («Зялёныя сцежкі сям'і Агаркаў», 22.01.09) і «Блакітныя каралі Расон» на Віцебшчыне («Не чуваць там пра англійскі парламент», 09.08.08).

Зялёныя сцежкі — гэта турыстычныя маршруты пешшу альбо на безматорных відах транспарту: конях, платах, байдарках, веласіпедах. Яны пракладаюцца як правіла ўздоўж старажытных гандлёвых шляхоў, рэк, азёрных ланцужкоў, прыродных калідораў і аб'ядноўваюць мясцовыя славутасці рознага кшталту — ад цікавых людзей і бабровых хатак да ўнікальных храмаў і ландшафтаў.

Папулярнасць гэтага віду турызму расце. Сёння абодва названыя беларускія маршруты распісаны ўжо на ўсё лета. Зялёныя сцежкі падтрымліваюцца міжнароднымі арганізацыямі таму, што галоўныя іх прынцыпы супадаюць. Напрыклад, унёсак у абарону прыроднай і культурнай спадчыны, аб'яднанне краін і людзей, дапамога мясцоваму насельніцтву ў асэнсаванні сваёй унікальнасці, паляпшэнне якасці жыцця...

Турыст, які рухаецца па такой сцежцы, даведваецца пра асаблівасці прыроды гэтага рэгіёна, слухае спевы птушак, удыхае водар траў, кантактуе з рознымі людзьмі, купляе мясцовыя вырабы, знаёміцца з народнымі майстрамі, наведвае невялікія музеі, спыняецца ў гатэлях альбо на аграсядзібах... Тым самым ён не толькі ўзбагачаецца духоўна і эмацыянальна, але і падтрымлівае рэгіён, яго традыцыі, рамёствы, гаспадарку.

У рамках Сумеснага праекта ЕС і ПРААН магчыма фінансавая дапамога ў набыцці экалагічнага транспарту для вандроўнікаў па Зялёных сцежках (веласіпедаў, байдарак), ва ўсталяванні ўздоўж шляхоў шчытоў са схемамі, сметнікаў, у абсталяванні прыпынкаў, прычалаў, адным словам, у стварэнні інфраструктуры. А таксама — метадычная, інфармацыйная і экспертная дапамога.

Не толькі турызм

На семінары ў Гродне, ён адбыўся 29 мая, даволі вялікі акцэнт быў зроблены якраз на развіццё турызму. Але памылкова было б думаць, што турызм — асноўная тэма ў праекце.

— Тэме турызму прысвечана толькі частка дзейнасці ў межах праекта, прычым не самая вялікая, — тлумачыць эксперт кандыдат эканамічных навук Алег Сівагракаў. — Развіццю аграэкатурызму, Зялёных сцежак надаецца важнае значэнне, аднак няправільна было б ператвараць Беларусь у вузкаспецыялізаваную турыстычную краіну. Мясцовыя стратэгіі ўстойлівага развіцця, якія мы заклікаем распрацоўваць на тэрыторыях раёнаў, гарадоў, сельсаветаў, пасёлкаў альбо вёсак, маюць на ўвазе комплекснае развіццё ў тым ліку і прамысловасці, сельскай гаспадаркі і сацыяльнай сферы.

Мясцовыя стратэгіі развіцця — гэта працэс руху да паляпшэння сітуацыі на нейкай тэрыторыі. Пачынаць трэба са сходу і абмеркавання праблем, шляхоў іх вырашэння і перспектыў. Калі ўдасца зрабіць хоць бы гэта, і па выніках такога сходу запоўніць форму ліста зацікаўленасці, то ўжо ёсць шанц узяць удзел у конкурсе пілотных тэрыторый, а значыць і атрымаць дапамогу ў ажыццяўленні задум.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.
Мінск—Ліда—Гродна.

ВОСЬ ГЭТА БЫЎ ВЫБУХ

За чатыры кіламетры ад вёскі Нікольск Гомельскага раёна быў знойдзены, можна сказаць, цэлы склад нямецкіх боепрыпасаў часоў Вялікай Айчыннай вайны.

У ліку іх — 58 мінамётных мін калібру 81 і 50 міліметраў, 23 артылерыйскія снарады калібру 105, 75, 50 і 47 міліметраў, 28 гранат і 15 артылерыйскіх узрывальнікаў. Усё пералічанае перададзена супрацоўнікам сапёрна-піратэхнічнай групы вайсковай часці 5525 для наступнага знішчэння.

ЧАМУ НЕ ЗАМКНУЎ ДЗВЕРЫ МАШЫНЫ?

На гэтае пытанне жыхар Рагачова і дагэтуль не можа толкам адказаць. Прыехаўшы ў Жлобін на рынак, ён на некалькі хвілін адлучыўся туды. А калі вярнуўся, выявіў прапажу 49 тысяч расійскіх рублёў і 2053 долараў.

Між іншым вялікія матэрыяльныя страты панеслі і асобныя жыхары некаторых раёнаў Гомельшчыны. Так, нехта падабраў ключ ад замка дома мазыранкі і забраў залатыя і сярэбраныя ўпрыгажэнні, 320 грыўняў і мабільны тэлефон. Праявіла непрадбачлівасць жыхарка вёскі Стракавічы Светлагорскага раёна, якая, сыходзячы з дому, схавала ключ у патаемнае месца. А яго нехта знайшоў і гаспадыня цяпер вельмі шкадуе, што страціла 2 тысячы долараў, 90 еўра і 700 тысяч рублёў. У вёсцы Буйнавічы Лельчыцкага раёна адна сям'я пазбавілася 1 мільёна рублёў. Невядомы падабраў ключы ад дома. Асобы зламыснікаў пакуль не выяўлены.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

КАЛІ ЁСЦЬ ПОПЫТ

Двое жыхароў Баранавічаў з наёмнай кватэры зрабілі прытон.

Сэксуальныя паслугі кліентам на працягу 4 месяцаў аказвалі дзве няпоўнагадовыя вучаніцы 9-га і 10-га класаў.

Вядзецца следства.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Падпіска 2009

...Як кахаць — дык каралеву, Як выпісваць — то «Звязду»!

Да гэтай высновы — і ўжо вельмі даўно — прыйшлі многія жыхары Міншчыны, дзе ў найстарэйшай беларускай газеты больш за 10 тысяч падпісчыкаў...

У іх, а таксама ў тых, хто яшчэ шукае сабе надзейную крыніцу інфармацыі, ёсць цудоўная магчымасць выбіраць не толькі пагартаўшы каталог, але і атрымаўшы кваліфікаваную параду, сустрэўшыся з прадстаўнікамі рэдакцый, прыняўшы ўдзел у прэзентацыях і віктарынах, розыгрышах прызоў — Мінскі філіял РУП «Белпошта» ва ўсіх аддзяленнях сувязі правадзіць дзень падпісчыкаў.

Таму, калі вы яшчэ не падпісаліся на «Звязду» ці іншае выданне, раім зрабіць гэта сёння, бо менавіта сёння на многіх поштах вобласці будуць працаваць не толькі аператары паштовай сувязі, але і журналісты. У тым ліку — «Звязды».

МАЦІ ЗБІЛА ДА СМЕРЦІ ДВУХГАДОВАЕ ДЗІЦЯ?..

У мінулую пятніцу ў вёсцы Навасселле Мінскага раёна ў кватэры непрацуючай жанчыны было знойдзена цела яе двухгадовай дачкі, а ў нядзелю па падазрэнні ў забойстве дзіцяці затрымана маці. Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, нежывую дзяўчынку з сінякамі і гематомамі на целе знайшла сацыяльны педагог школы. 35-гадовую маці, якая знікла, аператыўнікі расшукалі і затрымалі праз два дні ў Мінску. Жанчына падазраецца ў тым, што гэта менавіта яна збіла сваё дзіця.

Ігар ГРЫШЫН.

Сітуацыя

Як пчолы... суседзяў пасварылі

Сям'я віцяблян звярнулася па дапамогу ў суд, каб суседзі выплацілі кампенсацыю за тое, што пчолы, якіх яны разводзяць, іх пакусалі.

Як расказаў карэспандэнту «Звязды» **старшы памочнік пракурора Кастрычніцкага раёна горада Віцебска Андрэй КОЗІКАЎ,** сям'я з Віцебска запатрабавала ад суседзяў за прычыненую маральную шкоду выплаціць 1 мільён рублёў і праспела суд забараніць ім трымаць вулей.

У судзе Антаніна Пятроўна (імя і імя па бацьку зменены — **А.П.**) расказала, што ў доме жыве з мужам і маленькім сынам ужо гадоў 10. І да лета мінулага года ніякіх праблем з суседзямі не было. Тады ў ліпені пчала (па версіі жанчыны яна прыляцела з вулля, што на суседнім участку), укусіла яе 12-гадовага сына. Хлопчыка адвезлі ў бальніцу, дзе і паставілі дакладны дыягназ — алергія на ўкус насякомых. У верасні таго ж года пчолы двойчы пакусалі саму жанчыну, калі яна апрацоўвала свой участак. І ёй урачы паставілі такі ж дыягназ, як і яе сыну. А ў апошні час і шэршні з'явіліся... «Мы ж двухметровую агароджу паставілі, але і гэта ад насякомых нашу сям'ю не абараніла», — гаварыла жанчына ў судзе.

Адказчык віну не прызнаваў. Сказаў у судзе, што з суседзямі адносіны былі няпростыя. Нават участковага выклікаў, бо з суседняга ўчастка дапазна музыка праз дынамікі гучала. Што датычыцца пчол, дык калі паскардзіліся яму суседзі на ўкусы, ён прыняў вулей. А спачатку проста не маглі з суседзямі дамовіцца пра памер кампенсацыі «па-свойску». «Ды і хто дакажа, што пчолы менавіта мае?» — пытаў суддзю мужчына. — «У нас на вуліцы шмат жыхароў трымаюць вуллі. Ды і пчала ж не сабака, каб адразу можна было вызначыць, каму яна належыць...»

Дарэчы, і эксперты, якіх запрасілі ў суд для тлумачэння, канстатавалі — пчолы могуць пераадольваць па 5 кіламетраў, а вызначыць, чые пчолы пакусалі суседку і яе сына, проста немагчыма. Таму ў выплаце кампенсацыі заяўніцы адмовілі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«НЕ АДЛУЧЫЦЬ ШАГАЛА АД ВІЦЕБСКА»

Менавіта так Васіль Быкаў заклікаў Віцебск бераўліва захоўваць памяць пра славутага на ўвесь свет земляка — мастака Марка Шагала. У рамках традыцыйных, ужо 19-х па ліку, Шагалаўскіх дзён (распачнуцца яны 14 чэрвеня) сведкі знаходжання Быкава ў Віцебску падзеляцца ўспамінамі пра пісьменніка, які шчыра ганарыўся тым, што Шагал родам з Беларусі. Будуць паказаны дакументальныя кадры выступленняў пісьменніка па шагалаўскай тэме.

Таксама падчас шагалаўскіх чытанняў адкрыецца выстава твораў маскоўскага мастака Барыса Бамштэйна, які шмат папрацаваў над тэатральнымі эскізамі да пастановак па творах Гогаля. Дэлегацыя з эстонскага горада Нарва плануе падзяліцца напрацоўкамі ў развіцці турызму. Сутнасць у тым, што ў 1920-м Шагал правёў каля двух месяцаў у гэтым горадзе. Цяпер мясцовыя ўлады хочуць па-добраму выкарыстоўваць гэты факт для прыцягнення турыстаў. А ўлічваючы, што Віцебшчына — радзіма Шагала, актывісты з Нарвы пры падтрымцы гарадскіх уладаў хочуць ажыццяўляць сумесныя праекты.

Дарэчы, у Віцебску пройдзе абмеркаванне грамадскасцю праекта па стварэнні турыстычнай «шагалаўскай зоны», які распрацавалі пад кіраўніцтвам вядомага беларускага архітэктара Леаніда Левіна. Нагадаю, у яе ўвойдуць гатэль, сінагога, пункты продажу сувеніраў, кавярні і г.д. У рэкордны тэрмін — усяго за тры месяцы — распрацавалі рабочы праект. Ён зацікавіў інвестараў на віцебскім і мінскім інвестыцыйных форумах. Цяпер стваральнікі праекта разам з іншымі архітэктарамі, музейнымі работнікамі, мастакамі, журналістамі прааналізуюць створанае, адзначаць плюсы і мінусы. У гэтым дапамагае асабіста старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Косінец.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Антыкрызісная эканоміка

ПРАВІНЦЫЙНЫ КАМП'ЮТАРНЫ РЫНАК ПЕРАНАСЫЧАНЫ

Тут актыўна змагаюцца за кожнага пакупніка, а канкурэнцыя, як адзначаюць старажылы і першапраходцы ў гэтай галіне, не заўсёды сумленная. У абласным цэнтры па самых сціплых падліках сёння працуе больш за трыццаць фірмаў у сферы высокіх тэхналогій.

Цікава, а як славуты сусветны фінансавы крызіс паўплываў на правінцыйны рынак па продажы камп'ютараў, іх рамонце? Большасць беларусаў ужо маюць камп'ютары, або ўмеюць імі карыстацца. Гэтае пытанне я задаў найбольш вопытным кіраўнікам гэтага бізнэсу.

— Нашаму прадпрыемству амаль 19 гадоў. З нашым даўнім канкурэнтам усё «высвятляем» — хто ж пачаў раней працаваць у гэтай сферы бізнэсу, — распавядае **генеральны дырэктар прадпрыемства «БелСофт» Сяргей КУІМАЎ.** — Напэўна, і цяпер мала хто ведае: мы самастойна вырабляем камп'ютары ў Віцебску пад нашым уласным брэндам. Першы сертыфікат на вытворчасць атрымалі яшчэ ў 1996 годзе. І за гэты час набылі вялікі вопыт. Безумоўна, маем адпаведны сертыфікат Дзяржаўнага стандарта і акрамя гэтага міжнародны сертыфікат якасці СТБ ISO 9001 — 2001 . Накіроўвалі спецыялістаў на вучобу, плацілі за гэта. А цяпер мы не можам поўнасцю выкарыстоўваць свой патэнцыял. Ідзём на значныя выдаткі, толькі каб утрымаць калектыў кваліфікаваных спецыялістаў. Цяпер шмат фірмаў прадаюць камп'ютары, займаюцца рамонтам. Канкурэнцыя — гэта, безумоўна, вельмі добра, але...

Уявіце сабе — некаторыя, бывае, прама дома збіраюць камп'ютары з камплектавых частак і прадаюць. Шмат фірмаў, якія адкрываюцца, знікаюць. Канкурыраваць з такімі цяжка — цэны ў іх, хай і на нямнога, але меншыя. А непадкаваны спажывец наўрад ці будзе цікавіцца тым, дзе вырабілі камп'ютар, у якіх умовах.

І такое становішча спраў не толькі ў вытворчасці камп'ютараў. Мы, як разнапланавае прадпрыемства, што займаецца і праграмным забеспячэннем, і камп'ютарнымі сеткамі, і кандыцыянаваннем і гэтак далей, сутыкаемся з нядобрасумленнай канкурэнцыяй у розных сферах. Шкада, што спажывец церпіць у першую чаргу.

Сёння, вядома ж, нам жыць складана: вось пусты цэх па зборцы камп'ютараў. Людзей пасля абеду адпусціў дамоў... Змагаемся за кожнага пакупніка, і гэта — рэалія жыцця.

— Нялёгка цяпер працаваць, — распавядае **кіраўнік фірмы «СофтМаркет» Андрэй ЗАЙЦАЎ.** — І быццам бы трэба нам, беларускім вытворцам рознай формы ўласнасці, трымацца разам. А насамрэч, спрабавалі мы заказаць на вельмі вядомым яшчэ ў савецкія гады дзяржаўным прадпрыемствы 25 кандэнсатараў для камп'ютарнай тэхнікі. Ну, не трэба нам шмат, нават 100 — ужо многа. І што ж вы думаеце: сказалі, што зробяць, але на працягу 6 месяцаў! Ды нам працесці паехаць у Маскву і купіць там неабходныя кандэнсатары. Гэта і накont закліку «Купляй беларускае!». А яшчэ, вось — мы для работы выкарыстоўваем спецыяльны мантажны антыстатычны стол. Выраблены ў Расіі, такі каштуе 800—1000 долараў, аналагічны беларускі — каля 5 мільёнаў рублёў, што амаль у два разы даражэй.

І што датычыцца сэрвісу — не на поўную магутнасць працуе абсталяванне, поўнасцю не занятыя людзі. Паўплывала на гэта і тое, што адмянілі ліцэнзаванне паслуг. З аднаго боку — падтрымка прыватнага бізнэсу, а з іншага... Часта прыватныя майстры рамантуюць дарагое абсталяванне і выконваюць розныя заказы людзей прама дома. Адпаведна пра якасць такой дзейнасці можна сказаць многае...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Новыя паслугі

«Актыўная даведка» — на ўсе выпадкі жыцця

Новую паслугу «Актыўная даведка», даступную па кароткім нумары 110, прапануе сваім кліентам РУП «Белтэлекам».

«Актыўная даведка» дазваляе абаненту атрымліваць самую разнастайную інфармацыю: бізнэс-інфармацыю, фінансавую інфармацыю (курсы валют, курсы канверсіі, курсы абмену безнаяўных валют), інфармацыю для аўтамабілістаў (адрасы і тэлефоны аўтацэнтраў, аўтастаянак, АЗС, СТА, крамаў запчастак, кошт паліва), расклад руху транспарту (авіяцыйнага, чыгункі, аўтатранспарту, інфармацыю аб наяўнасці і кошту білетаў), даведкі аб медыцынскіх паслугах, інфармацыю аб наяўнасці ў аптэках лекаў, рэпертуар тэатраў, кінатэатраў, канцэртных залаў, галерэй, выставачных цэнтраў, інфармацыю аб тарыфах на паслугі ЖКГ, спецыяльную інфармацыю (час у розных гарадах свету, тэлефонныя коды краін і гарадоў, кансультацыі па правільным наборы нумару), адрасы і тэлефоны салонаў прыгажосці і цырульняў, кавярняў і рэстаранаў, інфармацыю аб рабоце дзяржаўных устаноў і г.д.

Акрамя таго «Актыўная даведка» гатова дапамагчы з выклікам таксі, пошукам тавараў у крамах горада, даведацца пра вынікі спартыўных спаборніцтваў, праграму тэлебачання, прагнозы надвор'я на папулярных курортах, астралагічны прагноз, падказаць, як дабрацца ў сталіцы да таго ці іншага месца грамадскім транспартам і на ўласным аўтамабілі, праверыць розыгрыш латарэйных білетаў, даць энцыклапедычную даведку і нават дапамагчы з правапісам таго ці іншага слова, перакладам слоў на замежную мову ці наадварот.

З 1 чэрвеня паслуга «Актыўная даведка» даступная ў сетках «Белтэлекама» па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Даведка працуе кругласутачна без выхадных дзён. «Белтэлекам» запрашае абанентаў узяць удзел у яе тэсціраванні ў рэжыме бясплатнага абслугоўвання.

Надзея НІКАЛАЕВА.

НАРАД АХОВЫ ВЫРАТАВАЎ ТАПЕЛЬЦА

У нядзелю ў г. Пінску каля паловы шостай раніцы аператыўны дзяжурны Пінскага гарадскога аддзела ўнутраных спраў па радыёсувязі перадаў у эфір інфармацыю пра тое, што на рацэ Піна насупраць дома 11 па вул. Дняпроўская Флатылія тоне чалавек. Памочнік дзяжурнага інспектара Пінскага аддзела Дэпартамента аховы неадкладна накіраваў да месца здарэння найбліжэйшую групу затрымання. Экіпаж прыбыў на бераг праз 2 хвіліны адначасова з мабільнай групай Пінскага ГАУС. Малады чалавек, які тануў, знаходзіўся на сярэдзіне ракі за 40 метраў ад берага, і было відаць, што сілаў на тое, каб плыць, у яго ўжо няма — ён толькі спрабаваў утрымацца на плаву.

Абодва супрацоўнікі аховы кінуліся ў ваду і пачалі цягнуць хлопца за рукі да берага. У гэты час нарад ГАУС счапіў буксіровачныя тросы двух службовых аўтамабіляў і з іх дапамогай выцягнуў усіх трох чалавек, якія знаходзіліся ў вадзе.

Выратаваным быў 17-гадовы мясцовы жыхар. Ён ледзь дыхаў і, мяркуючы па характэрным паху, быў на добрым падпітку. Брыгада хуткай медыцынскай дапамогі даставіла маладога чалавека ў рэанімацыйнае аддзяленне бальніцы. Цяпер яго жыццю нічога не пагражае. Апрытомнеўшы, хлопец так і не змог патлумачыць, як апынуўся ў вадзе. Яго маці бязмерна ўдзячная міліцыянерам Міхаілу Бальшуну і Алегу Васько і выказала пажаданне падзякаваць ім за выратаванне сына перад строем усяго асабовага складу аддзела аховы. У сваю чаргу кіраўніцтва Дэпартамента аховы прыняло рашэнне хадайнічаць перад урадам Беларусі аб узнагароджанні супрацоўнікаў дзяржаўнымі ўзнагародамі.

Аляксандр ГЕРАСІМАЎ,
старшы інспектар групы інфармацыі і грамадскіх сувязяў Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь, падпалкоўнік міліцыі.

РЫБАКА ЛЕДЗЬ НЕ ЗАЦЯГНУЛА ПАД ДАМБУ

51-гадовы скідальчанін рыбачыў з дамбы на Котры і па неасцярожнасці зваліўся ў вадаспад. Моцны паток уцягнуў нагу мужчыны ў адтуліну дамбы дыяметрам 40 см, а яго штаны зачапіліся за арматуру. Над паверхняй была толькі галава. Выклік на пункт сувязі пажарнай аварыйна-выратавальнай часці № 1 Гродзенскага райаддзела па НС у горадзе Скідаль паступіў у 7 гадзін раніцы. Капітану ўнутранай службы Дзянісу Масько давялося спусціцца ў ваду і надзець на мужчыну пажарны пояс. Толькі так рыбака ўдалося выцягнуць з вады.

Таццяна ВІШНЕЎСКАЯ, БЕЛТА.

Страусы на аўтапаркінгу на шашы Мінск — Віцебск.

Фота Анатоля КІЕЦКІ.

Муз-news

Вольга Плотнікава: спяваем разам з дачкой

Маленькая Аліна Маркевіч — дачка спявачкі Вольгі Плотнікавай і кампазітара Генадзя Маркевіча — можа справядліва называцца «закулісным дзіцем», бо практычна з моманту нараджэння суправаджае бацькоў на розных канцэртах. І вось нарэшце пасіўнае назіранне за выступленнямі любімай мамы набыло іншую форму — актыўнага ўдзелу ў гэтых самых выступленнях. Дэбют юнай спявачкі адбыўся на адным з нядаўніх канцэртаў у Маладзёжным тэатры эстрады.

Маці спачатку, натуральна, перажывала, як малая будзе трымацца на сцэне — тым больш, канцэрт адбываўся днём, калі ў дзяцей звычайна цікі час. «Алінка — дзіця вельмі шчырае і кантактнае, але сцэна можа спалохаць нават дарослага, не тое што дзіця... Але, як высветлілася, перажывала я дарэмна — песню «Заўсёды з табою» мы ўсе разам выканалі на ўра! Думаю, што рана ці позна мы дабяромся і да дзіцячага «Еўрабачання», — жартуе Вольга Плотнікава.

Уладзімір Максімкаў і Іван Пінігін: спрачаемся на «Кіно»!

Нядаўна падчас круглага стала, прысвечанага праблемам альтэрнатыўнага мастацтва ў Беларусі, абмяркоўваючы лёс гэтага самага мастацтва і спосабы яго прасоўвання, не на жарт счапіліся два рэжысёры — рэжысёр і прадзюсар тэлекампаніі «Карамболь» Уладзімір Максімкаў і рэжысёр тэлекампаніі «ОКО» Іван Пінігін.

Заявы з вуснаў удзельнікаў гучалі катэгарычныя, а спрэчка атрымалася творчай. «Вазьму і праўду форум альтэрнатыўнага кіно — без усякай падтрымкі з боку дзяржавы, сам, на свае грошы», — у запале паабяцаў Максімкаў. На гэтых словах і быў злоўлены. Па ўмовах закладу з Іванам Пінігіным, ужо да снежня гэтага года павінен прайсці малабюджэтны форум альтэрнатыўнага кіно. Калі гэтага не атрымаецца, Максімкаву давядзецца выканаць адну з песень гурта «Кіно» (цалкам лагічна) — публічна, у якім-небудзь са шматлюдных паркаў сталіцы. Калі ідэя будзе рэалізаваная, публіка зможа ацаніць вакал Пінігіна, а можа, натхнёныя рэжысёры выдадуць што-небудзь хорам, хто ведае? Усё ж дзеля мастацтва.

Віталь Гардзей: дзяўчат прапускаем наперад

Днямі Віталь прывёз трэцюю прэмію з Міжнароднага песеннага конкурсу «Вецер надзеі», што адбываўся ў Пскове. Дакладней, па выніках творчага спаборніцтва артыст набраў роўную колькасць балаў з беларускай спявачкай Катрын, і пакуль журы вагалася, каму ж прысудзіць другую прэмію, па-джэнтльменску саступіў дзяўчыне вышэйшае месца.

Выступленне беларусаў на заключным гала-канцэрце, дарэчы, высока адзначыла не толькі журы на чале з прадзюсарам Дзмітрыем Мосам, але таксама Ала Пугачова, якая ўваходзіць у апякунскую раду конкурсу. Менавіта з рук прымадонны спявачка Катрын атрымала паштоўку з тэлефонам музычнага рэдактара радыё «Ала» і абяцанне быць узятай у ратацыю. Віталь жа засмуціўся толькі з той прычыны, што вельмі хацеў узяць у Алы Барысаўны аўтограф, але так і не атрымалася.

Прыезд Пугачовай у Пскоў на цырымонію ўзнагароджання стаў прыемным шокам не толькі для канкурсантаў, але і для арганізатараў — відаць, таму апошнія забыліся адзначыць прызёраў усімі абяцанымі раней бонусамі. Напрыклад, паводле палажэння конкурсу Катрын і Віталь Гардзей будуць удзельнічаць у конкурсе «Ала шукае таленты», а таксама маюць магчымасць падаць заяву на адзін з тэлевізійных конкурсаў у Расіі. Тым не менш дыпломы і грашовыя прэміі пераможцы ўсё ж атрымалі.

Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. Правды, 38, контактный телефон-факс в Витебске: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, E-mail:votfondgi@tut.by.

1. Аукцион состоится 15 июля 2009 г. в 15.00 в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38.

Для участия в аукционе приглашаются негосударственные юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество». Не допускается одновременное участие в торгах по одному и тому же предмету аукциона следующих лиц: близких родственников (родителей, детей, усыновителей, усыновленных (удочеренных), родных братьев и сестер, деда, бабки, внуков), а также супругов и их близких родственников; юридических лиц, в уставном фонде которых одно и то же юридическое или физическое лицо имеет долю в размере 20 и более процентов; юридических лиц, одно из которых в соответствии с законодательством признается дочерним или зависимым по отношению к другому.

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, а также представляются: юридическими лицами Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица, копия документа, подтверждающего государственную регистрацию, **без нотариального засвидетельствования**; индивидуальными предпринимателями – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, **без нотариального засвидетельствования**; иностранными юридическими лицами – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык; представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

2. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, **последний день приема документов 14.07.2009 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 15.07.2009 с 14.00 до 14.45.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

3. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

4. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; **не позднее 10 дней** со дня принятия Витебским облисполкомом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка; **не позднее 12 дней** со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить с Учреждением «База хранилище государственного страхового фонда документации Республики Беларусь» договор купли-продажи недвижимости, а с Оршанским райисполкомом – договор аренды земельного участка.

5. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

6. Подробная информация об условиях участия в торгах и условиях продажи предметов аукциона опубликована ранее в газете «Рэспубліка» от 27.05.2008 № 95 (4518).

г. ВИТЕБСК **15.07.2009**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С УСТАНОВЛЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ КАЖДОГО ОБЪЕКТА РАВНОЙ ОДНОЙ БАЗОВОЙ ВЕЛИЧИНЕ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи, рублей	Сумма задатка, рублей
Месторасположение объектов: д. Зубревичи Оршанского района Витебской области				
1.	Сооружение № 1 и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: одноэтажное, полуподземное, бетонное, кровля совмещенная, обвалованное землей, состояние неудовлетворительное, общей площадью 1010 кв. м. Земельный участок площадью 0,8278 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000168, срок аренды земельного участка – 25 лет	239313	23931
2.	Сооружение (здание) № 2 и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: одноэтажное, кирпичное, перекрытие ж/б, кровля совмещенная, с рулонным покрытием, состояние аварийное, общей площадью 1044,71 кв. м. Земельный участок площадью 0,5989 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000172, срок аренды земельного участка – 25 лет	182759	18275
3.	Сооружение № 3 и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: одноэтажное, полуподземное бетонное, кровля совмещенная, обвалованное землей, состояние неудовлетворительное, общей площадью 1506,07 кв. м. Земельный участок площадью 0,7337 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000169, срок аренды земельного участка – 25 лет	215892	21589
4.	Здание казармы и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: одноэтажное, кирпичное, перекрытие деревянное, крыша совмещенная, шиферная, 2-скатная, состояние аварийное, общей площадью 420 кв. м. Земельный участок площадью 0,2600 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000170, срок аренды земельного участка – 25 лет	99210	9921
5.	Здание казармы-столовой и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание 2-этажное, кирпичное, перекрытие ж/б, кровля совмещенная, покрытие рулонное, состояние неудовлетворительное, общей площадью 666 кв. м. Земельный участок площадью 0,1521 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000176, срок аренды земельного участка – 25 лет	72693	7269
6.	Здание спортзала и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание одноэтажное, кирпичное и г/с блоки, перекрытие деревянное, кровля шиферная, 2-скатная, состояние аварийное, общей площадью 270 кв. м. Земельный участок площадью 0,1958 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000175, срок аренды земельного участка – 25 лет	83418	8341
7.	Здание гаража-лаборатории и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание одноэтажное, кирпичное, перекрытие ж/б, покрытие рулонное, кровля совмещенная, состояние неудовлетворительное, общей площадью 297 кв. м. Земельный участок площадью 0,1156 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000163, срок аренды земельного участка – 25 лет	63544	6354
8.	Здание гаража и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание одноэтажное, кирпичное, перекрытие деревянное, кровля деревянная, обрушена, состояние аварийное, общей площадью 676,18 кв. м. Земельный участок площадью 0,1157 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000174, срок аренды земельного участка – 25 лет	63544	6354
9.	Здание котельной и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание 4-этажное, кирпичное, перекрытие ж/б, кровля совмещенная, покрытие рулонное, состояние аварийное, общей площадью 228 кв. м. Земельный участок площадью 0,1680 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000165, срок аренды земельного участка – 25 лет	76268	7626
10.	Здание овощехранилища и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание одноэтажное, кирпичное, перекрытие ж/б, кровля совмещенная, с рулонным покрытием, состояние неудовлетворительное, общей площадью 147 кв. м. Земельный участок площадью 0,2342 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000173, срок аренды земельного участка – 25 лет	92567	9256
11.	Здание-гараж 1 и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание одноэтажное, кирпичное, перекрытие ж/б, кровля совмещенная, покрытие рулонное, состояние неудовлетворительное, общей площадью 504 кв. м. Земельный участок площадью 0,2451 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000171, срок аренды земельного участка – 25 лет	95635	9563
12.	Здание-гараж 2 и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание одноэтажное, кирпичное, перекрытие ж/б, кровля совмещенная, покрытие рулонное, состояние неудовлетворительное, общей площадью 518 кв. м. Земельный участок площадью 0,2128 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000164, срок аренды земельного участка – 25 лет	87472	8747
13.	Здание дизельной и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание одноэтажное, кирпичное, перекрытие ж/б, кровля совмещенная, покрытие рулонное, состояние аварийное, общей площадью 158,49 кв. м. Земельный участок площадью 0,1517 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000166, срок аренды земельного участка – 25 лет	72186	7218
14.	Здание боксов под автотехнику и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание одноэтажное, кирпичное, ж/б перекрытие, кровля совмещенная, рулонное покрытие, состояние неудовлетворительное, общей площадью 318 кв. м. Земельный участок площадью 0,2648 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000167, срок аренды земельного участка – 25 лет	100224	10022
15.	Здание овощехранилища и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: одноэтажное, кирпичное заглубленное, обвалованное, перекрытие ж/б, полы бетонные, состояние аварийное, общей площадью 27,4 кв. м. Земельный участок площадью 0,0433 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000162, срок аренды земельного участка – 25 лет	45697	4569

Іван БАМБІЗА:

Кампетэнтна

НІЯКАЙ «ГАНДЛЁВАЙ ВАЙНЫ» — НІ МАЛОЧНАЙ, НІ МЯСНОЙ — ПАМІЖ БЕЛАРУССЮ І РАСІЯЙ НЯМА

ФотаПятраФАМІНА.

Аб гэтым заявіў 6 чэрвеня журналістам у Мінску віцэ-прэм'ер Беларусі Іван Бамбіза, каментуючы інфармацыю, што з'явілася ў СМІ, аб забароне ўвозу ў Расію 500 відаў малочнай прадукцыі з Беларусі. Адзначым, што размова ідзе не аб відах прадукцыі ў цэлым, а аб канкрэтных назвах прадукцыі канкрэтных беларускіх заводаў.

«Няма ніякай «гандлёвай вайны» — ні малочнай, ні мясной, ёсць штодзённая работа па прывядзенні дазвольных дакументаў у адпаведнасць з рэгламентамі Расійскай Федэрацыі», — сказаў Іван Бамбіза.

Ён растлумачыў, што расійскім заканадаўствам уведзены рэгламент на пастаўку малочнай прадукцыі, які прадугледжвае новыя правілы вырабу прадукцыі і пастаўкі яе ў гандлёвую сетку, у тым ліку ёсць раздзяленне на натуральную і адноўленую прадукцыю. «У сувязі з тым, што 12 снежня быў уведзены гэты рэгламент, неабходна было прывесці свае дакументы ў адпаведнасць з ім, каб пастаўляць прадукцыю ў Расію», — адзначыў віцэ-прэм'ер.

Да гэтага дзейнічалі дазвольныя дакументы, санітарна-эпідэміялагічныя пасведчанні на канкрэтныя віды прадукцыі, якую беларускія прадпрыемствы пастаўлялі ў Расію. Усяго было выдадзена каля 1500 такіх дазволаў. «І цяпер мы павінны былі іх перааформіць, проста зарэгістраваць у Расійскай Федэрацыі пасведчанні, выдадзеныя нашымі службамі», — растлумачыў віцэ-прэм'ер. Для гэтага быў выдзелены пэўны адрэзак часу, усе беларускія прадпрыемствы ўключыліся ў работу, і па ўсіх відах прадукцыі, якая пастаўляецца і плануецца для паставак у Расію ў 2009 годзе, аформілі дакументы і атрымалі пацверджаныя ў Расспажыўнаглядзе. Былі выдадзены санітарныя пасведчанні на права пастаўкі амаль на ўсю прадукцыю, якая экспартуецца ў Расію.

Разам з тым, па пэўных таварах такія дазволы атрыманы не былі. Гэта тлумачыцца тым, што шэраг прадпрыемстваў прынялі рашэнне больш не вырабляць пэўныя віды прадукцыі або не плануюць іх пастаўкі ў Расію, альбо на асобных з іх вядзецца мадэрнізацыя, альбо вытворчасць прыпынена зусім. Таму асобныя кампаніі не прадаставілі адпаведныя дакументы.

«Фактычна тое рашэнне, якое было прынята Расспажыўнаглядам, прынята па тых дазволах, якія былі выдадзены раней і тэрмін дзеяння якіх ужо скончыўся. Гэта сапраўды дакументы, якія прызнаны несапраўднымі. Але на гэтых прадпрыемствах ёсць дакументы, якія дазваляюць пастаўкі іншых відаў прадукцыі», — сказаў Іван Бамбіза.

«Такім чынам, забароны як такой няма. Размова ідзе аб прызнанні несапраўднымі раней выдадзеных дакументаў», — падкрэсліў ён.

У сувязі з гэтым віцэ-прэм'ер Беларусі рэкамендаваў асобным расійскім палітолагам, якія ўключыліся ў каментарыі па гэтым пытанні, не абвастраць сітуацыю. Ён дадаў, што ёсць звычайная руцінная работа паміж адпаведнымі службамі і суб'ектамі гаспадарання па афармленні дакументаў па ўстаноўленым у Расійскай Федэрацыі парадку.

У той жа час Іван Бамбіза канстатаваў, што яшчэ не ўсе беларускія прадпрыемствы атрымалі дазвольныя дакументы, яны падрыхтавалі зварот, накіравалі яго ў Расспажыўнагляд. Гэта значыць тыя прадпрыемствы, якія сапраўды прамаргалі тэрміны. «Мы разбяромся ў гэтай сітуацыі», — запэўніў віцэ-прэм'ер, выказаўшы думку, што, магчыма, гэтыя арганізацыі вырашылі пастаўляць у Расію іншы асартымент прадукцыі або палічылі, што пастаўкі не з'яўляюцца актуальнымі. Магчыма, яны зрабілі выбар на карысць больш «даходнага» асартыменту. Аднак, на думку Івана Бамбізы, прадпрыемствам разумна было б атрымаць адпаведныя дазвольныя дакументы на ўсе віды прадукцыі, таму што з часам цэны на знешніх рынках могуць змяніцца.

Паводле слоў намесніка міністра аховы здароўя — галоўнага дзяржаўнага санітарнага ўрача Беларусі Валянціны Качан, аналагічныя дазвольныя дакументы не атрыманы і па 20 працэнтах прадукцыі, што вырабляецца ў Расійскай Федэрацыі, 40 працэнтах прадукцыі з краін Балтыі. Таму гаварыць толькі аб беларускіх прадпрыемствах у сувязі з гэтым некарэктна.

«Тая беларуская прадукцыя, якая пастаўляецца ў Расію, практычна ўся прайшла перарэгістрацыю. А названыя 500 відаў прадукцыі — гэта «мёртвая» прадукцыя, якая практычна не экспартуецца ў Расію», — падкрэсліла Валянціна Качан.

БЕЛТА.

Неабходна аднавіць 600 тыс. гектараў меліяраваных палеткаў

Як паведаміў дырэктар Дэпартамента па меліярацыі і воднай гаспадарцы Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Анатоль БУЛЫНЯ, у Беларусі меліярацыйныя работы былі праведзены на 3,4 мільёна гектараў. На большай частцы гэтых участкаў (2,9 млн га) землі выкарыстоўваюцца гаспадаркамі. Дарэчы, меліяраваныя землі складаюць амаль трэцюю частку ўсіх сельскагаспадарчых палеткаў, на іх вырошчваецца каля 30 працэнтаў раслінаводчай прадукцыі. Асноўнае ж іх прызначэнне — вытворчасць кармоў.

Не сакрэт, што ў савецкія часы меліярацыя была накіравана толькі на максімальнае выкарыстанне новых плошчаў. Пра далейшы лёс гэтых земляў практычна не ўзгадвалася. Такая практыка, адзначыў Анатоль Булыня, у асобных выпадках прывяла да пэўных перагібаў, якія цяпер імкнуцца выправіць. Сённяшняя стратэгія меліярацыі — максімальнае захаванне інжынерных забудоў, якія былі зроблены дагэтуль. Гэта ўнушальная сетка: у эксплуатацыі знаходзіцца 176 тысяч кіламетраў каналаў (па даўжыні — чатыры экватары!), каля 1 млн км закрытых дрэнажных сістэм.

Неабходна аднавіць 600 тысяч гектараў меліяраваных палеткаў. Прычым рабіць гэта трэба неадкладна. У меліярацыю апошнім часам укладаюцца значныя дзяржаўныя сродкі, якія дазваляюць штогод прыводзіць у належны стан каля 20 тыс. га адпаведных участкаў. Аднак і такія тэмпы, заўважыў Анатоль Булыня, відавочна недастатковыя. Тым не менш, на нарматыўны ўзровень утрымання меліяраваных земляў ужо выйшлі больш чым 40 раёнаў.

Яшчэ адна з надзённых праблем — правядзенне работ на тарфяніках. Іх агульная плошча ў Беларусі складае каля 900 тысяч гектараў. Аднаўляць меліярацыйныя сістэмы тут надзвычай складана. У шэрагу выпадкаў паглыбляць каналы проста немагчыма, паколькі гэта можа прывесці да засушэння навакольных тэрыторый, з'яўлення так званых пыльных бураў. Таму выкарыстоўваюцца метады, якія дазваляюць пазбегнуць такіх негатыўных наступстваў. Дарэчы, на ахову тарфянікаў скіраваны закон «Аб меліярацыі», які пачне дзейнічаць у жніўні. Адна з нормаў гэтага дакумента забараняе выкарыстанне тарфянікаў пэўнай глыбіні (менш за паўметра) пад прапашныя культуры.

Для правядзення меліярацыйных работ максімальна выкарыстоўваецца тэхніка айчыннай вытворчасці. Раней яе нават пастаўлялі за мяжу, а зараз зарыентавалі на патрэбы айчынных спажыўцоў. На перааснашчэнне была выдзелена бюджэтная пазыка ў памеры 240 мільярдаў рублёў. Гэта дазволіць не толькі максімальна загрузіць прамысловыя прадпрыемствы (сёлета плануецца ўдвая павялічыць аб'ёмы вытворчасці экскаватараў), а і забяспечыць меліяратараў неабходнай тэхнікай. Як лічыць Анатоль Булыня, галоўнае — працаваць па тэхналогіі. Гэта галоўная ўмова эканоміі капіталаўкладанняў. Напрыклад, калі канал не абкошваць на працягу двух гадоў, то ён зарастае кустоўем. У такім выпадку затраты на прывядзенне яго ў належны стан узрастаюць у 3—5 разоў.

Правядзенне новай меліярацыі не плануецца. Аднак тут ёсць выключэнні: упершыню за апошнія 15 гадоў адпаведныя работы выканаюць у некалькіх гаспадарках Столінскага раёна, дзе востра адчуваецца недахоп зямельных плошчаў. Аднак у любым разе такія рашэнні павінны быць дакладна пралічаны. Як заўважыў дырэктар інстытута меліярацыі Мікалай Вахонін, неабходна звярнуць увагу не толькі на эканамічны эфект, а і на мінімізацыю наступстваў для навакольнага асяроддзя. Ёсць шэраг палеткаў, якія немэтазгодна выкарыстоўваць у сельскагаспадарчай вытворчасці. Як паведаміў Анатоль Булыня, з эксплуатацыі прапанавана вывесці 86 тысяч гектараў меліяраваных земляў. Цікава, што 11 тыс. га з іх ужо ўключаны ў склад населеных пунктаў.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Бліц-апытанне

«Мы як працавалі раней, так і працуем»

Як глядзяць на сітуацыю вакол паставак у Расію беларускай малочнай прадукцыі самі вытворцы? Ці закранула яна іх? Рэдакцыя звярнулася на некалькі айчынных прадпрыемстваў.

Таццяна БОНДАР, камерцыйны дырэктар «Бабулінага гладыша»:

— Мы як працавалі раней, так і працуем, згаданая вамі сітуацыя нас не закранула. А каго закранула? Шчыра скажу, нават не ведаю. Працуем. Толькі сёлета плануем пашырыць асартыментны пералік прадукцыі прыблізна 20 навінкамі.

Алена БАБКІНА, намеснік генеральнага дырэктара ААТ «Савушкін прадукт» па сувязях з грамадскасцю:

— Ніякіх праблем у нас няма: машыны на Расію з прадукцыяй ішлі і ў мінулую пятніцу, і сёння. Проста мы загадзя паклапаціліся пра тое, каб прывесці ўпакоўку ў адпаведнасць з расійскім рэгламентам. Калі гаварыць пра ўнутраны рынак, напрыклад, распрацавалі лінейку прадуктаў эканом класа, каб спажывец меў магчымасць набываць звычныя натуральныя прадукты ў знаёмай упакоўцы, але па больш нізкіх цэнах.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

АКТЫЎНАЯ ПРАЦА НАД ТЭХНІЧНЫМІ РЭГЛАМЕНТАМІ ВЯДЗЕЦЦА І Ў НАС

З 12 снежня 2008 года ў Расіі ўступіў у сілу Закон «Тэхнічны рэгламент на малако і малочную прадукцыю». Згодна з ім, калі пры вытворчасці прадукту выкарыстоўваецца сухі парашок, вытворца не мае права пісаць на пакунку «малако». Вядома, што беларускія прадпрыемствы таксама пастаўляюць на расійскі рынак малочную прадукцыю. Якім чынам яны павінны ўлічваць новыя патрабаванні, уведзеныя суседзямі? У рэшце рэшт, ці закрануць у перспектыве аналагічныя змяненні ўнутраны рынак нашай краіны?

Як патлумачылі нам у Дзяржстандарце, айчынныя прадпрыемствы, якія пастаўляюць малако і малочную прадукцыю на расійскі рынак, загадзя былі папярэджаны пра чаканыя змяненні. Больш за тое, з 1 снежня мінулага года права пацвярджаць адпаведнасць прадукцыі патрабаванням новага расійскага тэхнічнага рэгламенту дадзена Федэральным агенцтвам па тэхнічным рэгуляванні і метралогіі Расійскай Федэрацыі Дзяржстандарта Беларусі. Гэты крок зроблены для стварэння спрыяльных умоў для нашых вытворцаў.

Трэба сказаць, што асаблівасць тэхнічных рэгламентаў у тым, што яны на заканадаўчым узроўні вызначаюць патрабаванні бяспекі, якія аптымальна забяспечваюць абарону жыцця, здароўя, маёмасці грамадзян, ахову навакольнага асяроддзя пры распрацоўцы, вытворчасці і эксплуатацыі прадукцыі, а таксама яе свабоднае абарачэнне на розных рынках. Гэтыя патрабаванні абавязковыя для вытворцаў і пастаўшчыкоў, а дасягнуць пастаўленых мэтаў ім дапамагаюць стандарты, якія з'яўляюцца найважнейшым інструментам для доказу выканання тэхнічных рэгламентаў.

У нашай краіне ў дачыненні да малака і малочнай прадукцыі, што пастаўляюцца на ўнутраны рынак, пакуль дзейнічаюць дзяржаўныя стандарты.

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ужо прыняты шэсць тэхнічных рэгламентаў, якія датычацца бяспекі ніскавольтнага абсталявання, электрамагнітнай сумяшчальнасці тэхнічных сродкаў аўтамабільнага бензіну і дызельнага паліва, а таксама адзінак вымярэння і неаўтаматычных вагавымяральных прыбораў, інфармацыйнай сумяшчальнасці праграмных і праграмна-тэхнічных сродкаў у банкаўскай дзейнасці. Тэрмін іх увядзення — 2010—2011 гады. Вядзецца распрацоўка 25 тэхнічных рэгламентаў, сярод якіх рэгламенты на сельскагаспадарчыя і лясныя трактары, на абсталяванне, якое працуе пад ціскам, дзіцячае харчаванне, на спажывецкую тару і г.д. Усяго да 2010 года прадугледжваецца распрацоўка 33 тэхнічных рэгламентаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

АНІШЧАНКА «ДЗЬМЕ НА МАЛАКО»?

Кіраўнік Расспажыўнагляда, галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Расійскай Федэрацыі Генадзь Анішчанка заявіў аднаму з расійскіх інфармагенцтваў, што Расія гатовая да перамоў з Беларуссю аб аднаўленні паставак малака ў РФ, але толькі з кампетэнтнымі ў гэтым пытанні афіцыйнымі асобамі. «Ці гатовыя мы да перагаворнага працэсу? Вядома. Але толькі з тымі, хто ў Рэспубліцы Беларусь прадстаўляе вытворцаў і кампетэнтны вырашаць гэтыя пытанні», — заявіў Анішчанка ў панядзелак.

Размова ідзе вакол забароны на экспарт у Расію каля 500 відаў малочнай прадукцыі з Беларусі. Паводле слоў галоўнага дзяржаўнага ўрача РФ, новы расійскі тэхрэгламент на малако патрабуе перааформлення 603 санітарна-эпідэмічных заключэнняў і 55 регістрацыйных пасведчанняў на малочную прадукцыю вытворчасці Беларусі. Акрамя гэтага адпавядаць патрабаванням тэхнічнага рэгламенту ў частцы дазвядзення неабходнай інфармацыі да спажыўца павінна ўпакоўка.

Як заяўляла напярэдадні намеснік міністра аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Беларусі Валянціна КАЧАН, «уся работа па перарэгістрацыі пастаўляемай малочнай прадукцыі была своечасова праведзеная. У аўторак у Маскве я разам з прадстаўніком Мінсельгасхарча Беларусі сустрэнуся з кіраўніком Расспажыўнагляда Генадзем Анішчанкам, і мы растлумачым сітуацыю».

Сяргей ПРОТАС.

КАНКУРЫРАВАЦЬ? Толькі за кошт якасці!

ЁСЦЬ байка аб тым, як у збан з малаком выпадкова трапіла жабка. Каб не патануць, пачала вельмі хутка рухацца і... лапкамі збіла сметанковае масла. Такім чынам і выбралася. Прыклад разумнай жывёліны перапрацоўшчыкі малака на Гомельшчыне сёння выкарыстоўваюць у прамым і пераносным сэнсе. Для прасоўвання малочнай прадукцыі ва Украіне Гомельскае ААТ «Румянцаўскае» стварыла сумеснае беларуска-ўкраінскае прадпрыемства. Яно пачало дзейнічаць у горадзе Чарняхоўскі Жытомірскай вобласці. Кантрольны пакет акцый (51 %) — у беларусаў. Тым часам у Жытоміры завяршаецца рэгістрацыя сумеснага прадпрыемства, заснавальнікам якога з беларускага боку будзе дзяржаўнае аб'яднанне «Гомельмясамалпрам». З кастрычніка мінулага года змяніўся вектар экспартных паставак малочнай прадукцыі гомельскіх перапрацоўшчыкаў — ад Расійскай Федэрацыі ў бок Украіны. Як расказаў першы намеснік генеральнага дырэктара дзяржаўнага аб'яднання «Гомельмясамалпрам» Генадзь РАМАНЕНКА, на прадпрыемстве распрацавана і актыўна рэалізуецца стратэгія асваення ўкраінскага рынку. У першым квартале 2009 года туды адпраўлена 67 % ад усяго аб'ёму масла, якое было выраблена на прадпрыемствах аб'яднання.

— Увогуле ж стварэнне тавараправаднай сеткі было пачата яшчэ ў 2003 годзе Рагачоўскім малочна-кансервавым камбінатам. Ім былі адкрыты гандлёвыя прадстаўніцтвы ў Санкт-Пецярбургу і Маскве. А потым іншыя малакаперапрацоўчыя прадпрыемствы ўзялі прыклад — так з'явіліся іх прадстаўніцтвы ў Маскве, Бранску, Клінцах. На маскоўскі і піцерскі напрамкі ідуць сухія малочныя прадукты і сметанковае масла. На далёкае замежжа — казеін (Германія, Польшча, ЗША, Літва, Латвія, Францыя...) У Бранскую вобласць займаемся пастаўкамі натуральнамалочнай прадукцыі, масла, сыроў. Сёння мы дамінуем на гэтым рынку, што наносіць пэўныя фінансавыя страты вытворцам з Расіі, бо якасць нашай прадукцыі даволі высокая. Прынамсі, наша прадукцыя не пазіцыянуецца на гэтым рынку як вельмі танная — тым не менш, яна карыстаецца устойлівым попытам.

— Летась 83 % паставак вашай прадукцыі было ў Расію. Тым не менш вы пачалі праводзіць дыверсіфікацыю рынку...

— Яшчэ летась мы пачалі прапрацоўваць украінскі рынак малочнай прадукцыі. У Гомелі ўжо створана беларуска-ўкраінская кампанія. Мы выбралі для сябе стратэгію прасоўвання прадукцыі на гэтым рынку: прадаём у буйныя гарады, дзе насельніцтва разам з бліжэйшымі пасёлкамі складае ад паўтара да пяці мільёнаў чалавек. Я думаю, што гэта работа закончыцца стварэннем сумеснага прадпрыемства ў Данецку. Зараз вядуцца перамовы з бізнэс-структурамі Луцка, Днепрапятроўска. З Харкава прыязджалі прадстаўнікі ветэрынарнай службы — для паставак прадукцыі ва Украіну прайшлі абследаванні Жлобінскі і Мазырскі малочныя заводы. Вельмі ўважліва мы сёння падыходзім да рынку Казахстана. Мы адразу пачалі пастаўкі прадукцыі ў гэтыя рэгіёны і паралельна адпрацоўваем стварэнне дыстрыб'юцарскай сеткі або сумесных прадпрыемстваў. Сёння мы пазіраем на краіны Блізкага Усходу. Былі, пакуль нязначныя, пастаўкі ў Кітай. На гэтыя рынкі прабівацца складана, яны вельмі насычаныя, але ж мы спрабуем «зачапіцца» і там.

— І ўсё ж фінансавае становішча прадпрыемстваў перапрацоўкі малака і мяса застаецца складаным...

— І захаваецца такім, відаць, мінімум да верасня. З мая да верасня ўвогуле не сезон для нашай прадукцыі. З верасня звычайна пачынаецца і павышэнне цэнаў на знешнім рынку. На кан'юнктуры цэнаў дрэнна адбілася і тое, што сёлета Еўрасаюз узнавіў субсідзіраванне экспартнай прадукцыі для вытворцаў, што дазволіла вытворцам з Еўропы паставіць для рынку СНД 15 тысяч тон сухога малака і 4 тысячы масла сметанковага па цэнах, значна ніжэйшых за тыя, што прапаноўваем мы. Адначасова нашымі канкурэнтамі на рынку Расіі і Украіны з'яўляюцца вытворцы з Акіяніі і Новай Зеландыі.

— Ствараючы сумесныя прадпрыемствы, якія задачы вы ставіце перад сабой?

— Калі мы ствараем такія прадпрыемствы (гэта нават у статуце запісана), робім гэта ў першую чаргу для прасоўвання прадукцыі беларускіх вытворцаў, а не для атрымання прыбытку. На некаторых такіх прадпрыемствах працуюць грамадзяне Беларусі. Яны выязджаюць туды на тры тыдні. Гэта дае нам магчымасць лепш кантраляваць фінансавы і таварны патокі. У нас стаіць задача пастаўляць на рынак Украіны фасаваны прадукт — так больш выгадна атрымліваецца. Калі пры нашым дзейным закандаўстве па цэнаўтварэнні сам факт фасоўкі значна не павялічвае цану — дадаецца толькі кошт працы па фасоўцы і вартасць фасавочнага матэрыялу, то ва Украіне гэта можа быць надбаўка да 40 % ад вартасці прадукту. Таму як крыніцу дадатковых даходаў можна выкарыстоўваць свабоднае цэнаўтварэнне ў іх краіне. Менавіта таму плануем паставіць туды адпаведнае абсталяванне па фасоўцы. Пакуль размова ідзе толькі аб гандлі, але ж паступова паўсюдна мы плануем арганізоўваць і сумесныя вытворчасці.

— Няўжо няма ніякага падводнага каменя пры прасоўванні беларускай прадукцыі на рынкі суседніх краін?

— Па Расійскай Федэрацыі ў нас ідзе выплата падатку на дабаўленую вартасць па заліку. Мы адпраўляем тавар без ПДВ, расійскі рэзідэнт атрымлівае, выплачвае падатак на сваёй тэрыторыі і нам дае пацвярджэнне. На жаль, і ў Расіі, і ва Украіне многа фірмаў-факелаў — так іх сёння называюць. «Успыхнула», разлічылася з прадаўцом, але ж пацвярджэння ПДВ не зрабіла — на гэтым зарабіла 10 % і адразу закрылася. Калі аб'ёмы продажу вялікія, грошы таксама. Пры поўным выкананні дзейнага заканадаўства мы летась страцілі каля 300 мільёнаў рублёў з-за махлярства такіх фірмаў. Мы рабілі ўсё ў адпаведнасці з пагадненнем паміж Расіяй і Беларуссю, але ж заканадаўства недасканалае і нам давялося плаціць 18 % за нядобрасумленных расійскіх пакупнікоў. Тое ж пытанне нас хвалюе і па Украіне. Там сітуацыя яшчэ больш складаная: грошай няма ва ўрадзе, няма ў банкаў і няма ў пакупнікоў. Таму мы вельмі асцярожна ўваходзім на гэты рынак і імкнёмся гарантаваць вяртанне грошай, бо нават страхавыя кампаніі не бяруцца страхаваць адгрузку тавараў ва Украіну. Напэўна, было б лепей і танней, каб у нас былі надзейныя партнёры-дыстрыб'ютары на ўкраінскім рынку, але ж такі час... Між тым, пераарыентацыя на рынак Украіны дазволіла затармазіць падзенне цэнаў на сметанковае масла.

— Здаецца, бліжэйшыя нашы суседзі таксама не сядзяць склаўшы рукі. За кошт чаго мы можам з імі канкурыраваць?

— Украінскі і расійскі спажывец высока ацэньвае якасць нашай мясной прадукцыі, але за кошт натуральнасці яна не такая танная, як мясцовая. Большасць малочнай і мясной прадукцыі ў нашых суседзяў таннейшая, але ж для гэтага многія вытворцы шырока выкарыстоўваюць раслінныя дабаўкі. Так, у малацэ вядомай расійскай фірмы — да 30 % соі. У іх сырах жывёльны складнік можа быць 10 %, астатняе — бялок і тлушч раслінна паходжання. Высокатэхналагічнае абсталяванне, на якім яны працуюць, дазваляе рабіць такія рэчы. Мы ж будзем пастаўляць толькі высакаякасную натуральную прадукцыю. Няхай самі спажыўцы ацэньваюць, наколькі яна добрая. Хоць нам часам робяць прапановы, каб мы зафасавалі не тое, што напісана на этыкетцы.

— Ці падрабляюць нашы беларускія брэнды, у прыватнасці знакамітую Рагачоўскую згушчонку?

— І не толькі яе. Па Расіі мы гэтыя ўзоры адбіралі, перадавалі ў адпаведныя органы. Больш за тое, падрабляецца прадукцыя, якая ідзе для прамысловай перапрацоўкі — апошнім часам была падробка масла з Акцябрскага — нам выставілі прэтэнзіі, што ў ім утрымліваюцца раслінныя тлушчы. Урэшце высветлілася, што гэтаму пакупніку Акцябрскае прадпрыемства ўвогуле не адпускала прадукцыю. Але ж этыкеткі на скрынках былі адпаведныя. Тыя ж самыя праблемы былі з Калінкавіцкім сухім малаком. Вельмі многа падраблялася фасаваная прадукцыя Калінкавіцкай масласырбазы. Пасля праверак на пэўны час гэты фальсіфікаваны тавар знік з расійскага рынку, але сёння зноў з'яўляецца. У Рагачове пайшлі нават на тое, каб бляшаны слоік яшчэ раз маркіраваць непасрэдна на метале. Тым не менш падробак шмат. Сутыкнуліся і з такім фактам. Напісана «Рагачоўскі малочна-кансервавы камбінат», а маленькімі літарамі ўнізе — «вытворца — г. Кінешма». Каб гэтага пазбегнуць і пакупнік не страціў да нас даверу, мы прадаём усю «лінейку» прадукцыі — згушчонку ў асартыменце — звычайная, з какавай, з кавай, з цыкорыем, канцэнтраванае малако...

«Падробак шмат. Сутыкнуліся і з такім фактам. Напісана «Рагачоўскі малочна-кансервавы камбінат», а маленькімі літарамі ўнізе — «вытворца — г. Кінешма».

А ўвогуле, шчыра кажучы, сёння гэта вялікі плюс нашай дзяржаве і прадукцыі нашых прадпрыемстваў, што надпіс «Зроблена ў Беларусі» — гэта само па сабе брэнд. Калі мы выязджаем на кірмаш у іншую краіну і ёсць надпіс «Беларуская прадукцыя» — чарга гарантаваная. Нават нашы партнёры просяць, каб на ўпакоўцы абавязкова быў надпіс: «Зроблена ў Беларусі».

Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара.

Погляд

ЗА ЎСЁ ТРЭБА ПЛАЦІЦЬ,

альбо Ці актуальная сёння прыказка «Якой бы дружба ні была, а лыжка ў кожнага свая»?

Пасля распаду Саюза беларуска-расійскія адносіны склаліся такім чынам, што не маюць аналогіі не толькі на постсавецкай прасторы, але і ў Еўропе. Іх можна назваць сяброўскімі ці братэрскімі, але, якімі б цёплымі яны ні былі, — гэта адносіны дзвюх суверэнных дзяржаў, а калі так, то, пры наяўнасці многіх фактараў, што аб'ядноўваюць нашы краіны, у кожнай ёсць і свае інтарэсы. Калі гэтыя інтарэсы ў нечым не супадаюць, то і ўзнікаюць непразуменні.

Хоць Расія ўжо і не з'яўляецца звышдзяржавай, але імкнецца быць сярод лідзіруючых краін свету і зыходзячы з гэтага выстройвае сваю палітыку. І калі адносіны з вядучымі дзяржавамі свету — адны, то з былымі савецкімі рэспублікамі — іншыя. Расійская Федэрацыя хацела б, каб суседзі да яе былі лаяльнымі і рухаліся ў фарватары расійскай палітыкі — фарватары старэйшага брата.

Але за лаяльнасць і дружбу неабходна плаціць. І калі расійскія палітыкі іншым разам любяць падкрэсліць, што за газ яе суседзі не плацяць сусветную цану, то забываюць сказаць, што гэта не ад дабраты робіцца, а ад жадання трымаць тую ці іншую краіну на кароткім ланцужку. Вось Украіна зрабіла кульбіт у бок Еўрасаюза і для яе газ — ужо па сусветнай цане.

Эканамічныя рычагі ціску прымяняюцца ва ўсім свеце, але яны не заўсёды спрацоўваюць. Куба, нягледзячы на амерыканскую эканамічную блакаду, выстаяла (іншая размова, якая цана такой стойкасці).

Але вернемся да свайго, набалелага. Вось Расія ўводзіць абмежаванні на ўвоз беларускай малочнай прадукцыі, адмаўляе ў крэдыце, які быў агавораны... І падкрэсліваецца, што гэта ні ў якім разе не палітычны ход, а эканамічная неабходнасць.

Беларусь сёння — адзін з сусветных лідараў па вытворчасці малака на душу насельніцтва, і хоць малочная прадукцыя ідзе на экспарт у многія краіны — расійскі рынак для нас з'яўляецца асноўным.

У свой час Беларусь зрабіла стаўку на Расію, і нечакана высветлілася, што і за гэты выбар неабходна плаціць.

Успомнім, што праблема ўзнікла з экспартам беларускага цукру, а яшчэ расійскія чыноўнікі шастаюць па нашых мясакансервавых прадпрыемствах і вызначаюць, якому даць дазвол на экспарт прадукцыі, а якому не. І гэта пры тым, што мяса Расія імпартуе з Польшчы, ЗША, Аргенціны, Новай Зеландыі... І што, расійскія кантралёры і ў гэтых краінах гаспадараць гэтаксама, як у Беларусі?

І як тут не ўспомніць крытычныя перадачы расійскага канала НТБ, у якіх было паказана, якім мясам кормяць расіян свае прадпрыемствы, і галоўны санітарны ўрач Расіі Г. Анішчанка чамусьці не зазірае ў мясныя кансервы мясцовай вытворчасці і не абураецца, што там толькі мука, а каўбаса насычаная рознымі напаўняльнікамі.

Тэму эксперту малака я закрануў з трыма кіраўнікамі малочных заводаў, якія пастаўляюць сваю прадукцыю на расійскі рынак, і пачуў:

— Некалькі мільёнаў літраў малака, якія Беларусь экспартуе, — для Расіі кропля ў моры. Нашы заводы маюць сучаснае імпартнае абсталяванне, і па многіх параметрах наша прадукцыя лепшая за расійскую. І тут праблема не эканамічная, а палітычная.

Прэзідэнт Беларусі ўжо расставіў акцэнты ў сітуацыі, але маю ўвагу найперш прыцягнулі яго словы:

«Давайце будзем будаваць сваю эканоміку і палітыку як суверэнная незалежная дзяржава. Калі мы нарэшце будзем мысліць як чыноўнікі незалежнай суверэннай краіны».

Для Беларусі гэта надзвычай актуальна. Многія аналітыкі і палітолагі лічаць, што гэта рэакцыя расійскага кіраўніцтва на рухі Беларусі ў бок Еўрасаюза. Наладзіла наша краіна з ім адносіны, яшчэ не прызнала Абхазію і Паўднёвую Асецію — і атрымала малочную праблему. Калі гэта сапраўды так, то мы бачым толькі вынік, а прычына яго больш глыбінная і ляжыць у плоскасці нашага суверэнітэту.

Беларусь праявіла самастойнасць — не пагадзілася з роляй сатэліта і ў адказ — выпад.

А тое, што Беларусь у гэтай сітуацыі не зрабіла паспешлівых крокаў, сведчыць пра яе ўзважаную палітыку. Наша краіна занесена ў палітычную карту свету і гэта накладвае пэўныя абавязкі.

У выпадку прызнання вышэйназваных тэрыторый узнікнуць дыпламатычныя праблемы з Грузіяй — не чужой нам краінай, адбудзецца збой у адносінах з Еўрасаюзам. І пры такім раскладзе прайграе толькі Беларусь.

І нават калі б пасля прызнання нам далі абяцаны крэдыт у 500 млн долараў, то ў любы момант можна паставіць новыя ўмовы. Напрыклад, за нейкую льготу патрабаваць увядзення расійскага рубля, парадаць за сімвалічную цану вядучыя прадпрыемствы ці нават уступіць Беларусі ў склад Расійскай Федэрацыі...

З намі так абыходзяцца, бо, на мой погляд, мы свой суверэнітэт па некаторых пазіцыях апусцілі да самай крытычнай рысы. І не дзіўна, што некаторыя нашы чыноўнікі не мысляць як прадстаўнікі незалежнай дзяржавы.

Давялося аднойчы пачуць, як адзін мясцовы кіраўнік перад перапоўненай залай заявіў: «Наша сталіца — горад Масква». Сумна, але факт.

Самай важнай часткай суверэнітэту з'яўляецца не армія ці эканамічная сістэма, а самасвядомасць народа, яго грамадзянская пазіцыя, якая выражаецца ў стаўленні да сваёй культуры, гісторыі, мовы... Такую самасвядомасць можна назваць інтэлектуальным суверэнітэтам дзяржавы. І часта краіны, якія прэтэндуюць на ролю лідара ў сваім рэгіёне, імкнуцца і сваю мову, мысленне распаўсюдзіць на суседнія тэрыторыі.

Мы назіраем, як нашы суседзі абараняюць свой інтэлектуальны суверэнітэт. Гэта датычыцца Украіны, краін Балтыі... Праўда, на гэта нервова рэагуюць расійскія СМІ, і не толькі...

Беларусь, лічу, у гэтым плане ад свайго суверэнітэту адступілася. А для чаго? Відавочна, таму, што наш суверэнітэт мае цану. А цікава, колькі мільярдаў у. а. ён каштуе? Гэта для тых, хто лічыць, што ў нашай краіне моцна развіты ўтрыманцкі настрой.

Хачу спыніцца яшчэ на адным моманце. Напэўна, няма такой краіны, кіраўніцтва якой не хацела б мець добрыя адносіны з рэлігійнымі канфесіямі, якія падтрымлівалі б нацыянальныя інтарэсы. У Беларусі ўсе канфесіі маюць роўныя правы, але асаблівая ўвага ўсё ж надаецца Рускай праваслаўнай царкве. Адбудаваны за кошт дзяржавы храмы і кляштары, узведзены новыя... Вось і ў Баранавічах будзе ўзведзены храм з сібірскай лістоўніцы. Вельмі дорага, але ніхто тых мільярдаў у нас не лічыць — гэта святое.

І калі па-добраму, то тут дзяліць няма чаго — брацкія народы, будуем Саюзную дзяржаву...

Толькі не трэба нас папракаць і выстаўляць рахунак, бо і Беларусь у такім выпадку можа выставіць свой і... пачне будаваць суверэнную дзяржаву. Хоць з суседзямі за лепшае быць у прыязных адносінах.

Часам лаўлю сябе на думцы, што ў сямейных і міждзяржаўных адносінах ёсць многа агульнага. Вось жывуць два родныя браты: маюць сем'і, жыллё, працуюць. І калі адзін з іх у большым дастатку, то і падтрымае бяднейшага, які за гэта адпрацуе — пастараецца не быць у даўгу. Кожны будзе есці, што ёсць на стале, са сваёй міскі і сваёй лыжкай. Але як толькі багацейшы за дапамогу пачне ў доме брата ўстанаўліваць свае парадкі, то ўсё закончыцца скандалам.

І ў сям'і ёсць суверэнітэт, а што казаць пра дзяржаву!

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

РАКОВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ВОЛОЖИНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 2 (двух) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:

лот № 1 — земельный участок в агрогородке Раков, площадь участка — 0,1545 га, участок № 5, кадастровый номер участка 622085715641000007, начальная цена 15 450 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание жилого дома. Проектируется центральное водоснабжение, имеется поблизости газ;
лот № 2 — земельный участок в агрогородке Раков, площадь участка — 0,1458 га, участок № 13, кадастровый номер участка 622085715640000011, начальная цена 14 580 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка -- строительство и обслуживание жилого дома. Проектируется центральное водоснабжение, имеется поблизости газ.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Белар

На слыху

Пакараюць Бог і правасуддзе

Храм Стрэчання Гасподняга ў Бабруйску сёлета абакралі двойчы: першы раз на Вялікдзень, і цяпер — на Троіцу.

У ноч з 6 на 7 чэрвеня з храма зніклі срэбныя вырабы на суму болей за 3,3 мільёна рублёў, паведамілі ў прэс-цэнтры абласнога УУС. Невядомыя зладзеі ўзламалі дзверы і скралі царкоўнае срэбра.

Каля двух месяцаў таму, на Вялікдзень, з гэтай невялікай царквы на вуліцы Ульянаўскай ужо скралі срэбра на 8 мільёнаў рублёў. Хутка выявілася, што крадзеж учынілі тры падлеткі, якія залезлі ў царкву праз разбітае акно.

У міліцыі каментуюць, што першым разам зламыснікаў-«бязбожнікаў» дапамагла адшукаць грамадскасць, і цяпер плануецца таксама звярнуцца да людзей. Акрамя гэтага, праваслаўнаму прыходу самы час памеркаваць над аховай сваёй уласнасці. Пасля першага крадзяжу ў царкве так і не з'явіліся ні вартаўнік, ні сігналізацыя. Праўду кажуць: на Бога спадзявайся, але і сам не рабі промаху!

Між тым, рэчаіснасць такая, што святыя дні не гарантуюць абарону ад злачынцаў. У тым жа Бабруйску 7 чэрвеня, але ў іншым храме — Свята-Іверскім, у 22-гадовай жанчыны скралі мабільны тэлефон.

Алена КАЗЛОВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

30,6 Як правільна прачынацца?

Калі ў чалавека з раніцы не ідуць справы, усё валіцца з рук і нічога не атрымліваецца, кажуць, што ён устаў не з той нагі. І гэта не проста словы. Медыцынай даказана: для таго, каб дзень прайшоў добра, трэба правільна ўставаць.

Сон — гэта асаблівы біялагічны стан чалавека. «Падчас яго псіхалагічная дзейнасць мае месца ўсю ноч, — кажа **кандыдат медыцынскіх навук, загадчык кафедры псіхіятрыі БелМАПА Ірына БАЙКОВА**. — У гэты час мозг чалавека перапрацоўвае інфармацыю, якую чалавек атрымаў на працягу дня. Мозг вырашае, што трэба пакінуць, ад чаго пазбавіцца, што пагрузіць у доўгачасовую памяць, а што ў кароткачасовую».

Пры гэтым адбываюцца змяненні ў рабоце розных органаў і сістэм арганізма. Таму пры абуджэнні трэба гэтыя сістэмы падрыхтаваць да дзённай работы. Для таго ёсць некалькі вельмі простых практыкаванняў.

Не ўспамінайце аб малапрыемных рэчах, якія вас чакаюць на працягу дня. Навошта з раніцы настройваць сябе на дрэнныя. Трэба зарадзіцца радасцю. Калі магчыма, прачынайцеся пад прыемную, добрую музыку.

Каб актывізаваць сардэчна-сасудзістую сістэму, лежачы на спіне, пакладзіце рукі на жывот, зрабіце некалькі глыбокіх удыхаў і выдыхаў, напружваючы жывот, вельмі моцна выпруджваючы брушную сценку пры ўдыху і максімальна ўцягваючы яе ў сябе пры выдыху. Такім чынам вы натуральным шляхам разгоніце кроў з брушной поласці, у якой яна застаялася. Інтэнсіўнае дыханне вентылюе лёгкія. Зрабіце 10—15 такіх удыхаў. Тыя, каму складана выконваць практыкаванні з выцягнутымі нагамі, могуць іх крыху сагнуць.

Перавярніцеся на левы бок, падцягнуўшы калені да падбародка, пакладзіце правую руку на правае падрабер'е і зрабіце ад 5 да 15 удыхаў. Гэтым практыкаваннем вы прачысціце жоўцевыя шляхі, яно вельмі карыснае тым, у каго «тугі» кішэчнік.

Раніцай таксама неабходна расцягнуць пазваночнік: правую руку выцягнуць наперад, правую пятку падцягнуць ад сябе, тое ж самае зрабіць з левым бокам. Потым дзвюма рукамі пацягнуцца наперад, а пяткамі ад сябе.

Калі дазваляе час, у каленна-локцевым становішчы зрабіце выгінанне і прагінанне спіны (як котка), кранаючыся грудзямі ложка.

Пасля гэтай невялікай гімнастыкі крыху пасядзіце на ложку. Добра, калі першы крок вы зробіце на масажны дыванок ці ўстанеце ў масажныя туфлі. Пахадзіце ў іх 10—15 хвілін. Такім чынам вы прамасіруеце ступні, на якія праецыруюцца ўсе органы.

Калі ў вас ёсць нейкія захворванні, у ранішнім абуджэнні з'яўляюцца некаторыя асаблівасці. Для людзей з гіпертанічнай хваробай раніца — самы цяжкі час, і статыстыка, на жаль, пацвярджае, што самая вялікая колькасць катастроф з гіпертонікамі (крызы, інсульты, раптоўная смерць) адбываецца паміж 6 і 11 гадзінамі раніцы. Таму гіпертоніку яшчэ ў ложку трэба прыняць лекі і паляжаць некаторы час. А для таго, каб не было залішняй нагрузкі раніцай, неабходнае павінна быць падрыхтавана з вечара — ад сняданку, які трэба будзе толькі разагрэць, да вопраткі, у якой вы пойдзеце па справах. Бо ранішняя мітусня можа дадаць шмат непрыемнасцяў, справакаваць хваробу, так што залішнюю актыўнасць трэба звесці да мінімуму. Выйшаўшы на вуліцу, вельмі добра ўсім (хворым на гіпертанію асабліва) прайсці 1—2 прыпынкі пешшу, «захапіць» паболей паветра.

Цяпер пра тое, як правільна ўставаць людзям, якія маюць астэахандроз, асабліва шыйнага і груднога аддзелаў, тым, у каго раніцай бываюць непрыемныя адчуванні, галавакружэнне, моташнасць.

Спаць трэба без падушкі на ложку сярэдняй жорсткасці. Рабіць можна ўсе дыхальныя практыкаванні, пра якія мы гаварылі вышэй, пасля гэтага ўставаць трэба вельмі акуратна. Спачатку спусціць ногі з ложка і так крыху паляжаць. Потым сесці і з адкрытымі вачыма вельмі мяккімі рухамі зрабіць 5—10 паваротаў галавы направа—налева і такую ж колькасць разоў нахіліць яе ўперад—назад. Пасля гэтага ўстаць, крыху пастаяць і пачынаць свой дзень.

Прыкладна такі ж рытуал павінен быць у хворых з гіпатаніяй (паніжаным артэрыяльным ціскам). Яны ведаюць, што пры рэзкіх рухах, асабліва пры пераходзе з гарызантальнага ў вертыкальны стан, бывае шум у вушах, цямнее ў вачах амаль да страты прытомнасці.

Вольга ШАЎКО.

ФАРЭЛЛЮ ЗОЙМУЦЦА ПРЫВАТНІКІ?

Зараз у нашай краіне для вырошчвання рыбы выкарыстоўваецца 20 тысяч гектараў штучных вадаёмаў. Аб'ём яе вытворчасці апошнім часам павялічваецца: калі ў 2004 годзе было рэалізавана 4 тысячы тон, то летась — ужо каля 12,9 тыс. тон. Як адзначыў дырэктар Дэпартамента па меліярацыі і воднай гаспадарцы Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Анатоль Булыня, сёлета мяркуецца выйсці на праектную магутнасць і дасягнуць узроўню 16,3 тыс. тон.

Сярод відаў пераважае карп, на долю якога прыпадае 87 працэнтаў рыбы, якая вырошчваецца ў штучных вадаёмах. Але ў далейшым відавы склад будзе пашырацца. Найбольш перспектыўная фарэль, якой у Беларусі пакуль вырошчваецца вельмі мала — у межах 7 тон у год. Для параўнання: у Фінляндыі адпаведны паказчык складае 18 тысяч тон, а ў Польшчы — больш чым 19 тыс. Між тым, вырошчванне фарэлі — даволі выгадны кірунак дзейнасці. Паводле разлікаў, рэнтабельнасць такой вытворчасці складае каля 50 працэнтаў. Таму, як лічыць Анатоль Булыня, вырошчванне фарэлі павінна зацікавіць фермераў. У такім разе для развіцця спецыялізаваных гаспадарак неабходна прадугледзець сістэму льготнага крэдытавання, каб прыцягнуць прыватнікаў.

Найбольш перспектыўнымі для вырошчвання з'яўляюцца таксама сом і асётр. Варта больш сур'ёзна займацца зарыбленнем натуральных вадаёмаў. Пакуль што аддача ад такіх вадасховішчаў невялікая: летась вылаўлена толькі 800 тон азёрнай і рачной рыбы. Між тым, адзначыў Анатоль Булыня, удалося даволі нядрэнна зарыбіць вадаёмы шчупаком, напрацаваны добры вопыт па развядзенні ліня, язя і іншых відаў. У перспектыве неабходна стварыць спрыяльныя ўмовы для таго, каб разводзіць рыбу маглі і прыватнікі. Разам з развіццём перапрацоўкі будзе працягвацца шырокі продаж жывой рыбы. Паколькі толькі ў такой прадукцыі захоўваюцца каштоўныя спажыўныя якасці (напрыклад, поліненасычаныя тлустыя кіслоты). Аднак рачная і азёрная рыба, на жаль, пакуль не заняла належнага месца ў рацыёне беларусаў.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

МАСАВЫ КОНКУРС РАШЭННЯЎ

Заданне № 17



Белыя: Крe2, Лf3, Сf5, Кd3 (4).

Чорныя: Крh1, Лg5, Ка8, пп. a3, b3, g4, h2, h3 (8).

Выйгрыш. (5 ачкоў)

Заданне № 18



Белыя: Крe2, Сd1, Кd3, п. e7 (4).

Чорныя: Крh1, Лh3, Сb3, Сh4, пп. d4, g4 (6).

Нічыя. (5 ачкоў)

На рашэнне заданняў даецца 15 дзён.

Праверце свае рашэнні

Змяшчаем рашэнні заданняў масавага конкурсу рашэнняў, апублікаваных 6 мая г.г.

Заданне № 11. І. Агапаў. 1. Кс5! е3 2. Фа7! К:а2 3. Кb3 Крb1 4. Фh7х, 1... К:а2 2. Фb2!+К:b2 3. Кb3 Крb1 4. Ка3х, 1... Кb5 2. Фа8 Кd4 3. Кр:d4 і 4. Кb3х, 1... Кр:а2 2. Фb3+Крa1 3. Фс2 Кb2 4. Ф:b2х.

Заданне № 12. І. Агапаў, А. Бахараў. 1. е4! -цугцванг. 1... Лe7 2. С:е6! С:е6 3. Кf5! С:с8 4. С:е7х, 1... Сс8 2. Л:е6+ Л:е6 3. е5! Л:е5 4. К:с8х, 1... g3 2. Сh3! g2 3. Л:е6+ Л:е6 4. Кf5х, 3... С:е6 4. е5х, 1... de 2. Кс8+С:с8 3. Ла3! Крd7 4. Лd3х.

Творы — лаўрэаты конкурсаў

Пазнаёмцеся з творамі беларускіх складальнікаў шахматных кампазіцый, якія ўдзельнічалі ў конкурсах складання. Так, у юбілейным конкурсе, прысвечанаму 50-годдзю І. Бондара, у 2008 годзе эцюд Я. Сляпяна атрымаў другі прыз: **Белыя:** Крh1, Лg2, Сf1, Сg1, пп. a7, b7, h6 (7). **Чорныя:** Крa4, Лc6, Сb8, Сd5, Ка8, п. e2 (6). Нічыя.

Рашэнне: 1. abC! Л:h6+ 2. Ch2 efC! 3. Се3! Cf:g2+ 4. Крg1 Лf6! 5. baФ+С:а8 6. Chf4! і нічыя. А ў раздзеле троххадовых задач Ч. Якубоўскі атрымаў трэці прыз. **Белыя:** Крa6, Сf3, Ка5, Кh7, пп. c3, c4, e2, e5, f5 (9). **Чорныя:** Крc5, Лh6, пп. a4, c6, e7, f7, h3 (7) 1... Лf6 2. Кg5, 1... Лh5 2. Кf8. 1. Кf8?, але 1... Лd6! 1. Кg5?, але 1... Лh4! Рашае 1. е3! ~~2. Се2, 1... Лd6 2. Кg5, 1... Лh4 2. Кf8! Тэма Баннага з выбарам першага ходу. А ў конкурсе складання задача Ч. Якубоўскага адзначана ганаровым водгукам часопіса «Шаховій Леополіс». **Белыя:** Крa3, Лd1, Лf5, Кc8, Кh7; пп. a4, b3, c2, c4, e2, h3 (11). **Чорныя:** Крc5, Лh6, Сg8, Сh8, пп. c6, c7, e5, f7 (8). Мат за тры хады.

1. Кf8? Лd6! 1. Кg5? Лh4! Рашае 1. е3! ~~2. Лd4+ 1... Лd6 2. Кg5, 1... Лh4 2. Кf8!

У дзвюх спробах і рашэнні задачы праходзіць тэма Баннага—Ханэліуса.

Аўтары кампазіцый — мінчане.

Пажадаем ім новых творчых поспехаў на міжнародных конкурсах.

Запрашаем да ўдзелу

Валгаградская газета «Молодой» праводзіць XX мемарыял З. Бірнова ў пяці раздзелах: двухходоўкі, троххадоўкі, шматходоўкі, эцюды і задачы на кааператыўны мат за 2 хады. Кампазіцыі ў двух экзэмплярах кожная, на дыяграмах і з поўным рашэннем дасылаць да 30 лістапада г.г. на адрас: 400066, Волгоград, а/я 148, рэдакцыя газеты «Молодой», Россия, з паметкай «Шахматы».

Прамая лінія

ДАПАМОГІ, ПЕНСІІ, ІЛЬГОТЫ

Вынікам любых эканамічных узрушэнняў заўсёды становіцца рост цікавасці да сацыяльнай падтрымкі. А адсюль — і тэма нашай чарговай «прамой лініі». Як аднавіць звесткі аб заробках для разліку індывідуальнага каэфіцыента, калі могуць адмовіць у адраснай сацыяльнай дапамозе і ці засталіся транспартныя льготы на дзяцей-інвалідаў? Такім чынам, на гэтыя і іншыя пытанні чытачоў «Звязды» адказваюць намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валянціна Вікенцьеўна КАРАЛЁВА і начальнік упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Валянціна Пятроўна СЯРГЕЕВА.

☎ — У 33 гады стала інвалідам, зараз маю II групу, мне 78 гадоў. Адкуль такая маленькая, нават ніжэйшая за бюджэт пражытковага мінімуму, пенсія — 195 тысяч рублёў? І другое. Ці можа аформіць догляд мяне дачка, якая ўжо таксама з'яўляецца пенсіянеркай?

Часлава Станіславаўна Бялецкая, *г. Мінск*

— Як вядома, пенсія вызначаецца індывідуальна — у залежнасці ад стажу і ранейшых заробкаў. Прычым нормы, якая б прадугледжвала, што пенсія павінна быць абавязкова не ніжэйшай за бюджэт пражытковага мінімуму, у нас няма. Таму адзінае, што можна параіць — звярнуцца ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства па адрасную сацыяльную дапамогу. Такая дапамога можа быць прызначана, калі даход на кожнага члена сям'і (у гэтым выпадку сям'я — гэта вы і дачка) атрымліваецца меншым за бюджэт пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва. У сваю чаргу «сярэдні» БПМ на сёння — 243 570 рублёў.

І наконт другога пытання. Права аформіць дапамогу па доглядзе маці ў вашым выпадку няма. Такая дапамога можа быць прызначана толькі па доглядзе інваліда I групы ці асобы ва ўзросце больш за 80 гадоў і да таго ж — толькі працаздольным грамадзянам.

☎ — Мне 49 гадоў, і цяпер я нідзе не працую, бо вымушаны даглядаць сваю 82-гадовую маці, якая амаль не ўстае з ложка. Ці магу я атрымліваць дапамогу па доглядзе маці і, калі так, то якія для гэтага неабходна мець дакументы?

Уладзімір Радзіваноўскі, *Свіслацкі раён*

— Калі вы не працуеце, не займаецеся прадпрымальніцкай дзейнасцю, не атрымліваеце дапамогу па беспрацоўі ці пенсію, то права аформіць догляд маці будзе — паколькі маці ўжо споўнілася 80 гадоў, а вы знаходзіцеся ў працаздольным узросце. Праўда, такое афармленне магчыма яшчэ пры адной умове — наяўнасці заключэння медыкаў, што маці насамрэч мае патрэбу ў доглядзе. Калі такое заключэнне будзе, вы можаце звярнуцца ў раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне і падаць заяву, працоўную кніжку і пашпарт — усе астатнія неабходныя дакументы спецыялісты ўпраўлення збяруць самі.

☎ — Непакоюць са Жлобінскага раёна, а нагода наступная. Нягледзячы на невысокі ўзровень даходаў, нашай сям'і адмовілі ў адраснай сацыяльнай дапамозе толькі таму, што летась мы набылі скутар. Ці правільна гэта? Тым больш, што на набыццё таго ж скутара мы бралі банкаўскі крэдыт...

— Адмова была правільнай. Бо, з аднаго боку, вы звяртаецеся па адрасную сацыяльную дапамогу ў сувязі з нізкім даходам, а з іншага — набываеце транспартны сродак, які цяжка аднесці да прадметаў першай неабходнасці. Так, пры прызначэнні адраснай дапамогі сапраўды бяруцца пад увагу буйныя пакупкі, што былі зроблены за апошнія 12 месяцаў. Прычым незалежна ад таго, рабіліся гэтыя пакупкі за ўласныя ці крэдытныя сродкі.

☎ — Патлумачце, калі ласка, ці бярэцца пад увагу пры вызначэнні групы інваліднасці ўзровень адукацыі чалавека?

Віталь Анатольевіч Вітко, *Беластаўіцкі раён*

— На вызначэнне групы інваліднасці адукацыя ніякім чынам не ўплывае — група залежыць выключна ад стану здароўя. Іншая справа, што адукацыя і спецыяльнасць чалавека бяруцца пад увагу пры вызначэнні інваліду працоўных рэкамендацый.

☎ — Пасля выхаду на пенсію мяне папрасілі папрацаваць у сельгаспрадпрыемстве. Аднак здарылася так, што неўзабаве я атрымаў цяжкі пералом. Якую дапамогу могуць мне аказаць? І яшчэ. Мне прызначылі II групу інваліднасці, але з гэтым я не згодны. На мой погляд, у сувязі з пагаршэннем стану здароўя пасля пералому група павінна быць першай. Як яе атрымаць?

Сяргей Сцяпанавіч Салаш, *Дзятлаўскі раён*

— Калі гаворка ідзе аб траўме на працоўным месцы, якая афармлена спецыяльным актам, кампенсацыю ўрону здароўя павінен выплачваць Белдзяржстрах. Аднак калі траўма была атрымана ў быце, то ніякіх кампенсацый не прадугледжваецца — за выключэннем выпадкаў, калі тыя ці іншыя выплаты з такой нагоды вызначаныя ў калектыўным дагаворы сельгаспрадпрыемства.

Што ж да змены групы інваліднасці, то зрабіць гэта могуць толькі медыкі. У прыватнасці, тут можна звярнуцца з просьбай аб перааследванні ў абласную медыка-рэабілітацыйную экспертную камісію, але для пачатку — звярнуцца да свайго ўрача ў раёне.

☎ — У свой час раённая медыка-рэабілітацыйная камісія выдала мне пасведчанне інваліда III групы з дзяцінства пажыццёва. Аднак потым абласная МРЭК запатрабавала дадатковыя пацвярджанні, якія я прадаставіць не змог — у сувязі з тым, што цяжкая хвароба напаткала мяне ў 5-гадовым узросце перад самай вайной і дакументы не захаваліся, ёсць толькі запіс у ваенным білеце. У выніку цяпер інвалідам з дзяцінства я не лічуся і, адпаведна, не маю права на надбаўку да пенсіі. Што рабіць у такой сітуацыі?

Юрый Віктаравіч Гусеў, *г. Магілёў*

— Сапраўды, інваліды з дзяцінства, інваліднасць якім вызначана пажыццёва, маюць права на павышэнне ў памеры 50 % ад мінімальнай пенсіі па ўзросце. Аднак каб атрымліваць яе, неабходна медыцынскае заключэнне. Паколькі мы разумеем, выдаць такое заключэнне ў вобласці адмаўляюцца. Таму, Юрый Віктаравіч, застаецца адно — звярнуцца з просьбай дэталёва разабрацца ў сітуацыі непасрэдна ў Міністэрства аховы здароўя.

☎ — Патлумачце, калі ласка, які працэнт пенсіі страчвае пенсіянер, які працягвае працаваць? Напрыклад, колькі страчвае працуючы пенсіянер з індывідуальным каэфіцыентам 1,8?

Валерый Іванавіч, *г. Мазыр*

— Абмежаванні па выплатах пенсій працуючым пенсіянерам вызначаюцца не ў працэнтах. Існуе іншая норма: пры налічэнні пенсіі такім пенсіянерам улічваецца толькі індывідуальны каэфіцыент заробку да 1,3, тады як індывідуальны каэфіцыент заробку больш за 1,3 у разлік ужо не прымаецца. Пры гэтым сама сума «страт» становіцца, як правіла, нязначнай. Да прыкладу, працуючы пенсіянер з каэфіцыентам 1,8 «недаатрымлівае» каля 25—35 тысяч рублёў.

— Усім зразумела, што зараз крызіс, але цэны ў крамах усё ж растуць. У сувязі з гэтым першае пытанне: калі будзе праведзены наступны перараслік пенсій?

І другое пытанне. Сын маёй знаёмай служыў у Афганістане, закончыў БДУ, потым працаўладкаваўся. Аднак з-за праблем са здароўем пастаянную работу кінуў, зараз жыве з часовых заробкаў. Як гэты час будзе залічвацца ў стаж? І ці паўплываюць як-небудзь на пенсію 2 гады службы ў Афганістане? Ці праўда, што год такой службы залічваецца за 3 гады стажу?

Марыя Іванаўна, *Нясвіжскі раён*

— У сувязі з ростам цэнаў змяняецца бюджэт пражытковага мінімуму, а ўслед за ім — павялічваюцца мінімальныя і сацыяльныя пенсіі, дарэчы, іх перараслік сёлета ўжо праводзіўся двойчы. Што да пенсій працоўных, то тут усё залежыць ад росту сярэдняй зарплаты па краіне. Для перараслiку працоўных пенсій заканадаўствам прадугледжаны 15-працэнтны «парог» росту сярэдняй зарплаты, і, на жаль, з мінулага года перавысіць гэты «парог» заробкі не змаглі. Разам з тым, тое ж заканадаўства вызначае: калі сярэдняя зарплата на 15 % не павялічваецца, то пенсіі перараслічвацца адзін раз у год з 1 лістапада — выходзячы з фактычнага росту заробкаў за трэці квартал (з часу апошняга павышэння пенсій). Такім чынам, мы спадзяёмся, што прынамсі адзін раз сёлета працоўныя пенсіі ўсё ж узрастуць.

Што да службы ў Афганістане пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку ў складзе дзеючай арміі падчас баявых дзеянняў, то месяц такой службы сапраўды залічваецца за тры месяцы стажу пры наяўнасці пацвярджальных дакументаў з ваенкамата. А вось наконт цяперашніх часовых працы і заробкаў трэба мець на ўвазе: яны пойдуць у стаж толькі пры ўмове выплаты ўзносаў на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне.

☎ — Маё прозвішча Нікіфараў, тэлефаную з Мінска. З такім пытаннем: чаму пенсіі ў Расіі павялічваюцца, а ў Беларусі — не?

— Варта заўважыць, што нягледзячы на больш частае павышэнне пенсій, расіяне ўсё адно не могуць дагнаць нас. У Беларусі суадносіны сярэдняй пенсіі да сярэдняй зарплаты не апускаюцца ніжэй за адзнаку ў 43 %, тады як гэты паказчык у Расіі — 28 %. У нас сярэдняя мінімальная пенсія па ўзросце ўжо даўно перавышае бюджэт пражытковага мінімуму пенсіянера, тады як расіяне да гэтага толькі імкнуцца. Словам, спасылкі на суседзяў слушныя не заўсёды. Хоць мы і згодныя, што задаволеных узроўнем сваіх пенсій у нашай краіне таксама няшмат. Таму трэба паўтарыцца: прынамсі адно павышэнне працоўных пенсій сёлета магчыма.

☎ — Працую стаматолагам. Прычым з 2004 года — на 0,75 стаўкі, таму для атрымання права на датэрміновую пенсію не хапае года спецыяльнага стажу. Ці магу я дапрацаваць неабходны спецыяльны стаж прапарцыянальна адпрацаванаму часу, калі буду выконваць абавязкі стаматолага поўны дзень, але няпоўны месяц? Скажам, калі буду працаваць па 8 гадзін, але не кожны дзень?

Галіна Ільінічна Русецкая, *Клічаўскі раён*

— Адной з умоў для заліку работы ў спецыяльны стаж, які дае права на пенсію па выслузе гадоў (а з 1 студзеня гэтага года — у прафесійны стаж для мэтаў прафесійнага пенсійнага страхавання) з'яўляецца занятасць на пэўных пасадах на працягу поўнага працоўнага дня. Інакш кажучы — выкананне работы на поўную стаўку. Калі ж работнік заняты на няпоўную стаўку (на тыя ж 0,75 стаўкі), то такая работа ў спецыяльны (прафесійны) стаж залічана не будзе — незалежна ад яе графіка.

☎ — У якім узросце могуць пайсці на пенсію лабаранты клінічнай і біяхімічнай лабараторыі, дзе вызначана шкоднасць у 10 %? І колькі неабходна адпрацаваць гадоў у такой лабараторыі для атрымання права на датэрміновую пенсію?

Ю.А. Абраменка, *Віцебскі раён*

— Магчымасць датэрміновага пенсійнага забеспячэння лабарантаў залежыць ад многіх акалічнасцяў, напрыклад, у якой арганізацыі аховы здароўя яны працуюць і абслугоўваннем якіх хворых займаюцца. У залежнасці ад умоў занятасці лабарантам можа быць дадзена права на пенсію з асаблівымі ўмовамі працы або на пенсію па выслузе гадоў. На жаль, зрабіць выснову аб праве на датэрміновую пенсію без аналізу дакументаў аб працоўнай дзейнасці немагчыма. Таму з гэтым пытаннем лепш за ўсё звярнуцца ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства.

☎ — Турбуюць з Клецкага раёна, маё прозвішча Макаўчук. Цікава даведацца: ці прадугледжаны льготны парадак вылічэння стажу для ліквідатара аварыі на Чарнобыльскай АЭС, які ў 1987 годзе працаваў у 30-кіламетровай зоне?

— Работа па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС да 1 студзеня 1988 года залічваецца ў стаж з павелічэннем у 3, а пасля гэтай даты — у паўтара раза пры ўмове, што грамадзянін быў задзейнічаны непасрэдна на эксплуатацыі ЧАЭС і ў зоне эвакуацыі (адчужэння). 30-кіламетровая зона з'яўляецца менавіта такой зонай. Аднак для вылічэння льготнага стажу неабходна мець пацвярджальныя дакументы.

☎ — У майго брата, інваліда II групы, памерла жонка. Ці можа брат, які застаўся адзін, разлічваць на якую-небудзь дапамогу, апроч дапамогі на пахаванне, каб справіць 40 дзён, паставіць помнік, агароджу і г.д. Ён ужо звяртаўся ў раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, але атрымаў адмову — маўляў, што мае пенсію ў 470 тыс. рублёў. Гэта адмова правільная?

Ніна Мікалаеўна Кастрама, *г. Мінск*

— Разлічваць на атрыманне дадатковай матэрыяльнай падтрымкі тут складана, тая ж адрасная сацыяльная дапамога прызначаецца ў выпадку, калі даход не перавышае бюджэту пражытковага мінімуму, ці на сёння — 243 570 рублёў у месяц. Адно, што ў такой сітуацыі брат можа паспрабаваць звярнуцца па аднаразовую матэрыяльную дапамогу за кошт Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.

☎ — У 1984 годзе мой брат, Марук Уладзімір Апанасавіч, пражываў ў Маскве і там атрымаў вытворчую траўму левай рукі. У выніку яму вызначылі 25 % страты працаздольнасці пажыццёва і прызначылі пенсію па інваліднасці. Да 1991 года брат, які затым пераехаў у Капыльскі раён, такую пенсію сапраўды атрымліваў. Аднак потым выплаты спыніліся — з тлумачэннем, маўляў, іх павінна рабіць Расія. Ці правільна гэта? Ці павінны плаціць пенсію брату ў Беларусі і, калі так, то ці можа ён запатрабаваць вяртання сваіх грошай за 1991—2009 гады?

Валянціна Апанасаўна, *Капыльскі раён*

— Ёсць пагадненне, паводле якога выплату кампенсацыі за страту здароўя насамрэч робіць тая краіна, на тэрыторыі якой чалавек атрымаў працоўнае знявечанне. Таму ніякіх парушэнняў тут няма. Разам з тым, калі ў Беларусі брату вызначана група інваліднасці, то можа быць прызначана пенсія па інваліднасці. Да таго ж незалежна ад вызначэння групы ён можа звярнуцца па адрасную сацыяльную дапамогу.

І яшчэ адзін нюанс. Калі брату споўніцца 60 гадоў, то яму будзе прызначана пенсія па ўзросце.

☎ — Наколькі я ведаю, у стаж можа ўключацца час школьнай практыкі ў калгасе ў 1980-х гадах. Аднак узнікла такая сітуацыя: гаспадарка, дзе я працавала, некалькі гадоў таму спыніла сваё існаванне і была далучана да іншай. У сувязі з гэтым, ці магу я звярнуцца па даведку аб «школьным» стажы ўжо цяпер? І ці будзе такая даведка сапраўдная праз 9 гадоў?

Людміла Фёдараўна Абраменка, *г. Мінск*

— Калі даведкі аб вашай рабоце ёсць, то іх можна ўзяць цяпер. Прычым гэты дакумент праз 9 гадоў будзе сапраўдным.

☎ — Некалькі гадоў таму мне, як адзінокай пенсіянерцы і інваліду II групы, патэлефанавалі з тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання і паведамілі, што паставілі на спецыяльны ўлік. Але з таго часу супрацоўнікі цэнтра аб сабе ніякім чынам не нагадваюць. Ці павінны яны цікавіцца тым, як я жыву? І ці магу я, як чалавек пасля аперацыі ў сувязі з пераломам, звярнуцца ў цэнтр па матэрыяльную дапамогу?

Людміла Георгіеўна, *г. Мінск*

— Калі супрацоўнікі тэрытарыяльнага цэнтра не звяртаюцца, то лепш за ўсё не чакаць, а звярнуцца са сваімі праблемамі самой. У прыватнасці, гаворка можа ісці аб сацыяльным абслугоўванні дома: паколькі вы жывяце адна, то пры пенсіі, вышэйшай за бюджэт пражытковага мінімуму, сацыяльны работнік будзе прыходзіць на ўмовах 50-працэнтнай аплаты, а пры пенсіі, ніжэйшай за БПМ, — бясплатна.

Пры гэтым у сувязі з пераломам можна звярнуцца ў той жа тэрытарыяльны цэнтр па матэрыяльную дапамогу з Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.

☎ — Мяне завуць Надзея Аляксееўна, а тэлефаную з такой нагоды. Да апошняга часу я атрымлівала пенсію па страце карміцеля на дзяцей ва ўзросце 18 і 16 гадоў. Аднак пасля паступлення старэйшага сына на ваенны факультэт БДУ выплату пенсіі яму спынілі. Ці правільна гэта? Бо, нягледзячы на «ваенны» факультэт, сын усё ж навучаецца ў грамадзянскай навучальнай установе...

— Пенсія па страце карміцеля на дзяцей ва ўзросце ад 18 да 23 гадоў выплачваецца ў перыяд навучання ва ўстановах адукацыі, апроч навучання ва ўстановах адукацыі, дзе маладыя людзі знаходзяцца на вайсковай службе. У сваю ж чаргу студэнты ваеннага факультэта праходзяць ваенную службу, адпаведна, пенсія ім не выплачваецца.

☎ — Ці павінны аказваць матэрыяльную дапамогу па месцы працы ў сувязі са смерцю блізкага сваяка — роднага брата?

Аляксандр Браніслававіч Ліпніцкі, *Стаўбцоўскі раён*

— Адказ на гэта пытанне залежыць ад таго, ці ёсць адпаведны запіс у калектыўным дагаворы вашай арганізацыі, словам, пацікаўцеся зместам гэтага дакумента ў старшыні прафкама. Прычым варта заўважыць: як правіла, аказанне матэрыяльнай дапамогі ў сувязі са смерцю блізкіх сваякоў у калдагаворах сапраўды прадугледжваецца.

☎ — Патлумачце, калі ласка, пры вылічэнні індывідуальнага каэфіцыента свой заробак трэба дзяліць на сярэднюю зарплату работнікаў або на сярэднюю зарплату рабочых і служачых? І другое пытанне. Ці плануюцца сёлета змяненні ўмоў выплаты пенсій працуючым пенсіянерам? І калі плануюцца, то якія?

Мікалай Валянцінавіч, *г. Гомель*

— Індывідуальны каэфіцыент заробку разлічваецца зыходзячы з сярэдняй зарплаты работнікаў. Што да другога пытання, то трэба адзначыць: сёлета змяненні ўмоў выплат пенсій працуючым пенсіянерам не плануецца.

☎ — Пры стажы 12 гадоў я, як інвалід II групы з дзяцінства, атрымліваю вельмі маленькую пенсію — усяго 189 тысяч. Адкуль узялася такая сума? І ці будзе павышацца мая пенсія надалей, скажам, у сувязі з павелічэннем стажу?

Таццяна Аляксандраўна, *Мазырскі раён*

— Варта паўтарыцца, што памер пенсіі залежыць ад велічыні заробку да яе прызначэння, і невялікія пенсіі па інваліднасці II групы, як правіла, звязаныя менавіта з невысокім узроўнем аплаты працы падчас работы. Пры гэтым заканадаўства прадугледжвае магчымасць перараслiку пенсіі па інваліднасці, калі пенсіянер адпрацаваў 24 месяцы з больш высокім заробкам. У гэтым выпадку павялічваецца і стаж. Разам з тым, трэба адзначыць наступнае. Памер пенсіі па інваліднасці II групы складае 65 % заробку, што прымаецца для яе вылічэння. Для атрымання пенсіі па ўзросце ў такім жа памеры жанчыне трэба мець 30 гадоў працоўнага стажу. Таму для павелічэння памеру пенсіі па інваліднасці за працоўны стаж працягласць гэтага стажу ў жанчыны-інваліда II групы павінна складаць не менш за 31 год.

☎ — Як маці дзіця-інваліда выйшла на пенсію ў 50 гадоў. Аднак зараз узнікла сітуацыя: у сувязі з пераводам сярэдняй школы ў статус базавай мяне могуць звольніць. Ці правільна гэта?

І другое пытанне. Разам з дзіцем-інвалідам, які мае ўзрост 13 гадоў і другую ступень страты здароўя, часта ездзім у рэабілітацыйны цэнтр у Мінск. Ці ёсць у нас ільготы на праезд? І калі ёсць, то якія дакументы для гэтага патрэбныя?

Вольга Фёдараўна Садоўская, *Крупскі раён*

— Пакінуць вас на цяперашнім месцы або звольніць — гэта рашэнне працадаўцы. Прынамсі, калі няма адпаведных гарантый у калдагаворы, якіх-небудзь пераваг пры працягу кантрактаў наяўнасць дзіця-інваліда не дае.

І наконт праезду. Ільготы на праезд у гарадскім і прыгарадным транспарце вызначаныя як дзіцяці-інваліду, так і асобе, што яго суправаджае пры накіраванні ў медыцынскую ўстанову. Адпаведна, каб карыстацца льготай, вы павінны мець такое накіраванне медыкаў.

☎ — Ці абавязаны працягнуць са мной кантракт у выпадку, калі пасля дасягнення ўзросту 55 гадоў я адмоўлюся атрымліваць пенсію?

Вера Паўлаўна Шаплыка, *Любанскі раён*

— Добраахвотная адмова ад атрымання пенсіі ніякіх гарантый па працягу працоўнага кантракта не дае. Але тут да месца ўзгадаць наступнае. У выпадку добраахвотнай часовай адмовы ад

ГАЛАСУЕМ ЗА СВАЕ ЦУДЫ ПРЫРОДЫ!

Нацыянальны парк «Белавежская пушча» займае чацвёртае месца па выніках галасавання (група Е — лясы, нацыянальныя паркі, запаведнікі) у конкурсе цудаў прыроды, арганізаваным фондам New7Wonders Foundation, створаным групай энтузіястаў.

У першым конкурсе, што стартаваў у 2005 годзе, новымі цудамі свету былі прызнаныя творы рук чалавека — індыйскі Тадж-Махал, рымскі Калізей, Вялікая Кітайская сцяна і іншыя. Конкурс цудаў прыроды быў абвешчаны фондам на пачатку гэтага года. У ім могуць удзельнічаць прыродныя аб'екты, размеркаваныя па сямі катэгорыях — ландшафты, астравы, горныя ўтварэнні, вулканы, нацыянальныя паркі, лясы, марскія ўтварэнні.

Беларусь вылучае на гэты конкурс возера Нарач, Белавежскую пушчу, раку Днепр. Паводле апошняй інфармацыі возера Нарач замацавалася на 38-й пазіцыі ў групе F, якая ўключае ў сябе рэкі, азёры, вадаспады. У гэтай жа групе з 37-й да 31-й пазіцыі падняўся Днепр. Белавежская пушча ў групе Е паднялася з 17-га на 6-е месца.

Да 7 ліпеня эксперты фонду па выніках галасавання павінны вызначыць аб'екты, што будуць удзельнічаць у фінале. Фінальнае галасаванне завершыцца ў 2011 годзе абвяшчэннем сямі прыродных цудаў свету. Аддаць свой голас за «прадстаўніка» Беларусі яшчэ не позна, гэта можна зрабіць на сайце www.new7wonders.com.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Урокі гісторыі ў віртуальнай прасторы

Напярэдадні святкавання 65-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і юбілею стратэгічнай аперацыі «Багратыён» Міністэрства адукацыі сумесна з музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Беларускім грамадскім аб'яднаннем ветэранаў і СТАА «Гейм стрым» аб'явілі аб правядзенні рэспубліканскага конкурсу па камп'ютарнай гульні-стратэгіі «Аперацыя «Багратыён». Гэта аперацыя з'яўляецца адной з самых складаных і яркіх аперацый Другой сусветнай вайны, бліскуча праведзенай як на стадыі яе распрацоўкі, так і на стадыі ажыццяўлення. Але для беларусаў унікальнасць аперацыі «Багратыён» заключаецца перш за ўсё ў тым, што яна прынесла ім доўгачаканае вызваленне ад акупацыі.

З улікам вялікай цікавасці моладзі да камп'ютарных тэхналогій, а таксама з мэтай папярэджвання фальсіфікацыі ходу і вынікаў Другой сусветнай вайны і ролі ў Перамозе Савецкай Арміі было вырашана стварыць камп'ютарную гульню-стратэгію, якая магла б захапіць маладых людзей і адначасова прыцягнуць моладзь да вывучэння ваеннай гісторыі. Ужо першы вопыт дэманстрацыі трэйлера гульні дзіцячай аўдыторыі паказаў, што абсалютная большасць падлеткаў хочуць і далей вывучаць родную гісторыю з дапамогай аўдыёвізуальнага метаду пазнання новага матэрыялу.

Рэалістычнасць дзеянняў, якія адбываюцца на віртуальнай гульнявой прасторы, іх натуралізм, маштабнасць, а таксама розныя тэхнічныя хітрыкі не могуць пакінуць абыякавымі ні аднаго аматара ваеннай стратэгіі. Гэтая гульня захоплівае літаральна з першых хвілін. Паколькі ў аперацыі былі задзейнічаны ўсе роды войскаў, то і ў гульні яны таксама прысутнічаюць. Да таго ж у гульні задзейнічаны да 2 тысяч адзінак тэхнікі і асабовага складу. Удзельніку гульні зусім не пашкодзіць веданне ваеннай тэхнікі і асноў кіравання боем. Напрыклад, неабходна ведаць, на якой адлегласці паражае цэлі «кацюша», якія сродкі прымяняюцца для арганізацыі супрацьтанкавай абароны, якую пазіцыю і дзе займаюць асобныя часці пры наступленні і гэтак далей. Адным словам, гэта не звычайная «стралялка», а высокаінтэлектуальная гульня.

Рэспубліканскі конкурс па камп'ютарнай гульні-стратэгіі «Аперацыя «Багратыён» пройдзе ў тры этапы. Ва ўсіх абласцях і ў Мінску былі створаны аргкамітэты па яго правядзенні. А ў Рэспубліканскім цэнтры тэхнічнай творчасці навучэнцаў для арганізатараў гульні быў арганізаваны навучальны семінар.

Адборачныя раённыя туры ўжо прайшлі, а 7 чэрвеня стартавалі абласныя туры. У Віцебску абласныя спаборніцтвы пройдуць 16—17 чэрвеня на базе абласнога аб'яднання па арганізацыі пазашкольнай работы з дзецьмі і падлеткамі, у Гомелі — 17—18 чэрвеня на базе абласнога цэнтра тэхнічнай творчасці навучэнцаў, у Гродне — 16—18 чэрвеня на базе камп'ютарнага клуба «Юлан», у Мінскай вобласці — на базе Мінскага абласнога інстытута развіцця і адукацыі 16—18 чэрвеня і ў Мінску — 19 чэрвеня на базе Мінскага гарадскога палаца дзяцей і моладзі. На абласныя фіналы запрошаны ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны і прадстаўнікі Узброеных Сілаў Беларусі. А фінал рэспубліканскага конкурсу адбудзецца ў Мінску ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны напрыканцы чэрвеня.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСА ПО ВЫБОРУ ДРУГИХ, КРОМЕ ГОСУДАРСТВА, УЧРЕДИТЕЛЕЙ ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА

1. Полное наименование организации: республиканское унитарное производственное предприятие «Завод железобетонных изделий» г. Молодечно.

2. Сокращенное наименование организации: РУПП «Завод железобетонных изделий» г. Молодечно.

3. Основной вид деятельности: производство сборных железобетонных и бетонных конструкций и изделий.

4. Предполагаемый размер уставного фонда: 9 178 000 000 белорусских рублей.

5. Условия конкурса:

5.1. внесение вклада в уставной фонд создаваемого открытого акционерного общества в размере не менее 50 % уставного фонда;

5.2. сохранение основного вида деятельности предприятия: производство сборных железобетонных изделий и бетонных конструкций, в течение 5 лет, с момента создания акционерного общества;

5.3. сохранение темпов развития предприятия в течение 5 лет, с момента создания акционерного общества, не ниже доведенных Минстройархитектуры;

5.4. сохранение рабочих мест в течение 5 лет с момента создания акционерного общества, обеспечение социальных гарантий в соответствии с коллективным договором, действующим на предприятии на момент акционирования;

5.5. сохранение уровня тарифной ставки первого разряда не ниже действующей на предприятии по состоянию на 01.01.2009 г.

6. Срок подачи заявления на участие в конкурсе с прилагаемыми документами в орган управления: в течение 30 дней с момента опубликования извещения о проведении конкурса.

7. Перечень документов, подаваемых для участия в конкурсе:

7.1. заявление на участие в конкурсе по установленной форме согласно инструкции «О порядке выбора других, кроме государства, учредителей Открытых акционерных обществ, создаваемых в процессе приватизации республиканской собственности», утвержденной Постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь 19.12.2006 № 61;

7.2. инвестиционные предложения, соответствующие условиям конкурса;

7.3. заключение аудитора о финансовом состоянии инвестора за предшествующий год;

7.4. нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельство о государственной регистрации, доверенность представителя юридического лица (кроме случая, когда юридическое лицо представляет его руководитель).

8. Адрес, по которому осуществляется прием заявлений на участие в конкурсе с прилагаемыми документами: г. Минск, ул. Мясникова, 39, кабинет 524.

9. Дата, время и место проведения конкурса: 15.07.2009 в 10.00, г. Минск, ул. Мясникова, 39, кабинет 407.

10. Организатор конкурса: Министерство архитектуры и строительства РБ.

11. Номера контактных телефонов организации и организатора конкурса: +375295614578, 8017 2265434.

УНП 600136965

Лінія жыцця

ГАДЗІНА СЛАВЫ

...Пра такога мужа — спадарожніка жыцця — усе дзяўчаты-жанчыны мараць. У Настассі ён быў: бясконца ў яе закаханы, прыгожы, разумны, як вол, цягавіты (і такі ж спакойны), усмешлівы, добры...

Яна сустрэла яго ў няпоўныя 19 і жыла з той пары, як за каменнай сцяной — ні пра што галава не балела. Кшталту, трэба табе новыя боты і да іх паліто? Хай большай бяды не будзе — купім. Павінна быць асобнае жытло? Ну, безумоўна ж, — размяняемся з бацькамі, грошы ёсць, даплацім... Стамілася і хочаш адпачыць? Добра, паедзем: за мяжу дык за мяжу. Ногі на завод не нясуць? Што ж — звальняйся, калі так. Іншую працу не можаш знайсці? Дык, можа, тады і не шукай — сядзі сабе дома? Лепей было б на дачы? А яно і сапраўды — можна збудаваць. І сабаку хочаш завесці? Ну, чаму б і не?..

З-за сабакі ўсё і ўсчалося, бо яго — вялікага, прыгожага, ва ўсіх адносінах дарагога лабрадора — кожную раніцу на вуліцу выводзіў муж, жонка спала яшчэ. А па вечарах яны гулялі разам. У Насты тут цэлы рытуал быў, свайго роду — гадзіна славы: яна рабіла прычоску, доўга і старанна малявала святочны твар, прыбіралася і поруч з мужам не ішла — хутчэй, несла сябе: бездакорна апранутую і дагледжаную, прыгожую, багатую. Глядзіце, маўляў...

На іх, усіх траіх, і сапраўды многія азіраліся, глядзелі. Мужчыны — ну, безумоўна ж, — болей на яе і з пажадай. Жанчыны і дзяўчаты — на мужа, з цікавасцю, на іх разам — жывуць жа людзі! — з непрыхаванай зайздрасцю. Што для Насты было свайго роду допінгам, свайго роду стымулам, каб сачыць за сабой (яшчэ больш... Калі гэта магчыма), каб мяняць прычоскі і строі — каб уражваць.

У пагодныя, светлыя вечары ёй заўсёды гэта ўдавалася — лёгка. І настрой тады быў адпаведным — выдатным, а вось у непагадзь...

Непагадзь Наста не любіла, ніколі. Таму варта было хоць крыху сапсавацца надвор'ю, яна тут жа званіла мужу, казала, што з хаты выходзіць не збіраецца, а значыць, сёння ён павінен прыйсці як мага раней (працаваў ён шмат і да вельмі позняга...) — самому выгуляць сабаку.

У іншыя дні ён, як правіла, адразу згаджаўся, у той... Ну не выпадала — ніяк! І жонцы ж ён гаварыў, яшчэ задоўга, што ў галоўнай бухгалтаркі, яго правай рукі — юбілей, што яна «самых-самых сваіх» збірае ў кавярні па суседстве з фірмай... І калі б іх там восемдзесят чалавек ішло, ён бы неяк мог, відаць, павіншаваць імянінніцу і па-англійску змыцца, а калі толькі восем... Ну няёмка ж!

— А ты пастарайся! — загадала жонка.

Ён дрэнна ўяўляў сабе, як гэта можна зрабіць і ўсё ж не адмовіў, нават паабяцаў — «пры першай жа магчымасці».

Аднак яна, тая магчымасць, відаць, не з'яўлялася. Таму недзе праз гадзіну Наста пазваніла мужу яшчэ раз: нагадала, што на дварэ дождж, а сабака — дома і чакае.

— Ну, вінаваты, — пакаянна зацягнуў ён, — але тут такая кампанія... Мы гэтак файна сядзім!.. Ну, паўгадзінкі яшчэ, добра?!

Сабака, быццам пачуўшы просьбу, з разуменнем аднёс павадок, спакойна лёг на пасцілку. Наста паглядзела на гадзіннік — засякла час: ні праз 20 хвілін, ні нават праз 30 муж не прыехаў. А сабаку было шкада. Таму яна, не на жарт разэлаваўшыся, ускінула на плечы новую белую курцічку, уссунула зноў жа новыя (старое ці дакладней, трохі ношанае яна адразу ж выкідала) красоўкі, схапіла парасон і (чаго яна не рабіла ніколі ў жыцці!) без прычоскі, без макіяжу ступіла за парог кватэры.

У пад'ездзе — на шчасце (позна і дождж) — не сустрэла нікога. У двары — сабака стаў настойліва рваць павадок, цягнуць яе на прывычную пустку для выгулу. Але яна туды не пайшла (не хапала заспець там некага з «сабачнікаў»!) — скіравала ў іншы бок, супрацьлеглы, дзе была якраз мужава фірма, дзе была... кавярня.

Здалёк убачыла, як з вокнаў яе на халодны змрочны двор падае святло, здалёк з прыадкрытай фрамугі пачула музыку і смех — жаночы, а ўжо залівісты, звонкі... У перамешку (яна не зблытала, не!) з мужавым.

«Гэта ж з кім ён гэтак буркуе? Гэта ж з кім яму, паскудніку, цяпер файна так?!» — «кактэйль» з цікавасці, крыўды і злосці неяк сам, між жончынай волі, прывязаў да дрэва сабаку, пэцкаючы рукі і вопратку, узагнаў на вузкі выступ у падмурку: Наста зірнула ў акно. Кампанія ў зале і насамрэч была адна, сядзела, лічы, у цэнтры і складалася пераважна з жанчын. Але гэта было не важна. Важна, што поруч з мужам, яе мужам, у той час, як яна, законная жонка, гібела ад холаду і мясіла гразь, сядзела не толькі юбілярка і «правая рука», а дзяўчо — доўгавалосае, рыжае, недаравальна маладое, недаравальна вясёлае.

Не помнячы сябе ад злосці, Наста спаўзла на зямлю, не разбіраючы дарогі, даляцела дадому, не бачачы свету ад слёз, сцягнула з антрэсоляў дарожную сумку — паскідала мужавы рэчы...

Ён у гэты час ужо ціха адчыняў дзверы.

Па той бок парога яшчэ вуха злавіла знаёмы адчайны плач, па гэты — убачыў брудны жончын абутак і куртку, «скамплектаваную» сумку... Тут жа, у вітальні гладзячы сабаку, хацеў успомніць, у каторы ж раз яна стаіць ля дзвярэй? І не змог, бо разы тры-чатыры на год жонка абавязкова знаходзіла да чаго б прычапіцца і зрабіць трагедыю. Да міліцыі тады, слава Госпаду, справа не даходзіла, а вось да біцця талерак — не раз...

Таму ён ведаў ужо, што цяпер вось жонцы марна нешта казаць і тлумачыць, марна прасіць прабачэння... Зараз — трэба ісці.

Але ж пад поўнач ужо... Куды? Да некага з сяброў? Спяць людзі. Да старых бацькоў? І тым больш... Ды і сорамна. Тады на фірму? У гараж?

Ключы ад яго віселі на звычным месцы. Лекаў у сумцы таксама не было — узяў сам, абмыў сабаку лапы, пагладзіў, забраў сумку — сышоў...

Пакрыўджаная жонка з паўгадзіны яшчэ паплакала, але ж, засынаючы, ведала, што гэта — да ранічкі: раніцай (ну безумоўна ж!) ён з'явіцца, выведзе сабаку і вернецца — як заўжды ў такіх выпадках — з букетам белых руж, з нейкім падарункам. Прынясе ёй у ложак, аддасць і будзе доўга, як малую, гладзіць яе па галаве, пяшчотна ўсміхацца і казаць, што ёй абавязкова трэба нечым заняцца — меней глядзець серыялаў, а то з глузду з'едзе зусім: прынамсі, знайшла да каго раўнаваць — тое ж дзяўчо яму дачкой магло быць.

У гэтым месцы яна і наогул заліецца слязамі, бо не хацела ж спачатку ні дачкі, ні сына, казала, што трэба свет паглядзець, на грошы толкам узбіцца, а потым не даваў ім Бог — анікога, нават за грошы... Але ж яна — марыла. І рабіла, здаецца, усё!..

Муж, ну зразумела ж, павінен помніць гэта! І таму з пяшчотаю будзе выціраць ёй слёзы, казаць, што можна ж жыць і вось так, што ён па-ранейшаму кахае яе, што ўдваіх яны 20 з гакам гадоў — хай кароткіх, але ж вельмі шчаслівых, што памяць пра іх ён ніколі не змяняе (а тым больш на нейкія сумнеўныя радасці)... І не хоча нікуды ісці, не хоча мяняць жыццё... Таму зараз ён нешта прыгатуе, і яны разам паснедаюць, а вечарам, калі яна не супраць, паедуць некуды ў рэстаран (куды яна скажа), каб выпіць міравую...

Днём, ну напэўна ж, ужо не будзе дождж. Таму яна сходзіць у салон да сваіх дзяўчат —цырульніцы-манікюршы-касметычкі — зробіць прычоску і макіяж, намалюе прыгожыя пазногці, замовіць столік... Апране?.. Апране, відаць, чорную вячэрнюю сукенку... Не, лепш ружовую... Новую... Абуе...

Раніца таго аўторка прайшла дома, у прыемных марах, але... без мужа (сабаку давялося выгульваць самой), дзень — у салоне прыгажосці, у той вечар — зусім непатрэбнай ёй, нават на «гадзіну славы», бо муж прыйшоў позна і на здзіў, без кветак. Пасадзіў яе за кухонным сталом насупраць і сказаў, што стаміўся... вяртацца. Таму кватэра з усім нажытым дабром застаецца ёй, дача таксама. Плюс штомесяц ён будзе плаціць ёй «пенсію»... «па страце кармільца» — 500 баксаў... Павінна ж хапіць?.. А сабаку ён прасіў бы аддаць.

Знямеўшы ад нечаканасці, Наста будзе маўчаць, потым чапляцца — хоць за яго, за сабаку, потым крычаць — мужу, а заадно і ці не ўсім суседзям — што ён мярзотнік, што ён паскуднік, якіх свет не бачыў, што ён здраднік і нягоднік, што ён ніколі не кахаў яе (бо кахаючы — не пакідаюць), што ён ніколі не быў добрым (бо добры б дараваў... Нават вінаватай... А яна ж перад ім — ні ў чым!..), што ён ніколі не быў бы багатым — гэта яна стварыла яму ўмовы, што ён ніколі не быў разумным (бо разумны прымусіў бы яе вучыцца, атрымаць хоць нейкую, але спецыяльнасць і мець работу, сяброў...), што ён не мужчына (бо яны ніколі не пакідаюць жанчын у бядзе: без будучага — каму яна патрэбна, такая, у свае 40 з вялікім «хвастом»?, без сапраўднага (толку з гэтай кватэры, калі ў ёй нікога апроч сабакі? І толку з дачы, калі яна не ўмее ездзіць туды на аўтобусе?)...

А яшчэ — ён ніколі не пакінуў бы яе... без мінулага.

У Насты любімы занятак некалі быў: з фруктамі, з келіхам любімага віна сесці на канапу, уключыць па тэлевізары «самаробнае» кіно, і такім чынам вярнуцца, перанесціся ў дарагія гатэлі на берагах Чорнага, Балтыйскага ці Чырвонага мораў, дзе яны жылі, на пляжы і ў рэстараны, куды разам хадзілі, на прыгажэнныя вуліцы, па якіх гулялі, і ў крамы, дзе купляліся ўсё... Нават на лецішча, дзе муж збудаваў ёй сапраўдны церам.

Бачыць усё гэта цяпер яна не магла. Бо там, на экране, ці не ў кожным кадры, бачны, нябачны, прысутнічаў ён — нязменны спадарожнік жыцця — прыгожы, разумны, як вол цягавіты (і такі ж спакойны), усмешлівы, добры, закаханы...

Як здавалася ёй — бясконца.

Усе дзяўчаты-жанчыны мараць пра такіх. А яна — мела.

Валянціна ДОЎНАР.

ДАПАМОГІ НА ДЗЯЦЕЙ І ЗАНЯТАСЦЬ

Я вучуся на завочным аддзяленні ВНУ. Часова не працую. Знаходжуся на раннім тэрміне цяжарнасці. Хачу зарэгістравацца ў якасці беспрацоўнай у цэнтры занятасці насельніцтва. Ці зарэгіструюць мяне і на якія дапамогі ў сувязі з цяжарнасцю і родамі я магу разлічваць у выпадку, калі не працаўладкуюся да нараджэння дзіцяці? Калі я выконваю работы для арганізацыі па дагаворы падраду, то які ўплыў гэта можа зрабіць на магчымасць рэгістрацыі ў якасці беспрацоўнай і на атрыманне дапамог?

Надзея, *г. Гродна.*

Артыкулам 3 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь» вызначана, што не могуць быць зарэгістраваныя ў якасці беспрацоўных занятыя грамадзяне. Артыкулам 2 гэтага Закона да занятых грамадзян аднесены таксама грамадзяне, якія выконваюць работы ў юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў па грамадзянска-прававых дагаворах, прадметам якіх з'яўляецца выкананне работ (аказанне паслуг, стварэнне аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці); грамадзяне, якія вучацца на вочнай (дзённай) форме атрымання адукацыі ва ўстановах адукацыі. Такім чынам, калі вы вучыцеся на завочным аддзяленні ВНУ, то гэта не з'яўляецца перашкодай для рэгістрацыі ў якасці беспрацоўнай, а калі выконваеце работы па дагаворы падраду — то вы маеце крыніцу існавання і беспрацоўнай зарэгістраваны быць не можаце.

Законам Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» прадугледжаны віды дзяржаўных дапамог на дзяцей, парадак і ўмовы іх прызначэння.

Вы можаце атрымаць наступныя віды дапамог: па цяжарнасці і родах; у сувязі з нараджэннем дзіцяці (цяпер памер гэтай дапамогі пры нараджэнні першага дзіцяці складае 1 217 850 рублёў); дапамогу, якая прызначаецца жанчынам, якія сталі на ўлік у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці (цяпер складае 243 570 рублёў); па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў (без уліку надбавак складае цяпер 194 860 рублёў у месяц).

Прызначэнне і выплата дапамог ажыццяўляецца па месцы працы, вучобы (на дзённай форме навучання) маці, а калі яна не працуе і не вучыцца — па месцы працы або вучобы бацькі дзіцяці або іншай асобы, якая мае права на дзяржаўную дапамогу ў сувязі з выхаваннем дзіцяці або яго доглядам.

Асобам, якія выконваюць работы па грамадзянска-прававым дагаворы, асобам, якія зарэгістраваны ў якасці беспрацоўных, а таксама непрацуючым асобам дзяржаўныя дапамогі прызначаюцца камісіямі, якія ствараюцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, і выплачваюцца органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства.

Памер дапамог, акрамя дапамогі па цяжарнасці і родах, не залежыць ад таго, працуеце вы па працоўным дагаворы, па грамадзянска-прававым дагаворы падраду або не працуеце, зарэгістраваны ці не ў службе занятасці.

Дапамога па цяжарнасці і родах выплачваецца адначасова за перыяд з 30 тыдняў цяжарнасці працягласцю 126 каляндарных дзён, а ў выпадку цяжкіх родаў або нараджэння дваіх і болей дзяцей — 140 каляндарных дзён.

Жанчынам, якія зарэгістраваны ў якасці беспрацоўных, дапамога па цяжарнасці і родах прызначаецца і выплачваецца органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў памеры дапамогі па беспрацоўі за кожны каляндарны месяц, але не менш за мінімальны памер дапамогі па беспрацоўі і родах. Мінімальны памер гэтай дапамогі складае 50 працэнтаў найбольшай велічыні бюджэту пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, зацверджанага Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь за два апошнія кварталы, адносна кожнага месяца водпуску па цяжарнасці і родах.

Жанчынам, якія выконваюць работы па грамадзянска-прававым дагаворы, памер дапамогі па цяжарнасці і родах складае 100 працэнтаў сярэднядзённага ўзнагароджання па такім дагаворы, але не болей за 70 працэнтаў сумы абавязковых страхавых узносаў, выплачаных з узнагароджання, з якога вылічвалася дапамога, і не менш за мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах.

Жанчынам, якія не працуюць, дапамога па цяжарнасці і родах не прызначаецца і не выплачваецца, паколькі права на такую дапамогу ўзнікае пры ўмове выплаты абавязковых страхавых узносаў на сацыяльнае страхаванне. Але гэтым жанчынам дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў прызначаецца з дня нараджэння дзіцяці, у той час як іншым — з дня прадастаўлення водпуску па доглядзе дзіцяці да трох гадоў або дня, наступнага за днём заканчэння тэрміну, вызначанага лістком непрацаздольнасці.

УДАР «ПЯТКАЙ»

Нацыянальны майстар спорту Пётр Шклудаў з Наваполацка працягвае свой **аўтарскі конкурс-8 заданнем № 6**:



Белыя: a5, b6, f2, f6, g1, g7 (6). **Чорныя:** a7, b4, c3, d2, d4, e5, h2, h8 (8). Выйгрыш.

У якасці жа **бліца-47/2** прапануе аналагічную праблему:

Белыя: a1, a5, a7, b6, c7, d6, e7, f4, g1, h2, h4 (11). **Чорныя:** a3, b4, b8, c3, c5, d2, d4, d8, e5, f8 (10). Перамога белых.

У абедзьвюх камбінацыях усё вырашае цудоўны ўдар «пяткай».

А ў рамках **бліца-48/2** развяжыце 100-клетачную канструкцыю 8 на 8:



ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

Белыя: 16, 22, 23, 24, 29, 35, 40, 42 (8). **Чорныя:** 6, 7, 8, 12, 30, 31, 32, 39 (8). І тут белыя могуць «накаўтаваць» чорных тым жа ўдарам.

Тэрмін для адказаў — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».

НОВЫЯ ТВОРЫ

Па-за конкурсамі пазнаёмцеся з новымі творамі нацыянальнага майстра спорту з Пінска Аляксандра Кагоцькі, якія ён перадаў нам па электроннай пошце:

№ 1. Белыя: e3, e5, f4, g3, g5 (5). **Чорныя:** b6, c7, g7, h2, h6 (5).

Удар дамкі «абцасікам»: ef6, b8, a7, c1 (g3) e3x.

№ 2. Белыя: b6, c7, d4, g3, h2 (5). **Чорныя:** a5, a7, c5, d2, h4, h6 (6).

Сістэмны матыў: f4, g3, d8, e7x.

№ 3. Белыя: b2, c7, f4, g3, h4 (5). **Чорныя:** c3, d2, d4, f6, g7, h6 (6).

«Слупняк» на вялікай дарозе. Выкарастайце гэты прыём гульні самастойна. Таксама будзем рады вашым рашэнням.

ТРЭЦІ ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ

Ён праводзіцца па шашачнай кампазіцыі ў раздзеле «Малыя праблемы». Яны павінны быць без дамак у пачатковай расстаноўцы і адпавядаць суперправілам альбо майстарскім.

Калектыўныя творы не дапускаюцца, а таксама апублікаваныя ў друку або ў электронных сродках масавай інфармацыі (ці іх нязначае выпраўленне) і тыя, што ўдзельнічалі ў якім-небудзь спаборніцтве.

Прадугледжаны чатыры катэгорыі: A (суадносіны сіл бакоў 6x8, 7x8, 8x7, 8x8), тэма свабодная; B (ад 6x8, 7x8 (8x7) да 9x9, у тым ліку 7x9), тэма — заключны ўдар камбінацыі завяршаецца апазіцыяй дамак на любой дыяганалі дошкі; C (7x9, 8x9, 9x8 ці 9x9), тэма свабодная і D (ад 6x8, 7x8 (8x7) да 9x9, у тым ліку 7x9), тэма — не менш двух кампазіцыйных варыянтаў (уключаючы рэха-фіналы) у ходзе камбінацыі, а не ў эндшпілі.

Па кожнай катэгорыі ўдзельнік мае права выслаць не больш 2 кампазіцый да 15 жніўня 2009 года на адрас каардынатара Міленкі Лепшыча (Харватыя): Miljenko Lepsic V. Becica 7, 51000 Rijeka Croatia.

Індывідуальны вынік удзельніка будзе вызначацца па суме яго пяці лепшых выступленняў, незалежна ад катэгорыі. Пераможцы і прызёры ўзнагароджваюцца залатымі, сярэбранымі і бронзавымі медалямі адпаведна і грашовымі прэміямі.

У склад судзейскай калегіі ўваходзяць па адпаведнай прадстаўніку з Францыі, Літвы, Украіны, Расіі і ад Беларусі — вядучы звяздоўскай рубрыкі «Шашкі».

ЗАБІЎ, ЗАКАПАЎ...

40-гадовы сын разам з 75-гадовым бацькам добра выпілі і, як водзіцца, пачалі высвятляць адносіны. Маладзейшы збіў старэйшага, у выніку той і памёр. Потым было пахаванне: сын закапаў бацьку на могілках вёскі Забярэжніца Лельчыцкага раёна ў прысутнасці мясцовых жыхароў. А праз чатыры дні цела даставалі ў прысутнасці міліцыі. Па папярэднім заключэнні, смерць наступіла з-за множных пераломаў рабрын і разрыву лёгкіх. Сын дае паказанні ў ізалятары часовага ўтрымання.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

НАПАДЫ НАРКАМАНАЎ

Пяць гамяльчан, якія разам здзяйснялі разбойныя напады на кватэры грамадзян, затрыманы ў Гомелі. Група мела абрэз паляўнічай стрэльбы 16-га калібру і з яго дапамогай прымушала развітвацца людзей з каштоўнасцямі. На сёння дакладна вядома, што злачынцы здзейснілі два такія напады — у вёсцы Чырвонае Гомельскага раёна і ў Савецкім раёне абласнога цэнтра, у выніку чаго пазбавілі людзей грошай (1,5 мільёна рублёў), трох мабільных тэлефонаў і банкаўскай карткі. У выніку аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў былі затрыманы двое раней судзімых гамяльчаніны 24 і 25 гадоў, а таксама трое не судзімых раней маладых людзей. Усе яны маюць залежнасць ад наркотыкаў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЗА ЎСІМ ТРЭБА ВОКА

Жанчына, якая знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску, на выгане каля пас. Мухавец (Брэсцкі раён) прывязала казу. Але той не давялося паскубці траўкі — толькі гаспадыня адышла ад жывёліны, як казу тут жа скралі.

Сышчыкі па гарачых слядах выйшлі на злодзея — жыхара в. Прыборава, якога і затрымалі.

ГОЛАД ДАНЯЎ?

У Івацэвічах на пенсіянера напалі двое п'яных мужчын, якім няма і трыццаці. Яны адабралі ў старога сумку з прадуктамі і 19 тысяч рублёў.

А ў вёсцы Вялікая Лотва Лявхавіцкага раёна таксама абрабавалі пенсіянера. Залезлі ў хату і вынеслі прадукты. Усе рабаўнікі затрыманы — яны да гэтага ўжо пабывалі ў турме.

ПАЕЛІ І ЗАСМАЛІЛІ

Па вуліцы Леніна ў Драгічыне нехта адагнуў на гандлёвым павільёне краты і выкраў прадукты ды цыгарэты.

Сышчыкі выйшлі на трох падлеткаў: адзін з іх ліцэіст, другі — вучань сярэдняй школы, а трэці — не вучыцца і не працуе.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Галіна Каржанеўская, калі коратка, — паэтка. Але ці можна ў адно слова сказаць усё пра творцу. Пачынала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў Плешчаніцах. Працавала рэдактарам літаратурна-драматычнай рэдакцыі Беларускага тэлебачання, карэспандэнтам і загадчыкам аддзела крытыкі газеты «Літаратура і мастацтва».

Настаўніца, паэт, журналіст, крытык, а цяпер перад вамі выступае яшчэ і ў якасці празаіка, з апавяданнем, у якім, на маю думку, выразна адчуваюцца яе адносіны да жыцця і святло душы паэта.

Віктар КАЗЬКО.



«Усё, я паміраю», — сказаў ён, перастуліўшы парог. Скінуў з плеч цяжкую зімовую куртку, але павесіць не меў сілы. Кепска стала яму ў аўтобусе, па дарозе на Барысаў. Адклаў справы, дзеля якіх выбраўся ў дарогу, — і да мяне. А да каго яшчэ, калі ў яго ні жонкі, ні дзяцей не завялося за 50 з лішнім гадоў?

«Мне так дрэнна, так дрэнна», — стагнаў ён, калі я паклала яго ў ложак. На белым, як папера, тварыступілі кропелькі поту. «Хуткая», дзякуй Богу, не запазнілася; дакладней — кардыялагічная брыгада, яна і распазнала інфаркт.

Здароўе сваё ён падарваў даўно. І тады, калі атрымліваў другую адукацыю — начамі карпеў над падручнікамі, каб падняцца ні свет ні зара ды ехаць у далёкую вясковую школу весці ўрокі. І калі ставіў над сабой эксперыменты з алкаголем і наркотыкамі — не проста ўжываў, а назіраў, што які дае эфект, з чаго лягчэй, з чаго цяжэй выходзіць і з якімі наступствамі. Псіхолаг жа, а не проста чалавек з дрэннымі звычкамі!.. Цяжка перанёс ён і разгромную рэцэнзію на свой першы паэтычны рукапіс. Святая прастата! Ён умудрыўся ўставіць у змест вершы, у якіх ганьбіў выдавецкіх рэдактараў-п'яніц. (Іх не аднаму яму даводзілася частаваць і паіць, каб паскорыць выхад кніжкі.) Рэакцыя была адпаведнай... Тры аперацыі на працягу аднаго года таксама моцы не далі.

А найбольш, думаю, яго падкасіла гісторыя з малдаванамі. Прыбіўся ў сяло адна валацужная сям'я. Волька, малдаванка, з 10-гадовай дачкой, і Коля, беларус, былы прапаршчык, які адседзеў тэрмін за скрадзеныя некім са склада прадукты. Парачка падабралася яшчэ тая! Пра такіх гавораць — ні кала, ні двара. У дадатак — любілі выпіць. Яны то пабіраліся, то абкрадвалі бліжэйшыя лецішчы, неяк выкручваліся. Агульнага хлопчыка нарадзілі. А ў малдаванкі, што збегла ад мужа, ні дакументаў, ні работы, ні пасведчання на права жыхарства — анічога! І трэба ж было яму, тады ўжо работніку мясцовага Дома культуры, перасекчыся з гэтымі бадзяжкамі! Навучыў хтосьці з мясцовых, і тыя заказвае генетычную экспертызу, каб Колю прызналі бацькам малога, і арганізуе парачцы законны шлюб. Вось вам і навяспечаная ячэйка грамадства!

Дзіўна было мне ўсё гэта назіраць, але я не ўмешвалася, а дзе можна і плячо падстаўляла. Балазе, хутка знайшлася і для мяне справа. З'явілася нарэшце Волька кінуліся яму ў ногі — пусціце ў хату пажыць (матчына хата ў яго была, а сам жыў у калгаснай). Пачаў на іх грошы траціць, прымаць удзел у іх сямейным жыцці, настаўляць — накіроўваць, адным словам, на правільны шлях». Падумайце толькі: сам нездаровы, бессямейны, вечна дэпрэсіўны! Я

Ёсць нагода

...А сяброўства пачынаецца з усмешкі

Са святам, сябры! Тым больш, сёння — менавіта ваш дзень. Або, калі назваць нагоду больш поўна, Міжнародны дзень сяброў. І хоць свята гэта лічыцца неафіцыйным, менш значным і прыемным яно ад гэтага не робіцца.

Ва ўсе часы людзі лічылі сяброўства адной з найвышэйшых каштоўнасцяў — праўда, з агаворкай, што сапраўднае сяброўства сустракаецца надзвычай рэдка, а мо і ўвогуле існавала толькі ў далёкім мінулым. На гэты конт нямецкі філосаф Артур Шапенгаўэр трапна заўважаў, што «сапраўднае сяброўства — адна з тых рэчаў, пра якія, як пра гіганцкіх марскіх змеяў, не вядома, з'яўляюцца яны выдуманымі або дзесьці існуюць».

Іншы знакаміты нямецкі мысляр, Гегель, сцвярджаў, што сапраўднае сяброўства існуе — але бывае толькі ў маладосці, калі жыццёвыя шляхі яшчэ не вызначыліся. І з гэтым цяжка спрачацца; сапраўды, часцей за ўсё лепшы сябар — самы верны, адданы і любімы, які лепей за ўсіх новых — гэта чалавек, якога мы ведаем з юнацтва ці нават з дзяцінства. І, напэўна, менавіта з ім варта сустрэцца найперш — не толькі сёння, але і проста так, без асаблівай нагоды. Бо, як казаў яшчэ адзін выбітны філосаф Францыя Вальтэр, усе ўшанаванні свету не вартыя аднаго добрага сябра.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (6 чэрвеня). Па гарызанталі: Аўстрыя. Матч. Жанр. Лафет. Бор. Этап. Арфей. Дама. «Церамок». Карсар. Акт. Пікап. Арбітр. Ахіл. Лаг. Рагу. Касьба. Снарад. Уша. Раб. Партос. Асіна. Нар. Кракі. Жнец. Юта. Бандура. **Па вертыкалі:** Пенальці. Падснежнік. Фарсі. Араб. Кухар. Тумба. Ігар. Палуда. Бак. Банк. Мажор. Саржа. Яга. Арфа. Іран. Тон. Кеб. Мяч. Рэйка. Капаніца. Арка. Чадра. Сыр. Пасквіль. Мат. Табло. Мур. Ірга. Сценка.

Актуальна

МЫ ЕДЗЕМ, ЕДЗЕМ, ЕДЗЕМ... НА ДАЧУ!

Ура! Лета, сонца, адпачынак! Лета заўсёды нас радуе сваім цяплом, і так хочацца паехаць на дачу. Але набліжаюцца выхадныя, і ўзнікае пытанне: браць з сабой Ваську ці не? Што ж трэба зрабіць, як падрыхтавацца да паездкі? Давайце ўсё па парадку.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

РЫТАРЫЧНАЕ ПЫТАННЕ

Перш чым пачаць рыхтавацца да паездкі, вам давядзецца цвёрда вырашыць для сябе «браць або не браць» з сабой чатырохногага сябра. Зразумела, калі ў вас хамячок або пацук, то без усялякіх праблем іх можна пакінуць дома. Але вось што датычыцца катоў, тут усё нашмат складаней. А сабакі наогул не пераносяць адзіноты. Ды і гуляць іх трэба выводзіць двойчы на дзень.

Калі вы пакідаеце свайго грызуна або птушку адных, то не забывайце, што гэта можна зрабіць толькі на два дні.

АТЭЛЬ ДЛЯ ЖЫВЁЛ

Вядома ж, вырашэннем пытання магла б стаць гасцініца для жывёл. Але ў Беларусі такіх няма. Калі вы патэлефануеце па аб'явах, якімі стракаціць газеты, то даведаецеся, што «гасцінічным» безнэсам для сабак і катоў займаюцца прыватныя асобы, якія за пэўную плату змогуць утрымліваць у час вашай адсутнасці жывёл. Але ў сезон знайсці свабоднае мясцейка для сабакі, а тым больш ката ці кагосьці экзатычнага, практычна немагчыма. Ды і цэны «кусаюцца». А пасля некалькіх званкоў па такіх аб'явах вельмі часта прыходзіць у галаву думка: «А гэтыя людзі наогул хоць што-небудзь разумеюць у жывёлах?».

І вось вы ўзважылі ўсе за і супраць і вырашылі, што трэба свайго ўлюбёнца ўзяць з сабой на дачу.

ПАДРЫХТОЎКА

За два—тры тыдні да паездкі зрабіце вашаму гадаванцу прышчэпкі ад інфекцыйных і грыбковых (лішай) хваробаў. Не забудзьце, што за 7—14 дзён да вакцынацыі вам неабходна правесці дэгельмінтызацыю. Пры гэтым абавязкова выкарыстайце антыгельмінтныя прэпараты, прызначаныя для катоў або сабак адпаведна. «Чалавечыя» таблеткі для гэтага не падыходзяць.

Абавязкова ўлічыце, што вывозіць на прыроду кацянят ва ўзросце да 3 месяцаў нельга. Таму што імунітэт у іх вельмі слабы.

МЫ ВЯЗЁМ З САБОЙ КАТА

Выбіраем пераноску. Вы запытаеце, навошта? А як вы сабе ўяўляеце сітуацыю, калі вы дабіраецеся да дачы грамадскім транспартам, штурмуючы прыгарадныя цягнікі, і ў вас на руках кот. Ён трываць не будзе. І ў выніку — стрэс у ката, а ў вас падрапаныя рукі і «парваныя» нервы.

Пераноска для ката і коткі ў ідэале павінна быць моцнай, прасторнай і зручнай. І не важна, ці будзе яна пластмасавая або зробленая з матэрыі ці лазы. Галоўнае, загадзя дайце кату прывыкнуць да пераноскі, інакш ён вельмі моцна спужаецца.

Якой бы эксклюзіўнай ні была пераноска, трэба памятаць, што любая вылазка ката з кватэры — наймацнейшы стрэс. Каб гэтага не было, загадзя зрабіце некалькі пробных выхадаў з катом у пераносцы на вуліцу. Нехай ён прывыкне да таго, што дамок — гэта не так ужо і страшна.

...ХАМЯКА І ПАПУГАЯ

Клеткі для папугаяў, хамякоў і трусоў вельмі вялікія, таму на дачы лепш за ўсё мець запасную. А грызуноў і птушак перавозьце ў маленькай клетцы-пераносцы.

Прыехаўшы на дачу, выпусціце гадаванца ў новую клетку, пакарміце. І ўсё. Далей даглядайце, як заўсёды. Галоўнае, каб клетка не была на скразняку або на санцапёку.

А КАЛІ НА МОРЫ ГАЙДАНКА...

Для многіх сабак і катоў паездка ў машыне ў летні час становіцца сапраўдным пакараннем, гадаванца загойдвае, яму млосна, яму дрэнна. Уладальніку таксама гэта ўсё не падабаецца. Таму перад паездкай сабак і катоў ні ў якім выпадку нельга карміць. У ветэрынарнай аптэцы або заалагічнай краме набудзьце спецыяльныя таблеткі ад загойдвання, якія трэба даць гадаванцу за паўгадзіны да паездкі.

БЛЫХА — ГЭТА ВАМ НЕ ХА-ХА

Першая праблема, з якой часцей за ўсё даводзіцца сутыкацца — гэта блохі. Кот або сабака можа пацярпець ад іх укусаў. А блохі могуць пераносіць небяспечныя захворванні. Памятайце пра гэта. Выратаванне — гэта супрацьблышыныя ашыйнікі, кроплі на карак, спрэі, пудра. Ашыйнікі лепш купляць са спецыяльнай засцежкай, якая разрываецца, калі кот выпадкова зачэпіцца за галінку.

Улічыце тое, што супрацьблышыныя шампуні дзейнічаюць толькі ў час мыцця і знішчаюць паразітаў, якія ўжо знаходзяцца на жывёле.

НЕБЯСПЕЧНЫ КЛЕШЧ

Што рабіць, калі сабаку ўкусіў клешч? Знайшоўшы паразіта, выцягніце яго самі, і не важна, ці будзеце вы яго выкручваць па гадзіннікавай стрэлцы або супраць гадзіннікавай. Выкарыстайце падручныя сродкі для даставання (пінцэт, шчыпчыкі для броваў, нітку і г.д.).

Назірайце за сабакам на працягу 5—10 дзён. Пры самых нязначных змяненнях у паводзінах — тэрмінова ў ветэрынарную клініку, дзе зробяць аналіз крыві на наяўнасць паразітаў.

Важна! Раней было распаўсюджана перакананне, што на кляшча трэба капнуць алею, каб закрыць дыхальцы і прымусіць яго выбрацца на паверхню. Не рабіце гэтага!

Калі кляшча потым спатрэбіцца даследаваць, алей можа ўскладніць аналіз, а то і зрабіць немагчымым. Да таго ж клешч пад уздзеяннем алею можа ўпырснуць пад скуру дадатковую порцыю ўзбуджальніка хваробы, які ўтрымліваецца ў яго сліне.

УКУСІЛА САБАКУ ПЧОЛКА

Калі вашага гадаванца ўкусіла аса або пчала, на месца ўкусу неабходна нанесці супрацьзапаленчую мазь і даць яму антыгістамінны сродак (тавегіл, супрасцін і г.д.). Калі ўкус трапіў у язык або горла — неадкладна да ветэрынарнага ўрача.

Абараніць сабаку ад камароў дапамогуць спецыяльныя спрэі, кроплі на карак або ашыйнікі на натуральнай аснове (з серыі «бія»).

КАЛІ САБАКА ПАРЭЗАЎ ЛАПУ...

Да ліку больш распаўсюджаных няшчасных выпадкаў належаць парэзы і драпіны лап. Здавалася б, што гэта трывіяльная сітуацыя, з якой пастаянна сутыкаюцца ўладальнікі сабак. Што можа быць прасцей — прамываем, мажам зялёнкай, накладваем павязку... і ўсё.

Але вельмі часта даводзіцца сутыкацца з уладальнікамі, якія аказваюць дапамогу свайму гадаванцу некваліфікавана. Якімі толькі «эксклюзіўнымі» прэпаратамі не лечаць рэзаныя лапы: заечы тлушч, салідол, іхціёлавая мазь, цуд-бальзам «Выратавальнік» («Спасатель»), марганцоўка ў парашку і нават уласная мача. А правільна аказаць першую дапамогу зусім не складана.

У першую чаргу пастарайцеся пазбегнуць найбольш распаўсюджаных памылак.

Нельга дазваляць сабаку лізаць рану! У ротавай поласці сабакі вялізная колькасць мікробаў, якія могуць выклікаць у ране гнойнае запаленне. Практыка паказвае, што калі сабака залізвае рану, тэрміны зажыўлення павялічваюцца мінімум удвая. Для прадухілення разлізвання раны ў большасці выпадкаў патрабуецца нашэнне абароннага каўняра або спецыяльнага абутку.

Нельга накладваць жгут. Без спецыяльных навыкаў вы не зможаце правільна гэта зрабіць. Уладальнікі пры спробе накласці жгут звычайна толькі пераціскаюць вены, істотна ўзмацняючы крывацёк. У выпадку крывацёку трэба накласці павязку, якая ціснe. Лепш выкарыстоўваць марлю або чыстую тканіну, але пры неабходнасці можна скарыстацца ўсім, што ёсць — у тым ліку і вашай уласнай рукой. Ослабце ціск праз 5 мінут. Калі крывацёк не спыняецца, працягвайце прамое націсканне на рану, пакуль едзеце да ветурача.

Не засыпайце рану парашком. Любімы стрэптацыд, як зрэшты і іншыя прысыпкі, пакіньце ў мінулым стагоддзі. Лепш наогул не апрацоўваць рану, чым прысыпаць яе якім-небудзь парашком. Парашок, асабліва растваральны, выклікае апёк тканак і садзейнічае ўтварэнню шчыльнай карасты, якая значна пагаршае стан раны. Лепш за ўсё добра прамыць рану растворам любога антысэптыка: хлоргексідзіну біглюканатам 0,05—1%, 3%-ым пераксам вадароду, разбаўленым вадой у суадносінах 1:3, фурацылінам 0,02% або бледна-руковай марганцоўкай. Можна нават гатаванай вадой: важная механічная ачыстка раны. Пажадана таксама выстрыгчы ўсю поўсць, якая можа прыклеіцца да сценак раны.

Калі вы баіцеся, што ваш сабака можа ўкусіць вас, таму што ён спужаны, пакрыўджаны і яму балюча, надзеньце яму намордник. Калі яго з сабой няма, то выкарыстайце падручныя сродкі. Намордник лёгка зрабіць з вяроўкі або рэменя, гальштука ці нават калготак. Наматайце штосьці з гэтага вакол пысы сабакі і пад сківіцай, скрыжуйце, завяжыце канцы за галаву і завяжыце.

З НАВАСЕЛЛЕМ!

На новым месцы зрабіце вашаму сабаку зручнае месца. І не важна — будзе гэта канапа, ляжанка або будка на вуліцы.

Кату ж, перад тым як выпускаць на ўчастак, дайце папярэдне асвойтацца дома. Нехай яна дакладна ведае свае ўладанні.

І каты, і сабакі будуць з задавальненнем грызці зялёную траўку. Не бойцеся — яны ведаюць, якое зяленева ім падыходзіць.

Але калі вы вырашыце даць свежае зяленева пацуку або хамячку, будзьце ўважлівыя. Можна ў пуку травы выпадкова прынесці ядавітую расліну. Самы просты і надзейны варыянт — зяленева з градак (салата, пятрушка, кроп, кінза), злакі, газонная трава, лісце дзьмухаўцоў.

Калі вы выканаеце гэтыя няхітрыя рэкамендацыі, ваша паездка за горад пакіне толькі добрыя ўражанні, а ваш гадаванец будзе здаровы. Удалых паездак.

Аляксандр УШАЧОЎ, ветэрынарны ўрач-кансультант.

АПТЭЧКА ПЕРШАЙ ДАПАМОГІ ДЛЯ ЎЛАДАЛЬНІКА ЖЫВЁЛЫ:

— тэрмометр для вымярэння тэмпературы цела (звычайны, як для людзей);
— вата, бінт, лейкапластыр, спрынцоўка (маленькая і кружка Эсмарха);
— нажніцы з закругленымі канцамі, пінцэт;
— зялёнка, ёд, марганцавакіслы калій (марганцоўка);
— актываваны вугаль (поліфепан);
— но-шпа і анальгін (лепш у ампулах);
— аднаразовыя шпрыцы (на 2 мл);
— пераксід вадароду (3-% раствор);
— раствор для дэзінфекцыі (борны спірт, фурацылін);
— вазелінавае масла;
— аптэчны рамонак, кара дубу;
— антыгістамінныя прэпараты (тавегіл, супрасцін);
— бальзам «Выратавальнік».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.39	21.39	17.00
Віцебск —	4.20	21.37	17.17
Магілёў —	4.29	21.29	17.00
Гомель —	4.35	21.17	16.42
Брэст —	4.56	21.53	16.57
Гродна —	5.06	21.44	16.38

Месяц

Поўня 7 чэрвеня.
Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Фядоры, Івана, Купрыяна, Ніла, Фёдара.*

К. *Ганны-Марыі, Пелагеі, Станіслава.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

Варшава	+15..+17°C	Кіеў	+31..+33°C
Рыга	+19..+21°C	Вільнюс	+21..+23°C
Масква	+24..+26°C	С.-Пецярбург	+18..+20°C

9 чэрвеня

Дзве даты

1775 год — адчынілася Гродзенская медыцынская акадэмія — першая ў Беларусі вышэйшая навучальная ўстанова па падрыхтоўцы медыцынскага персаналу (арганізатар і кіраўнік Жан Жылібер). Дзейнічала ў Гродне да 1781 года, затым пераведзена ў Вільню ў якасці медыцынскага факультэта Віленскага ўніверсітэта.

1943 год — чэшскі журналіст Юліус Фучык зрабіў апошні запіс у сваім турэмным дзённіку: «Людзі, будзьце пільнымі!». Пасля вайны яго нататкі з турмы Панкрац выйдуць асобнай кніжкай «Рэпартаж з пятлёй на шыі».

Цытата дня:

«Самым згубным ядам, які раз'ядае нашыя душы, з'яўляецца зайздрасць».

Генры Філдынг (1707—1754), англійскі пісьменнік, класік літаратуры Асветы.

ПРАЦЯГ РУСАЛЬНАГА ТЫДНЯ

Аўторак на Русальным тыдні (восьмы тыдзень пасля Вялікадня), першы аўторак пасля Тройцы ў народзе зваўся Конскі Вялікдзень. Паўсюдна існавала правіла: не выкарыстоўваць у гэты дзень коней у рабоце, прыбраць у стайнях, памыць, пачысціць коней, вычасаць і заплесці грывы. Гаспадар урачыста ставіў свечку і чытаў малітвы і замовы за здароўе жывёлы — вернага памочніка селяніна.

Серада, першая серада пасля Тройцы — Градабой, Градавая серада ці серада Русаль.

● Каб засцерагчы пасевы ад граду, у гэты дзень не працавалі. Бяспечнай лічылася работа талакой ці «наёмная» работа.

Чацвер, першы чацвер пасля Тройцы, называўся Наўскі, ці Намскі чацвер, Наўская Тройца. Гэта яшчэ адзін дзень ушанавання продкаў.

● На могілкі да сваякоў і родных ішлі з аерам, ліпай, клёнам, бярозай.

● У некаторых раёнах гэты дзень мае назву Сухі чацвер, ці Аблівах. Каб летам не было засухі, моладзь абавязкова ў гэты чацвер аблівала адно аднаго вадой.

Нядзеля — у нашых продкаў атрымала назву Розыгры, ці Русальчыны розыгры — апошні дзень Русальнага тыдня, які заканчваўся заключным абрадам тыдня — праводзінамі русалак.

● У першай палове дня дзяўчаты збіраліся на ўскрайку вёскі, побач з жытнёвымі палеткамі, рабілі чучала. Для гэтага звычайна выкарыстоўвалі сноп леташняга ўраджаю. Падпярэзвалі яго чырвоным поясам (ці павязвалі чырвоны фартух), а на галаву надзявалі вянок з валошак і хустку. Такую «русалку» неслі ў вёску, ставілі да вечара ў сенцах ці кладоўцы.

● Калі сонца сыходзіла за небасхіл, моладзь збіралася ў адным месцы і пачынала ўпрыгожваць «русалку» — дзяўчыну (часцей за ўсё з самымі доўгімі валасамі). Яе распраналі, распускалі валасы, надзявалі на галаву вянок. Па традыцыі выбіралі і дачку русалкі — маленькую дзяўчынку. Калі падрыхтоўка была скончана, святочнае шэсце кіравалася ў бок жытнёвых палеткаў. Падчас хады выконваліся абрадавыя песні. Дзве дзяўчыны неслі чучала русалкі. Святочнае шэсце спынялася на ўскрайку поля, дзяўчаты кідалі чучала як мага далей у жыта. Пасля гэтага моладзь імкліва бегла назад у вёску, хвалюючыся, каб «русалкі не дагналі і не заказыталі да смерці».

АБЯРЭГ АД РУСАЛАК

Існавала замова на ўшанаванне душ памерлых маладых дзяўчат і жанчын. У нядзелю трэба было абавязкова прачытаць так:

«Вадзяніца, лесавіца, шальная дзявіца! Атвяжыся, адкаціся, у маім двары не кажыся; табе тут не век жыць, а нядзелю быць. Ступай у раку глыбокую, на асіну высокую. Асіна, трасіся, вадзяніца, уймісь. Я закон прынімаў, златы крэст цалаваў; мне з табой не вадзіцца, не куміцца. Ступай у бор, у чашчу, к лясноваму хазяіну, ён цябе чакаў, на мху пасцелюшку слаў, муравой усцілаў, у ізгалоўіцы калоду клаў; з ім табе спаць, а мне, хрышчонаму, цябе не відаць. Амін».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ФЛОРА. АХОЎНЫЯ РАСЛІНЫ БЕЛАРУСІ

8 чэрвеня 2009 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь увяло ў паштовае абарачэнне маркі «Казялец голы», «Кураслеп лясны» з серыі «Флора. Ахоўныя расліны Беларусі». Мастак Аляксандр Міцянін.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

ТО КАХАЮЦЦА, ТО Б'ЮЦЦА...

Калі ноччу ў адну з бальніц Гомеля быў дастаўлены нідзе не працуючы 26-гадовы жыхар абласнога цэнтра з колата-рэзанымі ранамі жывата і печані і ў яго спыталі, чыіх гэта рук, ён адказаў: сяброўка, таксама, беспрацоўная, разлавалася пасля сумеснага з ім застолля. І пачалася бойка. Дык яна на яго — з нажом... Ёсць надзея, што чалавек выжывe.

А ў Веткаўскім раёне — трагедыя. У гадзіну ночы ляснік Нямкоўскага лясніцтва так раскіпяціўся ў сваім доме падчас спрэчкі са сваёй жонкай, што біў яе, не думаючы ні аб чым. Не прыходзячы ў прытомнасць, бядачка праз пяць дзён памерла ў бальніцы.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Усміхнёмся!

У кватэру да Аляксандра Друзя залез Сяргей з Саратава. Такім чынам, пятнаццаць тысяч долараў сыходзяць у Саратаў!

☺

— Чаму, калі мужчына бачыць жанчыну ў скураным касцюме ў абліпку, яго сэрца б'ецца часцей, ногі церхнуць, горла перасыхае, думкі блытаюцца...

— Таму што яна пахне, як новая машына.

☺

Безалкагольнае піва будзе не такім брыдкім, калі дадаць у яго грамаў 100 гарэлкі.

☺

На пляжы дама звяртаецца да суседкі:

— Вы не маглі б пазычыць мне пярэсты надзіманы матрац, які ляжыць побач з вамі?

— Што вы? Гэта мой муж!..



КІРМАШ

штотыднёвы рэкламны выпуск № 11 (611)

адзел рэкламы 287 17 79

Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ Хутар у Слуцкім раёне, участак 25 сотак.
Тэл. 8 029 378 48 46.

❒ Дом у г. Асіповічы і пас. Татарка Асіповіцкага раёна.
Тэл. 8 029 648 21 30.

❒ Кватэра 2-пакаёвая з усімі выгодамі і г/п у Мінскім раёне.
Тэл. МТС 269 09 07.

❒ Кватэра 1-пакаёвая з усімі выгодамі ў г. Маладзечне.
Тэл. 8 029 755 48 96.

❒ Дом 2002 г. пабудовы, 140 кв. м, маецца газ, хлеў, гараж, летняя кухня, у г. Дзяржынску.
Тэл. 8 029 554 70 95.

❒ Запрашаем да сумеснага будаўніцтва 2-кватэрнага дома (для будаўніцтва маецца ўсё) сям'ю без шкодных звычак з в/а (10 км ад Брэста).
Тэл. 8 029 206 70 61.

❒ МТЗ-52, задні мост Т-40.
Тэл. 8 029 648 21 30.

❒ ГАЗ-3110 1999 г.в., ТА, страхоўка, цана па дамоўленасці.
Тэл. 8 029 774 87 49.

❒ Касілка навясная КН-1 (новая) да МТЗ-05.
Тэл. 8 01792 54 453.

❒ Вуллі пчаліныя (б/к), электрапліта 4-канфорачная (новая), усё — танна.
Тэл.: 8 017 92 55 725, 8 029 961 02 68.

❒ «МТЗ-80», прычэп, культыватар, з/ч да МТЗ.
Тэл. МТС 754 52 55.

❒ «Масквіч-2140», ЗАЗ 968М танна.
Тэл. 8 033 300 74 72.

❒ Сячкарня з электраруховіком.
Тэл. 8 029 706 84 63.

❒ Млын-драбілка, 380 в., 5,5 кВт, новая.
Тэл. 8 029 133 97 24.

❒ Газавая пліта «Гефест» 50 х 53 см з грылем, новая.
Тэл.: 8 017 295 96 84, 8 029 115 56 99.

❒ Супермлын 4 кВт, 2 тоны ў гадзіну, нядорага.
Тэл.: 8 033 637 70 54, 8 029 877 51 50.

❒ Кацёл на цвёрдым паліве для лазні.
Тэл. 8 017 242 72 42, 8 029 876 93 46.

❒ Мотаблок МТЗ.
Тэл. 8 029 400 43 16.

КУПЛЮ

❒ Транспарцёр задні да навясной двухрадковай бульбакапалкі 2КТН (лідская).
Тэл.: 8 01792 55 725, 8 029 961 02 68.

* * *

❒ Кансультацыя будаўнічых і апрацоўчых работ любой складанасці.
Тэл. 8 029 761 87 25, увечары.

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі: 220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_____ № _____ Выдадзены_____
_____

Подпіс_____ Дата_____

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 32.444 Індэкс 63850. Зак. № 3072. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12